КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г. / № 42 (1272) 15 кастрычніка 2016 г.

Калектыву рэдакцыі газеты "Культура" рэдакцыйна-выдавецкай установы "Культура і мастацтва"

25

Паважаныя сябры!

Прыміце шчырыя віншаванні з 25-годдзем з дня выхаду ў свет першага нумара вашай газеты!

Сімвалічна, што свой юбілей выданне адзначае ў Год культуры. На працягу чвэрці стагоддзя яно адлюстроўвае значныя падзеі ў духоўным жыцці краіны, служыць надзейным памочнікам і дарадцам у рэалізацыі дзяржаўнай культурнай палітыкі. Газета заваявала давер аўдыторыі грунтоўнымі аналітычнымі матэрыяламі, карыснымі артыкуламі, расповедам аб дасягненнях у сферы мастацтва і наватарскіх распрацоўках спецыялістаў галіны з усіх рэгіёнаў Беларусі.

Упэўнены, што калектыў рэдакцыі і надалей будзе плённа працаваць на карысць нашай Айчыны.

Жадаю ўсім супрацоўнікам і чытачам газеты "Культура" моцнага здароўя, невычэрпнага натхнення, шчасця і дабрабыту.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА

14 кастрычніка 2016 года

Супрацоўнікам газеты "Культура"

Шаноўныя сябры!

Сардэчна віншую вас з адметнай падзеяй — 25-годдзем з дня выхаду ў свет першага нумара газеты "Культура".

На працягу ўсёй гісторыі свайго існавання Ваша ўнікальнае перыядычнае выданне паспяхова стварае хроніку духоўнага і творчага жыцця краіны. Газета заваявала павагу і давер чытачоў аператыўнасцю інфармавання аб найважнейшых дасягненнях і мерапрыемствах у сферы культуры і мастацтва, грунтоўнымі аналітычнымі публікацыямі, карыснымі артыкуламі з абагульненнем наватарскага і перадавога вопыту работы спецыялістаў галіны з усіх рэгіёнаў Беларусі.

Вельмі прыемна, што свой юбілей газета адзначае ў Год культуры, бо яна з'яўляецца адной з асноўных інфармацыйных пляцовак для асвятлення яго падзей, надзейным памочнікам і дарадцам у рэалізацыі дзяржаўнай культурнай палітыкі Рэспублікі Беларусь.

Жадаю ўсім супрацоўнікам і шматлікім чытачам газеты "Культура" моцнага здароўя, невычэрпнай жыццёвай энергіі і натхнення, новых прафесійных поспехаў, шчасця і дабрабыту.

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс СВЯТЛОЎ

14 кастрычніка 2016 года



У Нацыянальным мастацкім музеі краіны адбыліся ўрачыстасці з нагоды 25-годдзя выхаду ў свет першага нумара газеты "Культура".

1. Прывітальны адрас Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі міністр культуры Барыс Святлоў уручае галоўнаму рэдактару газеты "Культура" Сяргею Трафілаву.
2. Ганаровую грамату Міністэрства культуры Барыс Святлоў уручае дырэктару рэдакцыйна-выдавецкай установы "Культура і мастацтва" Алегу Прыко.
3. Ганаровую грамату Міністэрства інфармацыі яго кіраўнік Лілія Ананіч уручае Яўгену Рагіну.
4. Ганаровую грамату старшыня ЦК Беларускага прафсаюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму Наталля Аўдзеева ўручае першаму намесніку дырэктара РВУ Людміле Крушынскай.
5. Пра першы нумар "К" згадала мастацкі рэдактар Наталля Овад.
6. Нагрудным знакам Мінкультуры "За ўклад у развіццё культуры Беларусі" ўзнагароджаны Ілья Свірын.
7. Падарунак ад гендырэктара Нацыянальнага мастацкага музея, старшыні Канфедэрацыі творчых саюзаў Уладзіміра Пракапцова.

Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ і Аліны САЎЧАНКА

Калектыву рэдакцыі газеты "Культура"

Паважаныя сябры!

Сардэчна віншую вас з 25-годдзем з дня выхаду ў свет першага нумара газеты "Культура" — аднаго з вядучых галіновых сродкаў масавай інфармацыі.

Чвэрць стагоддзя газета актыўна ўдзельнічае ў інфармацыйным забеспячэнні рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі ў галіне культуры, спрыяе захаванню нацыянальнай культурнай спадчыны, аналізуе і сістэматызуе лепшы вопыт і творчыя здабыткі работнікаў сферы.

Дзякуючы прафесіяналізму, адказнасці і актыўнай жыццёвай пазіцыі супрацоўнікаў рэдакцыі, газета "Культура" з'яўляецца сучасным і цікавым выданнем, пра што яскрава сведчаць неаднаразовыя перамогі ў Нацыянальным конкурсе друкаваных сродкаў масавай інфармацыі "Залатая Ліцера".

Упэўнена, што значны творчы патэнцыял, высокае журналісцкае майстэрства, адданасць свайму грамадзянскаму абавязку і надалей будуць галоўнымі арыенцірамі ў працы калектыву газеты.

Шчыра жадаю вам моцнага здароўя і дабрабыту, натхнення, поспехаў і плёну ў працы на карысць Радзімы.

Міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Лілія АНАНІЧ

14 кастрычніка 2016 года

Рэдакцыя плюс...

"Нельга кветку прыраўноўваць да пустазелля..."

Народны мастак Беларусі Георгій Паплаўскі — чалавек надзвычайнага творчага лёсу, які ўнёс выбітны ўклад у скарбніцу нацыянальнай выяўленчай культуры. Ніколі яго не прыцягвалі "злабадзённыя водгукі на тэму..." ці выпадковыя павевы. У яго творчасці няма слізгання па паверхні, лёгкага жыццепадабенства, мелкаводдзя ілюзорных задач. Няма твораў, прадыктаваных "разума холодным наблюдением", якія пазбаўлены хаця б часцінкі асабістай веры, страсці, трывогі. Таму што ні стварае мастак, адчуваеш яго прысутнасць, перакананасць і пазіцыю. Ён творца планетарнага мыслення. На пытанні пра галоўнае Паплаўскі імкнецца адказаць у поўнай меры чалавечай і мастакоўскай шчырасці.

Падрыхтаваў Барыс КРЭПАК

Не будзем пералічваць творы юбіляра (сёлета яму споўнілася 85 гадоў). Гэтыя цікавыя эстампы, акварэлі, карціны, ілюстрацыі можна было паглядзець на юбілейнай выставе "Жыццё ў творчасці" Георгія і Наталлі Паплаўскіх у Нацыянальным мастацкім музеі. Скажам толькі, што ўсё жыццё Георгій Георгіевіч рысаваў і маляваў: мужных і працавітых людзей, пейзажы чужых краін і яго любімай Беларусі; аддаў немалую даніну і Вялікай Айчыннай, і Чарнобыльскай трагедыі, і космасу, і вечным біблейскім сюжэтам, і старажытнай гісторыі Беларусі; праілюстраваў дзясяткі кніг, самых розных: ад Быкава, Адамовіча і Караткевіча — да Шэкспіра, Тагора і Джэка Лондана, ад Купалы, Коласа і Мележа — да Лангфэла, Пятраркі і Шылера... Словам, яму ёсць чым ганарыцца. А мы ганарымся тым, што ў нас у краіне жыве і працуе такі мастак.

А які ён чалавек? Якая яго ўнутраная душэўная арганіка? Пра што ён успамінае і пра што марыць? Што ён раскажа нам, журналістам-"культураўцам", такога, пра што іншым не заўсёды мог паведаміць? Усё тое кола пытанняў, што былі зададзеныя мастаку, мы згрупавалі па тэмах.

Ці час збіраць камяні?

— Ведаеце, з васьмідзесяці пяці гадоў амаль шэсць з паловай дзесяцігоддзяў прыходзяцца ў мяне ўласна на творчасць! Вельмі шмат, няма словаў. Дык што: надышоў час збіраць камяні? Хачу думаць, не. Адчуваю яшчэ нейкі запас пораху ў сваіх парахаўніцах перш чым падводзіць канчатковыя вынікі. Канешне, раней, здавалася б, часу было больш: і ў грыбы схадзіць, і парыбачыць, і з сабакам Гошам пагуляць, і з сябрамі пагутарыць ля вогнішча, і сваіх студэнтаў павучыць у акадэмічных майстэрнях, і — галоўнае! — усё паспець зрабіць ва ўласнай творчасці ў перапынках між бясконцымі вандроўкамі па свеце! Цяпер ужо таго няма. Амаль што няма. Больш цягне пасядзець да позняга вечара ў майстэрні на 9-м паверсе "дома мастакоў" на вуліцы Сурганава, падумаць, асэнсаваць убачанае, памаляваць алеем ці акрылам палотны, бо для найтанчэйшага афорта або мініяцюрнай кніжнай ілюстрацыі вочы ўжо не тыя... На жаль, шмат сіл і часу адымае ўсялякая неабавязковая арганізацыйная мітусня, беганіна, асабліва, напрыклад, калі мы з Наташай рыхтавалі нашу нядаўнюю юбілейную выставу ў Нацыянальным мастацкім. У былыя ж часы па лініі і міністэрства, і саюза мастакоў персанальныя выставы фарміраваліся зладжана і прафесійна. Аўтару-мастаку толькі заставалася прыбрацца як трэба і своечасова прыйсці на свой вернісаж...

Як стаў графікам

— З дзяцінства я любіў рысаваць. Таму спачатку ў 1947-м паступіў у Мінскае мастацкае вучылішча разам з Савіцкім, Грамыкам, Шчамялёвым, Данцыгам, Стасевічам, Тышкевічам...

Заканчэнне — **на старонках 8 — 9.**

"Нешта святочнае

Сёння, бадай, той рэдкі выпадак, калі гаворка пойдзе пра тых, хто звычайна на палосах — авансцэне кожнага з нумароў "К". Але з нагоды 25-годдзя з дня выхаду ў свет першага нумара прапаную своеасаблівы рэдактарскі "бэкстэйдж".

Сяргей ТРАФІЛАЎ

Тэксты Дар'і Амяльковіч не толькі праваднікі для чытачоў па тэмах візуальнай культуры Беларусі і замежжа. У шэрагу выпадкаў альтэрнатывы гэтым артыкулам сучасная беларуская медыя-супольнасць не прапаноўвае.

Кастусь Антановіч з шырокім дыяпазонам увагі да культурнага поля здольны і да нечаканых зменаў. Ад "сёрфінгу" па мінулым да аналітычнага ахопу і паглыблення ў сацыяльнасць культуры рэгіёнаў. Рэзкі пераход, а вынік — важкі.

Пра такіх журналістаў як Надзея Бунцэвіч не кажуць "адзін з…" Гэта — тая, да чыйго меркавання прыслухоўваюцца. Бо ў тэкстах працэс і момант, кірунак і тэндэнцыя, непусты прагноз і глыбокае асэнсаванне. Карацей, N.B. — не толькі nota bene.

Неабыякавасць з асабістым поглядам, нярэдка з яго дамінаваннем над фактам. Цяжка пагадзіцца з такой трактоўкай публіцыстычнасці? Але цяжка і не пагадзіцца, чытаючы Пётру Васілеўскага.

Хто кажа, што тэкст — рэч выключна творчая? Асабліва, калі ён займае сваё месца ў механізме падрыхтоўкі нумара. Гэта крыху вобразна пра працу вядучага тэхнічнага рэдактара Ганны Васілеўскай. Але і тут ёсць месца для творчага, ці не так?

Якой уяўляецца праца ў рэдакцыі? Прынамсі, неспакойнай, нярэдка на зрыў, на злом… Часам бывае і так. Але каб канкрэтныя рэчы заставаліся канкрэтнымі, вартая ўвагі самавітасць і пэўнасць адказнага сакратара Юрыя Карпенкі.

Шматстайнасць інтарэсаў Алега Клімава — формула з мноствам каэфіцэнтаў асабістасці і эмацыйнасці. Вынікам — свежае гучанне ці не вечных тэм на старонках "К" і арганіка спалучэння неспалучальнага.

Барыс Крэпак з тых, хто стварае беларускі кантэкст. "У газеце?"— спытаецца з недаверам іншы. Ды вось толькі пара рубрык у сведчанне. "Вяртанне імёнаў" — датклівая праца з повяззю часоў. "Мастыхін" з вострым поглядам аўтара — гаворка пра наш дзень у мастацтве.

Дайсці да сутнасных пунктаў адліку лакальных і глабальных з'яў у тэкстах — гэта пра Алену Ляшкевіч. Канцэнтрацыя фактаў часам дазваляе апусціць умоўна неабходнае абагульненне, а падзейнасць дыктуе форму эклектыкі ў матэрыялах.

У рэдактара вэб-рэсурсу Тацяны Матусевіч творчага матэрыялу зазвычай больш, чым на фота да артыкула ці на альбом на старонку "К" у сацсетцы, дзе інфармацыя, архівуючыся, актуалізуецца з часам. І здымкі з адметным поглядам на асоб — не апошнія чыннікі таго.

Трансфармацыі, адаптацыі і інтэрпрэтацыі вонкавага выгляду "К" — гэта ў парафіі Наталлі Овад. Балазе яна бачыла і здзяйсняла іх нямала: працавала яшчэ над першым нумарам выдання. Але варта казаць, на шчасце, і пра відавочна захаваную пераемнасць у абліччы газеты.

Праблему Настасся Панкратава праламляе жыццёвым досведам. Цяжка знайсці тэму, да якой яна не падступілася б. І таму натуральным падаецца розгалас ад ейных тэкстаў, насычаных крэскамі асабістага.

Акцэнты сваіх тэкстаў Яўген Рагін нярэдка пакідае ва ўзятым у дужкі, выведзеным у адступленні. "Ну хто тыя "дужкі" чытае", — здзівіцца нехта? Але з цягам часу падаецца (і, відаць, небеспадстаўна), што пакінутым у такіх "сховішчах" і жывім душы.

У тэкстах Вольгі Ропат бадай любы чытач пазнае чалавека маладога. Па поглядах на яе ўлюбёны мастацкі працэс, па вобразнай мове, па выпеставанні думак, па ўкладзеным сэрцы, па душы. Гэта рысы, што спрацоўваюць на шчыры дыялог.

Аліна Саўчанка — гэта нестандартны падыход да культурнага працэсу наогул і да падзей рэгулярных (да іх няпроста падабраць "ключык"). Пра значнае і тонкія матэрыі, пра перліны вопыту і "чалавечага фактару". А яшчэ і фота — доказам незамыленасці погляду.

Карункавасць тэкстаў і нестандартнасць стандартных тэм, занурванне ў глыбіні і майстэрства абагульнення... Гэта, відаць, толькі частка таго, што варта сказаць пра Ілью Свірына ў ягонай журналісцкай іпастасі. Плённай на вынікі, зазначым.

Мая Хуткова сутыкаецца з тэкстамі яшчэ ў іх "протаверсіях". Ды і наступныя ступені іх шляху да выхаду ў свет не абыходзяцца без погляду сталь-рэдактара. (Дарэчы, цікавая абдрукоўка: гаворка, вядома ж, пра стыль-рэдактара).

Юрый Чарнякевіч — адзін з мацавальнікаў кантактаў "К" з рэгіёнамі. Фармат яго працы пластычны, але — скіраваны на канструктыў. І ад абалонкі да ядра праблемы артыкул у аўтара пройдзе шлях з канкрэтыкай і варыянтамі рашэнняў на выхадзе.

У выпадку "К" спрычыненасць да рэдакцыйна-выдавецкай установы "Культура і мастацтва" не простая фармальнасць. Гэта дакладнасць працы ўсяго механізма, што за абрэвіятурай РВУ, яго стабільнасць, мэтаскіраванасць дырэктара Алега Прыко. Гэта дасканалая дасведчанасць і грунтоўнасць першага намесніка кіраўніка Людмілы Крушынскай. Гэта далучанасць да рэдакцыі ўзаемадзеянням і аўтарскім удзелам намесніка дырэктара па маркетынгу Антона Сідарэнкі. Гэта супольнасць у выверанай працы і дакладнасць галоўнага бухгалтара Ірыны Барысевіч і яе намесніцы Аксаны Вашкевіч. Гэта ўсе тыя людзі, якія сёння працуюць з газетай, на яе карысць, аддаючы ёй і, спадзяюся, ад яе атрымліваючы зваротнае, няхай і ў больш эфемерных вымярэннях.

І напрыканцы. Дзякуй галоўным рэдактарам "К" цягам 25-гадовага шляху выдання: першаму — Вользе Іпатавай, Алегу Камінскаму і, вядома ж, Людміле Крушынскай, што ўзначальвала калектыў цягам 15 гадоў. Гэта быў няпросты шлях, дзе раз-пораз пазіцыя кіраўніка рэдакцыі вырашала лёс самога існавання газеты "Культура". І дзякуй усім тым, хто працаваў на гэты брэнд беларускай прэсы ў рэдакцыі (а таксама пазаштатна). А гэта — сотні імёнаў, да якіх далучаю пакрысе і сённяшні калектыў.

25 гадоў — чвэрць стагоддзя… Гучыць не жартоўна… Так, столькі ўжо існуе наша газета. І я адзін з першых з таго пакалення "першапраходцаў" сярэдзіны 1990-х, хто і сёння ў гэтай рэдакцыі робіць тое, што было, мабыць, прызначана мне самім лёсам. Па сутнасці, "К" зрабіла мяне, дыпламанаванага мастацтвазнаўцу, прафесійным журналістам.

Барыс КРЭПАК

Праўда, да таго часу я шмат друкаваўся ў СМІ, выдаваў кнігі і альбомы ў выдавецтвах Беларусі, Расіі і Украіны, але гэта былі выключна мастацтвазнаўчыя даследаванні. А вось таямніцы, сакрэты журналісцкай тэорыі і практыкі я па-сапраўднаму пазнаў толькі ў "Культуры". Дарэчы, уся мая "галоўная" кніга — двухтомнік "Вяртанне імёнаў" (2013 — 2014) — амаль цалкам заснаваны на артыкулах, апрабаваных на палосах "Культуры". Акрамя таго, наша газета пры маім жынскага, Роберта Фалька, Веру Ермалаеву, Лазара Лісіцкага, "здраўнёўскага" Ілью Рэпіна і іншых.

Асабліва хачу адзначыць першае дзесяцігоддзе новага XXI стагоддзя — гады росквіту газеты, нягледзячы на не заўсёды простыя ўмовы яе дзейнасці. З майго пункту гледжання, гэта быў "залаты" перыяд жыцця нашага выдання. Менавіта тады "Культура" стала неад'емнай часткай духоўнай прасторы Беларусі і заваявала прызнанне ўсіх, хто разумеў, што без нацыянальнай культуры краіна будзе няпоўнай. І сёння, скажу без пафасу, усе супрацоўнікі "Культуры" імкнуцца рабіць усё, каб наша выданне працягвала ісці ў шэрагу лепшых беларускамоўных газет нашай радзімы.

А яшчэ я сёння з задаваленнем прыгадваю сваіх колішніх калег, побач з якімі ў розныя гады працаваў у газеце: і "аксакалаў", і маладых журналістаў, якія свой першы вопыт набылі менавіта на старонках газеты, а потым паспяхова прадоўжылі сваю творчую кар'еру ў сродках масавай інфармацыі, выдавецтвах і ў галіне тэлежурналістыкі. Усе яны, з кім я сустракаюся,

Газета КУЛЬТУРА
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-ПАЛІТЫЧНАЯ, ДЛЯ ДАСУГУ (КУЛЬТУРА, МАСТАЦТВА)
Выдаецца з кастрычніка 1991 года.
Заснавальнік — Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ. **Адказны сакратар:** Юрый КАРПЕНКА; **рэдактары аддзелаў:** Надзея БУНЦЭВІЧ, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН; **аглядальнікі рэдакцыі:** Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Настасся ПАНКРАТАВА, Аліна САЎЧАНКА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ; **спецыяльныя карэспандэнты:** Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Алег КЛІМАЎ, Алена ЛЯШКЕВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ; **карэспандэнт** — Вольга РОПАТ; **мастацкі рэдактар** — Наталля ОВАД; **карэктар** — Мая ХУТКОВА.
Сайт: **www.kimpress.by.** E-mail: **kultura@tut.by.** Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Тэлефоны: (017) 286 07 97, (017) 334 57 23. Тэлефон-факс: (017) 334 57 41. Рэкламны аддзел: тэл. (017) 286 07 97, 334 57 41. Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА". 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх. Бухгалтэрыя: (017) 334 57 35.
Аўтары допісаў паведамляюць прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас. Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца. Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі. Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў. *Матэрыял на правах рэкламы.
"Культура", 2016. Наклад 4 179. Індэксы 63875, 638752. Рознічны кошт — па дамоўленасці. Падпісана ў друк 14.10.2016 у 20.30. Замова 3958. Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

ў гэтым ёсць...”

кі скіраваны ў бок параўнанняў з вечнасцю, але і ўзрост цалкам самастойнага жыцця, калі за плячыма заканчэнне вышэйшага навучальнага звяна, а наперадзе — будучыня ў абранай прафесіі і прыемныя сямейныя клопаты.

Надзея БУНЦЭВІЧ

Аднагодка нашай Незалежнасці, газета ўвесь час развівалася, трансфармавалася, шукала сваё аблічча, ставіла ўсё новыя мэты. Цікава, што пачалося выданне не з канстатацыі навін (а тым больш “смажаных”, як гэта часам было ўласціва друку 1990-х), не з жорсткага развенчвання вядомых гістарычных фактаў ці чаго іншага, што прэтэндавала б на сенсацыю, а з… паслядоўнага асветніцтва. Калі склаці разам нумары першых гадоў, атрымаецца сапраўдны падручнік па беларускай абрадавасці ды старадаўняй гісторыі.

Пазней на старонках “К”, што цалкам лагічна, стала панаваць сучаснасць. Але, што вельмі каштоўна, з амаль абавязковым гістарычным позіркам, кінутым “ушыр і ўглыб” у пошуках аналагаў, паралеляў, папярэдняй “падрыхтоўкі глебы” для цяперашніх падзей. Менавіта гэта заўсёды адрознівала “К” ад іншых выданняў, журналісты якіх не стамляліся пісаць пра шматлікія “ўпершыню”, “толькі ў нас”, “цяпер і зараз”. Задаваў і працягвае задаваць такі тон Барыс Крэпак — вядомы мастацтвазнаўца, які прысвяціў вывучэнню беларускага і сусветнага выяўленчага мастацтва ўсё сваё жыццё. Тыя ж тэндэнцыі: глыбокай аналітыкі, вяртання забытага і мадэлявання перспектыў — сталі ўласцівы адлюстраванню іншых відаў мастацтва, бо весці адпаведныя рубрыкі пачыналі не проста “аўтары з лёгкім пяром”, а людзі зацікаўленыя, спецыялісты ў абранай сферы.

Юбілей — нагода пажадаць “К” усё той жа маладосці ў спалучэнні з мудрасцю, позірку не толькі на “сёння”, але і на “ўчора” і ў “заўтра”, а таксама па розных баках сусвету, уключаючы бязмежны космас.

Святкуючы паўюбілей любімай газеты, хочацца парадавацца ўголас, што працую ў такім грунтоўным выданні з такім файным калектывам. Кожны — спецыяліст сваёй справы, звычайна вядомы эксперт у тэматыцы, на якую найчасцей піша.

Алена ЛЯШКЕВІЧ

Я не журналістка па адукацыі, гісторык-этнолаг, таму асвятляю пераважна тэмы, у якіх разбіраюся ці мела нейкі практычны вопыт. Таму вельмі ўдзячная, што дзякуючы рэдакцыі “К” журналістыка фактычна стала маёй другой прафесіяй. Супрацоўніцтва з газетай пачыналася з асвятлення мерапрыемстваў Мінскага абласнога цэнтра народнай творчасці, дзе я працавала метадысткай, а таксама з публікацыі маіх уражанняў аб вандроўках па Беларусі і замежжы. Вандраваць я працягваю і цяпер, з гонарам бачу падшыўку “К” амаль у кожным сельскім клубе краіны, мне прыемна, калі на фестывалях людзі кажуць, што чытаюць газету. Часта перадаюць прывітанні калегам, часам згадваюць мае артыкулы. Згадкі такія: “У нас некалькі гадоў таму была вось такая імпрэза… Ад “Культуры” журналіст прыязджаў, вельмі добра напісаў пра нас…” Адразу зразумела, што імпрэза сталася вялікай падзеяй, пра якую ўзгадваюць цягам некалькіх гадоў, а невялічкі артыкул, што надрукавала “К”, магчыма, захоўваецца дзесьці ў альбоме разам з выразкамі з іншых выданняў, дыпломамі, граматамі…

На жаль, век папяровай прэсы паступова сканчаецца. Навіны людзі чытаюць у інтэрнэце, аналітыкай мала цікавяцца. У гэтых умовах становіцца зразумела, што ў наступныя 25 гадоў “К” давядзецца інтэгравацца ў патрабаванні часу, быць гатовай да новых форм інтэнсіўнай камунікацыі з чытачамі, выбудоўваць новую маркетынгавую стратэгію. У той жа час застаецца дастаткова чытачоў сталага веку ў сельскай мясцовасці, каму навамодныя маркетынгавыя прыёмы могуць не спадабацца. Але яны шмат год выпісваюць “К” і хацелі б працягваць чытаць газету ў ранейшым фармаце. Захаваць добрае, прырасці лепшым — вось што хочацца пажадаць любімаму штотыднёвіку ў дзень народзінаў.

Першы мой выезд у камандзіроўку ў статусе спецыяльнага карэспандэнта “К” выспаў на Пінск. Памятаю, што пісаў пра праблемы з аказаннем платных паслуг шэрагу ўстаноў райцэнтра, у тым ліку — гарадскога Дома культуры, чыя дыскатэка не карысталася асаблівым попытам у пінчукоў. Ці поўніцца зала Пінскага ГДК сёння — не ведаю, але розгалас тая публікацыя тады атрымала: у газету прыйшоў адказ, падпісаны намеснікам старшыні мясцовага гарвыканкама…

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

З таго часу давялося аб’ездзіць амаль усе райцэнтры краіны, пабываць у шматлікіх вясковых паселішчах і аграгарадках Беларусі, паназіраць за працай сельскіх і гарадскіх бібліятэкараў, а таксама іх калег з невялікіх клубаў і дамоў ці цэнтраў культуры, раённых музеяў ды школ мастацтваў, пагутарыць з многімі людзьмі... Ёсць што ўспомніць добрага, ёсць над чым і пасумаваць: некаторыя праблемныя сітуацыі з дапамогай газеты, на жаль, так і не ўдалося “разруліць”, нягледзячы на ўсе намаганні. Але бывала і адваротнае, калі “К” змагла дапамагчы работнікам культуры ссунуць тую ці іншую справу з “мёртвай кропкі”.

Наўскід прыгадаю праблемы з правядзеннем танцавальных вечароў у Плябанаўскім СДК Ваўкавыскага раёна Гродзенскай вобласці (пасля шэрагу артыкулаў пытанні з начнымі дыскатэкамі там паспяхова вырашыліся), маруднае будаўніцтва новага раённага Дома культуры ў горадзе Глыбокае Віцебскай вобласці (з цягам часу грошы пад пачатак будаўнічых работ усё-такі знайшліся), забеспячэнне сродкамі пажаратушэння ўстаноў культуры Жыткавіцкага раёна (пад гэтыя мэты пасля было атрымана фінансаванне), неабходнасць рамонту ў музеі этнаграфіі вёскі Церабліччы Столінскага раёна (ва ўстанове праз невялікі час замянілі вокны, завезлі новую мэблю і адрамантавалі дах) ды многія іншыя.

Менавіта дзякуючы падобным выпадкам працаваць у “К” і сем гадоў таму, і сёння вельмі цікава. Цікава чытаць адказы начальнікаў аддзелаў ці старшынь райвыканкамаў пра тое, як вырашаецца тая ці іншая праблема, выязджаць праз колькі гадоў у тыя мясціны, дзе бываў раней і адзначаць пэўныя змены да лепшага, сустракацца з даўнімі сябрамі і знаёмымі, якія цяпер ёсць, мабыць, ва ўсіх кутках краіны, разважаць або нават спрачацца з калегамі-журналістамі і спецыялістамі Міністэрства культуры ды абласных упраўленняў над пэўнымі пытаннямі сферы, сышоўшыся за “круглым” рэдакцыйным сталом… Без “К” у маім жыцці ўсяго гэтага папросту не было б. І ці было б падобнае ў нейкім іншым выданні? Шчыра ў тым сумняюся.

Не буду пісаць пра нараджэнне і станаўленне “Культуры”, бо ведаю пра яе “жыццё” таго часу толькі па артыкулах ды разнастайных гісторыях. Хочацца сказаць некалькі слоў пра сённяшні дзень.

Вольга РОПАТ

Працую ў “Культуры” без малога год і, прызнаюся, мне крыху менш, чым выданню. Я яшчэ не зрабіла сабе “імя”, мае матэрыялы, у адрозненне ад некаторых калег, чытачы не шукаюць на старонках у першую чаргу. Уласныя густы фарміруюцца, а прыярытэты ва ўлюбёным выяўленчым мастацтве змяняюцца. На гэта, канешне, уплываюць і прафесіяналы, з якімі працую. Стараюся штодзень набірацца досведу ад калег, тым больш кожны з арт-журналістаў, крытыкаў, публіцыстаў добра арыентуецца не толькі ў пытаннях мастацтва.

Асаблівасць газеты — у складзе рэдакцыі, які дае магчымасць чытачу атрымаць асалоду ад грунтоўных матэрыялаў старэйшага пакалення журналістаў, ад матэрыялаў сярэдняга пакалення і маладога, якія патрабуюць ад чытача ўвагі, часу для асэнсавання ды арыентацыі ў сучасным культурным працэсе — гэтыя тэксты бываюць вельмі рознымі па напаўненні і ступені “аналітычнасці”, але заўсёды застаюцца шчырымі і эмацыянальнымі. Менавіта повязь пакаленняў робіць газету цэласнай і разнастайнай. Розныя погляды, розныя меркаванні. Дыскусія? Процілегласць думак? Тым больш цікава!

Яшчэ адной асаблівасцю, на маю думку, можна лічыць шэраг цікавых матэрыялаў пазаштатных аўтараў. Зараз галоўную ўвагу надаю не столькі ўзаемадзеянню з чытачамі, работнікамі ўстаноў культуры, колькі жанрам.

Заканчэнне — **на старонках 4 — 5.**



“Нешта святочнае ў гэтым ёсць...”

25 ГАЗЕТА “КУЛЬТУРА” РАВЕСНІЦА НЕЗАЛЕЖНАЙ БЕЛАРУСІ

(Заканчэнне. Пачатак на старонках 2 — 3.)

З нядаўняга сваёй формай спадабаўся тэкст “Раман з Мінскам” сталічнага фатографа Вадзіма Качана. Альбо варта згадаць, як мне падаецца, спецыфічны, але запамінальны цыкл публікацый паводле дзённікавых запісаў беларускага кампазітара Ігара Паліводы. Хочацца вылучыць рубрыкі, якія ў нашай газеце чытаю з найбольшым задавальненнем: “Мастыхін” (класіка “К”), “Сэлфі: творца пра твор” і “Рэдакцыя +”. Памятаю, як адна практыкантка ў мяне спыталася, чаму адзін чалавек не можа падрыхтаваць пытанні да інтэрв’ю ды з’ездзіць да героя. А гэта і ёсць “культураўская” “фішка” — прыходзіць да творцы амаль усім калектывам, з мноствам поглядаў на яго дзейнасць і на свет увогуле.

Крыўдна, што моладзь зараз успрымае газеты як дыназаўраў. Шкада, што ўвага звяртаецца не столькі на напаўненне, колькі на слова “газета”, таму што ў прыярытэце ў маладога пакалення, зразумела, сайты рознага кшталту... А як жа ўнікальная “цеплыня” і “ўтульнасць”? Варта згадаць душэўныя рубрыкі “На людным месцы” і “Фатаграфічная калекцыя”, якія будуць зусім інакш успрымацца ў электронным выглядзе... Але “Культура” павінна прымаць і прымае правілы новай гульні. Каб стаць у ёй добрым гульцом.

Галоўны рэдактар загадаў напісаць пра маё стаўленне да маёй працы ў газеце “Культура”. Карацей, пару тысяч знакаў з нагоды 25-годдзя выхаду ў свет яе першага нумара. Калі сціслa сказаць, стаўленне — станоўчае, бо пішу пра работнікаў культуры абласцей, раёнаў, вёсак. І цудоўна адчуваю пры гэтым, што менавіта тут сканцэнтраваны асноўны кадравы скарб. У сталіцы валошкі не растуць. Таму лічу, што справу выконваю пачэсную: пішу пра і для рэгіянальнага чытача. Вось пра яго каротка не атрымаецца.

Яўген РАГІН

Не падумайце, што стаўлю крыж на мінскіх мастаках, спеваках ды танцорах з акцёрамі. Іхнія карані ці карані іх бацькаў абавязкова жывяцца вёскай або мястэчкам. Беларусь — краіна вясковая? А хто сказаў, што гэта кепска? У разбэшчаным замежжы мегаполіс даўно стаў месцам адно толькі працы, а правінцыя займела недасягальны аўтарытэт як жытло і асяродак творчага адхлання. Цвёрда веру, што і мы прыйдзем да такога яднання з прыродай. Трэба толькі навучыцца сябе паважаць.

А вось гэтай павазе і вучаць штодня лепшыя работнікі культуры краіны. У чым атрымліваюць сілы? Пытанне для пачаткоўца. Натуральна — у нашай гістарычнай спадчыне. Вось такіх асоб і расшукваю. Тым жа займаюцца і мае калегі. Цікавяць нас адметныя праекты па захаванні помнікаў даўніны, па развіцці рамёстваў і промыслаў, па асваенні харэаграфічнага і песеннага мастацтва нашых продкаў. Інакш кажучы, у цэнтры ўвагі “Культуры” — пошук і адраджэнне беларускай традыцыйнай рэгіянальнай спадчыны.

У Падуанскім універсітэце ёсць славутая Зала сарака. Тут змешчаны выявы тых, хто тут вучыўся ці вучыў. Сярод знакамітасцяў — Капернік, Галілей, Скарына. “Культура” за 25 гадоў існавання таксама мае сваю галерэю выбітных асобаў. Толькі іх не сорак, а ў дзясяткі разоў больш. І штотыднёва галерэя папаўняецца новымі партрэтамі. Так ёсць і так будзе.

25 аўтатураў газеты “Культура” за 25 гадоў яе існавання... Менавіта гэтымі словамі хацелася назваць артыкул, прысвечаны аднаму з яскравых праектаў выдання. І ўсё ж нашых паездак у фармаце аўтатура атрымалася пакуль трохі менш, ды і пачаліся яны адносна нядаўна — прыкладна тры гады таму.

Кастусь АНТАНОВІЧ

А здарылася ўсё з вельмі простай прычыны: хацелася за час кароткачасовай камандзіроўкі пабачыць як мага больш, ды і як мага з большай колькасцю работнікаў культуры пазнаёміцца. Так яно і сталася: за тры — чатыры камандзіровачныя дні ў такім фармаце атрымлівалася сустрэцца прыкладна з двума дзясяткамі цікавых суразмоўцаў, наведаць установы культуры трох, а тое і чатырох (наш рэкорд!) раёнаў. І самае галоўнае, што прывабіла нас у такім фармаце: аб’ектыўнасць адлюстравання рэалій культурнага жыцця краіны, магчымасць убачыць працу сельскага клуба ў аддаленай, забытай усімі вёсачцы.

Не абыходзілася і без побытавай рамантыкі. Даводзілася нам начаваць і ў прыватных асобаў, як гэта сталася ў час першай нашай вандроўкі ў вёсцы Русіно, і ў інтэрнатах устаноў адукацыі, як гэта часта бывала ў гарадах, дзе з розных прычын да сёння няма гатэлю, і ў пушчанскіх фешэнебельных апартамантах.

Адбываліся сустрэчы чаканыя і не зусім. Запомніліся словы адной бібліятэкаркі: у мяне сёння дзень нараджэння і я якраз сёння чакала, што ваш аўтатур завітае і ў маю ўстанову. Было не да смеху ў іншых сітуацыях (прызнаемся, адзінкавых), калі работнікі культуры, а дакладней, ізноў прадстаўнікі бібліятэчнай сферы проста дранцвелі ад страху, пабачыўшы пасведчанні сталічных журналістаў. Радуе, што ўсё ж часцей у час нашых прыездаў культработнікі былі настроены на канструктыўны дыялог.

Заспелі мы важны, калі не сказаць, пераломны момант у развіцці айчыннай культуры: усюдысную аптымізацыю. Далёка не паўсюль наконт яе адгукаліся станоўча. Скажам, што прыемнага ў тым, калі ў вёсцы зачыняюць бібліятэку ці клуб? Разумелі мы, што адваротны бок медаля: эканомія дзяржаўных сродкаў. Тым не менш стараліся заступацца ў сваіх аўтатураўскіх публікацыях за канкрэтных работнікаў культуры, што трапілі пад скарачэнне. Часам вынікова, часам — не зусім. Неаднаразова ўздымалі мы і тыповыя праблемы, характэрныя для рэгіянальнай культуры. Згадаем хаця б рэжым правядзення дыскатэк. За той час, пакуль мы асвятлялі пытанне ў сваіх публікацыях, у тым ліку рэкамендуючы праводзіць дыскатэкі як разавыя мерапрыемствы, жаданне ды і звычка на іх хадзіць у моладзі амаль знікла. Каму ад гэтага стала лепш? На гэтае пытанне цяжка знайсці адказ.

Не дзіўна, што нашы першапачатковыя лірычныя адступленні — задуманыя як разважанні на калякультурную тэматыку неяк раптоўна пераўтварыліся ў “нелірычныя”, з канстатацыяй болевых кропак развіцця нашай рэгіянальнай і нацыянальнай культуры.

Што прыемна, фармат “аўтатура” дазволіў аператыўна супастаўляць формы і метады працы ўстаноў культуры ў розных абласцях і раёнах, параўноўваць эфектыўнасць кадравай палітыкі, патрабаванняў да выканання плана па аказанні платных паслуг. Тым самым мы паспрабавалі калі не аб’яднаць, дык хаця б зблізіць работнікаў культуры ўсёй Беларусі. Атрымалася ці не — меркаваць чытачам “Культуры”.

Мне шанцавала з рэдакцыямі выданняў, у якіх я працаваў, з іх людзьмі. Перайначваючы адзін з лістоў таварыша Сухава яго даражэнькай, ненаглядная ды неацэннай Кацярыне Мацееўне, народ у іх быў рахманы, далікатны, можна сказаць, душэўны, з агеньчыкам, так што ногі мае з раніцы да прыпынку беглі, бо абавязак журналісцкі клікаў своечасова прыбыць да месца службы, каб неадкладна прыступіць да напісання чарговага опуса.

Алег КЛІМАЎ

То бок ніякія ўжо такія ўнутрыкалектыўныя катаклізмы не маглі парушыць працэс творчасці, бо іх не было. Гэта тычыцца і “Культуры”. Нашу рэдакцыйна-выдавецкую установу ўзначальваюць вопытныя і заслужаныя кадры. Патрабавальныя прафесіяналы і спагадныя людзі ў адным памяшканні. “Уставіць банан” начальнікі, вядома ж, могуць, але не з прычыны самадурства, якое немаведама адкуль узялося, а па сутнасці. Мае калегі ды іншыя служачыя РВУ жаночага полу — прыгажуні з прыгажунь (дарэчы, з яркімі паненкамі мне фарціла ва ўсіх без выключэння рэдакцыях). І таксама спецыялісты высокага класа. Да якіх я адношу, натуральна, і нашых мужчын. “Прагін” прашу залічыць, пераходжу да наступнага пункта прызнанняў.

Удзячны за тое, што значна больш шчыльна сутыкнуўся з найбагатай беларускай культурай. Да таго, як я прыйшоў у газету, культура для мяне шмат у чым абмяжоўвалася светам айчыннай музыкі, пераважна рок-напрамку, у меншай ступені — эстрадай. А цяпер якога я толькі культурнага паветра ні нюхнуў — і кіно, і тэатраў, і цыркаў, і музеяў, і бібліятэк, і палацаў з дамамі культуры, і цэнтраў рамёстваў, і... нават заапарка! Увогуле, калі на нейкім культурным полі мая нага яшчэ не ступала, там яна абавязкова ступіць. У рэшце рэшт, як мне здаецца, я лепш пазнаў сваю краіну, матаючыся ў камандзіроўках з аднаго яе боку ў іншы. Адчуў, спадзяюся, чым яна дыхае за межамі МКАД, як жыве, у што верыць, чаго чакае. Паспрабаваў разабрацца ў тым, што, калі ёй ёсць справа да культуры, то ў якой меры. І, думаецца, лепш пазнаў людзей наогул. Але асабліва тых, якія працуюць у культуры. І гэта апошні пункт у маіх “рэспектах” ды “ўважухах”...

Напішу банальнае. Памятаеце, як Маленькі прынц кожны дзень прыводзіў у парадак сваю планету? Так і вялікія ды маленькія людзі ад беларускай культуры кожны дзень паліваюць ды чысцяць яе, ахоўваюць ад скразнякоў. Часам у запале я нападаў на іх, ледзь не крычучы, маўляў, ну як так можна, за такую зарплату, ды ўкладваючы ўласныя грошы, душу, нервы, ну каму гэта трэба?! Яны, гледзячы на мяне прыгожымі, яснымі, стомленымі вачыма, вельмі спакойна і нават неяк здзіўлена (або пакрыўджана) адказвалі: “Нам, нашым дзецям, Беларусі”. Дзякуй, “Культура”, што пазнаёміла мяне з гэтымі людзьмі. Хай гэта прагучыць пафасна, але пасля такіх сустрэч на навакольнае я стаў глядзець крыху інакш, з вялікім аптымізмам, ці што?

Перабольшаннем было б сказаць, што кожны будні дзень я езджу ў сваю “Культуру”, як на свята. Але, перайначваючы адну з фраз бургамістра з тэлефільма “Той самы Мюнхгаўзен”, нешта святочнае ў гэтым ёсць.

У той год, калі я паступала на журфак БДУ, набралі велізарны курс — пад дзве сотні чалавек. Як хутка высветлілася, большасць з іх марыла праявіць сябе ў спартыўнай журналістыцы. На тых, хто цікавіўся культурай і мастацтвам, паглядалі з усмешкай, маўляў, чым бы дзяўчаты не цешыліся... Прайшло дзесяць гадоў з заканчэння факультэта, лёс раскінуў маіх аднакурснікаў не толькі па розных краінах, але і па спецыяльнасцях, далёкіх ад уласна журналістыкі, але з ліку модных, звяза-

ных з рэкламай, піярам, прасоўваннем. Адно засталося нязменным: здзіўленыя ўсмешкі пры агульнай сустрэчы: "А ты ўсё займаешся культурай?"

Настасся ПАНКРАТАВА

У нашым грамадстве складаецца сітуацыя, калі паступова губляецца неабходнасць займацца культурай, казаць пра мастацтва. Пятнаццаць гадоў таму ўсе казалі, што ў СМІ пад рубрыкай "Культура" размяшчаюць навіны выключна шоу-бізнесу, сёння ж на запатрабаваных парталах гэты загаловак увогуле знікае, а дробязі культурных падзей пераходзяць у раздзелы кшталту "Грамадства"…

Сапраўды, што зараз дае культурная сфера чалавеку, які прысвяціў ёй сваё жыццё? Пра грошы адразу прамаўчым. Я ўжо перастала здзіўляцца, калі на бацькоўскім сходзе ў школе ці садку чалавек прадстаўляецца фатографам, а ты пазнаеш у ім саліста адной з вядучых устаноў культуры: што рабіць, калі толькі камерцыйныя фотасесіі могуць забяспечыць патрэбы сям'і, а асноўная прафесія прыносіць хутчэй творчае задавальненне… Хаця з апошнім таксама не ўсё так адназначна. Работнікі культуры стамляюцца пераадольваць шматлікія патрабаванні на шляху да самарэалізацыі. Ці да пошуку новай мовы тэатру, калі над ім дамоклавым мячом вісіць план напаўняльнасці залы. Як бібліятэкару займацца сваёй справай, калі на авансцэну выходзіць выкананне плана платных паслуг? Як удасканальвацца рэстаўратарам, калі нават у вядучых майстэрнях у эпоху высокатэхнічных тэхналогій атрыбуцыю праводзяць пры дапамозе прабіркі і піпеткі? Такіх "як" ды "але" назбіраецца два вазы з лішкам, таму агульная праблема па ўсіх кірунках сферы культуры — змена пакаленняў, бо ўсё менш у нас моладзі, гатовай займацца творчасцю насуперак шматлікім акалічнасцям…

Калі пачынаю задумвацца, дзеля чаго працую, мне на памяць прыходзіць цытата з майго любімага спектакля "Юнона" і "Авось": "Нас мало и нас всё меньше / Но самое страшное, что мы врозь". Я адчуваю, што "Культура" існуе дзеля таго, каб даць упэўненасць кожнаму з работнікаў культуры, што ён не "апошні з магікан", што па краіне яшчэ шмат такіх жа энтузіястаў, якія за ідэю гатовыя звярнуць горы, якія, магчыма, непрыкметна для мас, але сапраўды ўплываюць на развіццё айчыннага мастацтва. Наша газета ўзнікла на хвалі, калі пра мастацтва патрабавалася казаць уголас. За 25 гадоў мы не паспелі дасягнуць усяго, чаго хацелася, прынамсі, мне шкада, што пакуль мы не сталі паўнавартаснай пляцоўкай, якая аб'ядноўвала б усіх аднадумцаў. Аднак мы ўжо з'яўляемся тым акенцам, праз якое можна сачыць за хадой гісторыі. На фоне ўсеагульнага канстатавання культурных падзей часам толькі ў "К" можна знайсці грунтоўны аналіз пабачанага, пра што сведчаць нашы чытачы.

Я ўпэўнена, што мы працуем на будучыню. Сёння многія дзеячы культуры пераходзяць у сацсеткі, дзе самі пра сябе распавядаюць. Так прасцей, ды і "лайкі" адразу сабраць можна, а артыкул крытыка часцяком і супраць шорсткі пагладзіць. Аднак "лайкі" хутка згубяцца на прасторах Сеціва, у гісторыі ж застанецца "Культура".

Я непрацяглы час працаваў ў газеце "Культура" ў сярэдзіне 1990-х і, дзякуючы шчаслівому выпадку, вярнуўся сюды зноў некалькі гадоў таму.

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

Я кажу "выпадак", але насамрэч у жыцці не бывае нічога выпадковага. Ёсць сэнс у тым, што пасля зыходу з "Культуры" мне давялося пакаштаваць журналісцкага хлеба ў выданнях рознай спецыялізацыі і скіраванасці, і наканаванасць — у тым, што зрэшты з гэтым досведам я зноў тут. Гэта як вярнуцца на радзіму пасля доўгай вандроўкі.

З тых 1990-х газета змянілася вонкава, стылёва, набыла рэспектабельнасць, але, што надзвычай важна, захавала дэмакратызм. Вясковы фэст для журналістаў "Культуры" такая ж важная падзея, як прэм'ера ў сталічнай оперы. Сваёй штодзённай працай "культураўцы" даводзяць нібыта відавочны, але, магчыма, не ўсім уцямны факт, што за межамі мегаполіса, за Мінскай кальцавой аўтадарогай таксама ёсць жыццё, і яно такое ж змястоўнае і эмацыйна насычанае, як і ў сталіцы.

На маю думку, самае галоўнае дасягненне рэдакцыі (праз якую за 25 гадоў прайшлі асобы, знаёмствам з якімі можна ганарыцца) — тое, што газета ўвогуле існуе. Што ні кажы, а культура — гэта раскоша. І заўжды было і будзе шмат ахвотных на ёй эканоміць, звесці выдаткі на культурную справу да мізеру. Але ж, як казаў адзін літаратурны герой, "Без неабходнага я пражыву, а без раскошы — ніяк".

Дык вось, культура, у шырокім і шчыльна-канкрэтным сэнсе, гэта тая раскоша, без якой неабходны набор жыццёвых чыннікаў ніколі не будзе паўнавартасным.

Напэўна, самы цяжкі матэрыял пішу за апошні час. Да дня нараджэння газеты, у якой працую ўжо два гады. Але ода ўсё роўна не атрымліваецца.

Аліна САЎЧАНКА

25 — гэта калі вугры даўно сышлі, калі можна смела нараджаць дзіця і параралельна не кідаць работу, бо моцы павінна хапіць на ўсё адразу. Гэта калі твае сябры яшчэ побач і разам, бо маладыя ж людзі бессмяротныя. У добрай газеты век можа цягнуцца не адно стагоддзе, такія прыклады ў гісторыі мы маем. Таму наша "25" лічу толькі разгонам у будучыню. Але зараз бяжыцца неяк цяжкавата.. Розных "магчыма" стае. Вось адна з маіх версій: мы дакладна не ведаем сваю аўдыторыю і ніяк не можам дагрукацца да яе. Людзі зараз часцяком абыякавыя. Усё гэта не адмяняе нашай штодзённай працы і не робіць яе непатрэбнай.

Хачу сказаць вялікі дзякуй сваім калегам, якіх нібыта адбіралі на кастынгу "ідэальны калега для Аліны Саўчанка". Я вельмі вас усіх люблю і шаную нашу непарыўную сувязь і еднасць. Ну і, канешне, трэба падзякаваць тым, хто нас усё ж такі чытае ды піша нам у рэдакцыю свае ўласныя тэксты. Тое для нас не мае кошту.

У лідара гурта "Акварыум" Барыса Грабеншчыкова, які "займаўся" маім выхаваннем, калі мама надта шмат працавала, ёсць цудоўная песня "25 да 10". Яна пачынаецца вельмі дарэчна да сённяшняга дня:

"Я инженер на сотне рублей, и больше я не получу. / Мне двадцать пять, и я до сих пор не знаю, чего хочу. / И, мне кажется, нет никаких оснований гордиться своей судьбой. / Но если б я мог выбирать себя, я снова бы стал собой".

Я толькі спадзяюся, што і наша газета хацела б быць вернай толькі самой сабе і сваёй аўдыторыі. Пра большае марыць і не варта.

Нягледзячы на парады псіхолагаў раз-пораз мяняць месца працы, у "Культуры" я адрабіў ужо настолькі шмат, што ў гэтым нават сорамна прызнавацца маладзенькім дзяўчатам — хай яны і надалей думаюць, быццам "столькі не жывуць".

Ілья СВІРЫН

Сама газета за гэты час неаднойчы мяняла фармат. Спярша была "асветніцкая" стадыя (я заспеў яе хіба ў якасці чытача), затым — "інтэлігенцкая", якая запомнілася найперш дадаткам "ЗНО", потым — "афіцыйна-інфармацыйная"… Як мне падаецца, тэндэнцыя апошняга часу — гэта максімальнае наближэнне да таго чытача, чый кругагляд не абмяжоўваецца сферай яго прафесійнай дзейнасці, да асобы, якая цікавіцца чужымі меркаваннямі пра развіццё культуры ды ахвотна і шчыра выказвае свае.

Зразумела ж, такім людзям уласцівы крытычны падыход. Заўвагі ад іх даводзіцца чуць рэгулярна. "Вы б да назвы газеты дадалі прыметнік "сельская", і тады яна б адпавядала рэчаіснасці" — кпіць сівабароды мастацтвазнаўца. "Ну колькі ўжо можна пісаць пра адну сталіцу! У нашым гарадку таксама ёсць культура, але вы яе чамусьці не заўважаеце" — абураецца апантаны дырэктар не самага вялікага ДК.

Тлумачыць ім, што "Культура" заўсёды імкнецца вытрымліваць баланс паміж сталічнай і рэгіянальнай тэматыкай (прычым, як падаецца, даволі паспяхова), часта бывае справай бясплённай. Бо самі папрокі сведчаць найперш пра іншае: адзіная на Беларусі профільная газета такога кшталту — гэта не тое што нялішні элемент у беларускай медыяпрасторы. Гэта тое выданне, якога адназначна замала! Бо, вядома ж, 16 палос — не гумавыя, і напісаць пра ўсё, вартае ўвагі, папросту немагчыма. А тым больш — напісаць так, каб кожнаму гэта было па гусце.

Памкненні стварыць нейкую трывалую альтэрнатыву (хаця б нават у электроным выглядзе) рабіліся неаднаразова, але пераканаўчага плёну пакуль не прынеслі. А адлюстраванне культурнай тэматыкі на старонках і вэб-старонках звычайных СМІ няўхільна працягвае свой рэгрэс, даводзячы, што паняцце дна з'яўляецца занадта рэлятыўным, каб можна было адштурхнуцца і ўсплыць.

І менавіта таму кола аўтараў ды герояў "К" няспынна пашыраецца. Многія з іх успрымаюць газету як свайго кшталту рупар, з дапамогай якога можна падзяліцца ўласнымі задумамі на тэму "як зрабіць гэты свет лепей". На жаль, газетнае слова не мае перфарматыўнай сілы, здатнай варочаць камяні, і многія такія ідэі ў сваім статусе і застаюцца. Тым не менш, іх публічнае агучванне, як падаецца, мае не толькі тэрапеўтычны эфект а-ля "паплакацца ў камізэльку". І назіраючы за тымі працэсамі, якія доўжацца гадамі і дзесяцігоддзямі, ты разумееш, што пэўны рух — ідзе.

Вы і самі адзначыце гэта, калі падымеце нашы падшыўкі. Тыя ідэі, якія некалі ўспрымаліся на ўзроўні "Гэта немагчыма", сёння дасягнулі ўжо трэцяй стадыі эвалюцыі ды падаюцца ўсім банальнымі "баянамі". Няўзброеным вокам гэты рух не заўважыш, але… без сумневу, вада, усё ж, здатная спакваля тачыць камяні.

Вось ўжо колькі гадоў, працуючы ў "культурнай" газеце, лаўлю сябе на думцы: а для каго, уласна, мы пішам? Хто наш патэнцыйны чытач? Міністэрства культуры? Мастацкае кола? Сельская інтэлігенцыя? Мне падаецца, што сёння, ды, напэўна, заўжды, адказ мусіць быць адзін — беларускае грамадства. Дык на што ў такім кантэксце "здольная" культурная журналістыка?

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

Згадваецца цікавы прыклад. Сёлетняя выстава "World Press Photo", якая ладзілася ў арт-прасторы "ЦЭХ", экскурсію вядзе куратар з Нідэрландаў Лоўрэнс Кертвэг. Праблемы забруджвання навакольнага асяроддзя, эміграцыйны крызіс, паўсядзённасць, якая выяўляе, напрыклад, вугальную залежнасць Кітая, ці вывучэнне камерцыйнага патэнцыялу Антарктыкі… "А дзе ж намінацыя "Культура"? — пытаюся я ў Лоўрэнса. "Культура? — перапытвае куратар. — Няма такой. Таму што ўсё гэта — і ёсць культура".

Вось такі адказ, і такая разумная думка, што ўсё, што атачае нас — і ёсць культура. І не толькі ў замежных краінах, а вось тут, побач, "пад носам", як гаворыцца. Забруджванне паветра выкідамі вуглякіслага газу — так, культура экалогіі; засілле шансону ў маршрутках і кавярнях — культура фонасферы; маленькія вуліцы і двары, запруджаныя машынамі так, што не прайсці пешаходу — культура павагі да асабістай прасторы; халодная кава ў кафэ — культура абслугоўвання; кпіны з тых, хто размаўляе на беларускай мове, — культура роднага краю, нават вось гэты жудасна-безаблічны зварот "Жанчына!" (або таго горш — "Жэншчына!") — таксама культура звароту да постаці, асобы.

Куды ні зірні, яна паўсюль — культура, а не толькі ў канцэртных залах, музеях, тэатрах, клубах ці бібліятэках… Магчыма, калі пачынаць з тых пазіцый, што яна і ёсць наша жыццё, тое паветра, якім дыхаем, неабходнасць, стваральнікамі якой з'яўляемся мы самі, — стаўленне да яе зменіцца?

І ў гэтым сэнсе я жадаю сваёй "Культуры" больш гучных праектаў, якія відавочна паказалі і даказалі б гэта. Якія выявілі б, што культура — не толькі мінулае, але цяперашняе і будучае асабіста кожнага з нас.

К

Дзяжурны па нумары

Эпапея за эпапеяй. Калі ж канец?

Мары, на жаль, не заўсёды спраўджваюцца наяве. Дасюль памятаю, як па маім прыходзе ў газету, у студзені 2009 года, рэдакцыя распачала новы праект "Родная зямля: час крэатыву". Першая публікацыя названага цыкла рэдактара аддзела "К" Яўгена Рагіна мела загаловак "У сваім доме ды без Дома культуры?" і распавядала пра гаротны стан Глускага РДК, прызнанага яшчэ тады аварыйным. Другая публікацыя, ужо пад маім прозвішчам, "Як завяршыць рамонтную эпапею ў Крупках?", паведамляла пра цяжкасці ў тамтэйшых бібліятэкараў: галоўная раённая "кніжніца" вымушана была "кватараваць" у адным будынку з дзіцячай раённай бібліятэкай. Таксама меліся праблемы з рамонтам мясцовага РДК.

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Мары работнікаў культуры Гluска былі досыць канкрэтныя: займець новы будынак для галоўнай установы культуры раёна, значна большы па памерах ды абсталяваны па апошнім слове тэхнікі. У Крупках мясцовыя ўлады думалі пра тое, каб перавесці раённую бібліятэку на новае месца дыслакацыі і нават ужо адшукалі патрэбны для гэтага будынак у цэнтры мястэчка, а рамонт у мясцовым ГДК на той час быў амаль завершаны.

Праз тры з паловай гады, у сярэдзіне 2012 года, я зноў завітаў у Крупкі. На шчасце, гарадскі Дом культуры ўжо паспяхова выконваў свае функцыі, а ў будынку, дзе меркавалася размясціць бібліятэку, поўным ходам ішоў рамонт. Гаротныя бібліятэкары так і суіснавалі ў адным будынку, як і ў пачатку 2009 года, але ў наступным, 2014-м вельмі спадзяваліся пераехаць у новую раённую "кніжніцу"…

На сёння мінула ўжо сем гадоў з часу названых мною публікацый. У Глуску, як я пераканаўся на свае вочы год таму, спадзяванні жыхароў на новы будынак раённага Дома культуры засталіся няздзейсненымі. Справа ў тым, што наяўная праектна-каштарысная дакументацыя, як адзначыла мне начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Глускага райвыканкама Наталля Гулевіч, састарэла, патрэбна рабіць новую, што запатрабуе шмат грошай. Ды і само будаўніцтва новай галоўнай установы культуры горада "пацягне" на мільярды "старых" рублёў. І ці знойдуцца яны цяпер ці ў найблізкім будучыні — пытанне з досыць няпэўным адказам.

У Крупках таксама змянілася не на шмат: па словах намесніка начальніка аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі мясцовага райвыканкама Таццяны Мельнік, новы будынак раённай бібліятэкі хоць і даведзены да ладу, але на сёння стаіць пусты:

— Справа ў тым, што ў новую бібліятэку нам трэба новая ж мэбля, стэлажы, камп'ютары і гэтак далей, — карацей кажучы, поўнае "начынне", — сказала Таццяна Мельнік. — Пакуль што грошы пад гэтыя мэты не выдаткаваны (а гэта прыкладна 700 мільёнаў "старых" рублёў), таму ўсё застаецца па-старому: бібліятэкары раённай установы працуюць у будынку бібліятэкі дзіцячай. Нядаўна мы зрабілі там невялікі рамонт, так што ўмовы ў дзіцячай "кніжніцы" больш-менш прымальныя… Спадзяемся, што ў наступным годзе нам выдаткуюць неабходную суму і нашы бібліятэкары ўсё-такі справяць наваселле, на якое, я абяцаю, абавязкова будзе запрошана "К"!

Як бачна, зноў застаецца адно толькі чакаць. Праўда, колькі гадоў яшчэ будуць цягнуцца рамонтныя эпапеі — а іх ва ўстановах культуры Беларусі нашмат больш, чым я згадаў у артыкуле, — невядома: усё, натуральна, залежыць ад эканамічнай сітуацыі ў краіне. Запрацуе эканоміка — знойдуцца грошы на будаўніцтва дамоў культуры і абсталяванне бібліятэк найноўшай тэхнікай і мэбляй… А пакуль рамонтная эпапея што ў Глуску, што ў Крупках працягваецца… Да якой круглай даты на календары "К"?

К

Сутнаснае для культуры

Добрай традыцыяй Міжнароднага фестывалю Юрыя Башмета стала не толькі сусветная прэм'ера беларускага твора (сёлета гэта была партытура "Sleepwalker" Сяргея Бадалава — пра яго ў "К" № 40), але і запрашэнне на свята кагосьці са знакавых кампазітараў сучаснасці, выкананне яго музыкі і творчая сустрэча з майстрам у Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі. Сёлета такой асобай стаў сусветна вядомы ўкраінскі творца Валянцін СІЛЬВЕСТРАЎ, некаторыя выказванні якога мы публікуем, вылучыўшы іх з надзвычай цікавага дыялагічнага "трыа" ў складзе згаданага Сільвестрава, яшчэ аднаго нашага госця — расійскага піяніста Аляксея Любімава і загадчыка кафедры кампазіцыі БДАМ Галіны Гарэлавай, якая вяла сустрэчу, дапаўняючы размову сваімі арыгінальнымі думкамі.

Занатавала Надзея БУНЦЭВІЧ



Валянцін Сільвестраў: срэбраныя гукі — залатыя словы

Пра жанр сімфоніі і сімфанізм: у агні ці ў цяпле?

— Сімфонія як жанр, на маю думку, ужо дасягнула свайго найвышэйшага развіцця. Пасля Брукнера і Малера зварот да гэтага жанру ў Еўропе зніжаецца. Амаль не піша сімфоній Стравінскі, у Шонберга яны камерныя, а гэта штосьці зусім іншае. Сярод найбольш значных кампазітараў адважыўся працягнуць жанр хіба Шастаковіч, але на тое яго скіравалі пэўныя абставіны — існаванне ў краіне рэжыму ўціску. Узнікла сітуацыя, блізкая да той, што прывяла да сімфоній Бетховена. Ён жа насамрэч быў найтонкім лірыкам, але ягоныя сімфоніі (і знакамітая 9-я ў тым ліку) — рэакцыя на эпоху напалеонаўскіх войнаў, аточаную бедамі ды няшчасцямі. Тое ж і ў Шастаковіча: асэнсаванне сталінскай эпохі, фашызму прывяло яго да жанру, дзе ўсе гэтыя думкі можна выявіць найбольш поўна і шматгранна, у рамках буйнога шматчасткавага цыкла. У таго ж Пракоф'ева сімфанізм пераважна апавядальны, у Шастаковіча ж — сапраўды працяг брукнераўскіх і малераўскіх дасягненняў. Не дзіва, што ўсе кампазітары таго часу адразу падпадалі пад ягоны ўплыў.

А што ж я? Мае бацькі перажылі тыя навалы XX стагоддзя, я ж нарадзіўся ў іншы час. І хаця пра ўсё тое ведаю, не перажыў гэта ў сваім жыцці, застаўся гэткай "няпужанай птушкай". Значыць, трэба жанр сімфоніі паварочваць у нейкі іншы бок, адводзячы яго ад ранейшага экспрэсіянізму. Бо экспрэсіянізм — гэта музыка ў агні. Калі ж замест тых вогнішчаў — бы ў цёплай прыбіральні, значыць, і ў самім жанры трэба рабіць усё іначай. Ну, якое можа быць у ім скерца? Які фінал? У тагачасных савецкіх сімфоніях звычайна было шмат кульмінацый, але пераважваў аптымістычны настрой. Трагізм, вядома, сустракаўся, але ён быў нейкім падазроным, бо надта многа сумаваць было нельга, трэба было абавязкова прыйсці да высновы, што ўсё цудоўна. І я зразумеў, што гатовы напісаць коду ўсёй еўрапейскай сімфоніі, назваўшы яе постсімфоніяй. Трэба было адмовіцца ад абвяшчэння ўсіх тых ісцін, ашчадна ставіцца да кульмінацый — гэта было выйсце.

Пра авангард: што выкапаць рыдлёўкай?

— Сам тэрмін "авангард" — даволі падазроны. Вельмі часта атрымліваецца, што хтосьці бяжыць наперад не таму, што хочацца бегчы, а таму, што даганяюць і трэба адарвацца ад пагоні. Насамрэч авангард — гэта рызыка. Яго можна параўнаць з тым, як хтосьці праходзіць па тонкім лёдзе, робячы першую сцяжынку. Гэтаму чалавеку штосьці неадкладна было патрэбна на тым беразе — і ён рызыкнуў. А за ім пайшлі натоўпы — і гэта ўжо не авангард, а, як я называю, "акадэмізацыя авангарду". Авангардыст павінен увесь час ісці наперад, шукаць новыя шляхі. Калі ж той ці іншы шлях пракладзены — пра які ж гаворым авангард? Заслуга авангардыстаў у тым, што яны вынаходзілі новыя метады. Але калі той метад знойдзены, часам атрымліваецца, што ён падмяняе саму сутнасць. Гэта прыблізна тое ж самае, як вынаходніцтва рыдлёўкі. Рыдлёўка вынайдзена — і патрэбна яна для таго, каб ёй штосьці выкапаць. Але, бывае, капаеш-капаеш, а там нічога няма. А рыдлёўка ёсць! І ў яе ёсць свой "аўтар". Сучасныя музычныя творы часам нагадваюць тую ж рыдлёўку: яна ёсць, а каб ёй штосьці выкапаць, рукі не даходзяць. Але ў якасці вучэбнага працэсу, засваення тэхнік пісьма — гэта неабходна. Тыя ж класікі таксама ўмелі ганяць гукі туды-сюды (і гукі, што важна, не супраціўляліся, лёталі), бо знайшлі адпаведны метад, спосаб ператварыць музыку ў нейкія агульныя катэгорыі. Гэта прыблізна тое ж, што даць стадыёну магчымасць адрэагаваць на забіты гол: усе кудысьці пабеглі, закрычалі, потым усё сціхла. І атрымліваецца нейкая музычная форма — адбітак рэальных жыццёвых працэсаў. Авангард, такім чынам, пачаў даследаваць не семантыку, а самі музычныя працэсы. Але галоўны ягоны ўнёсак — ён навучыў людзей слухаць свет, як тую ж музыку. Мне як музыканту не трэба, каб на скрыпцы Страдывары перадавалі ўсялякія шоргаты, якія я магу пачуць у жыцці: усё гэта можна знайсці і на вуліцы — і куды ў большай колькасці. Авангард прывёў да змены музычнай мовы — як я зараз перастаў бы выказвацца закончанымі фразамі, сказамі, а пачаў бы "гуляцца" асобнымі словамі і нават літарамі. У паэзіі, дарэчы, усё гэта было, але не замяніла сабой усю літаратуру. Так і ў музыцы. На мой погляд, яна сёння павінна вярнуцца да нармальнай уласцівай ёй мовы. Вось я зараз кажу на "састарэлай" мове Пушкіна. Ці ж гэта значыць, што яе трэба адкінуць? Так, яна развіваецца, узнікаюць новыя словаўтварэнні, сыходзяць нейкія старыя. Але іншай мовы няма! Музычная мова, вядома, таксама зменяецца, але не так хутка, як нам, можа, таго хацелася б.

Пра творчы працэс: напісанае ці сутнаснае?

— Калі ў мяне пытаюць, што вы, маўляў, зараз пішаце, я звычайна губляюся. Бо я музыку не пішу, я яе найперш слухаю. І ў працэсе работы над новым творам быццам увесь ператвараюся ў гэткае вялізнае вуха, якое ўлоўлівае самыя тонкія матэрыі. Бывае, музыка напісана на паперы: гладка, роўна, прыгожа. А бывае — можа, і не так гладка, але яна не напісана ў прамым значэнні гэтага слова, а быццам "утатуіравана" ў памяць. А памяць прымае далёка не ўсё — толькі тое, што значна, сутнасна. І тое сутнаснае часта выглядае беднавата ў параўнанні з напісаным. Але яно сутнаснае! Напісанае хутка забываецца, а сутнаснае, пры ўсёй яго магчымай беднаце і сціпласці, можа на стагоддзі пасяліцца ў нацыянальнай культуры. Так што я не пішу — я намагаюся пачуць. У гэтым сэнсе цяперашні агульнапрыняты падзел на кампазітараў і выканаўцаў прынцыпова няслушны. Кампазітар і ёсць насамрэч выканаўца таго музычнага тэксту, які ён уловіць, прабіраючыся з цемры сваёй падсвядомасці да святла.

Пра музыку і слова: навошта крычаць?

— Музыка і слова спрадвек былі чымсьці адзіным, еднасным. Невыпадкова ў пэўныя часы ў Кітаі вакальныя творы называлі "матывам" на той ці іншы верш. Дый у музычным сінтаксісе многія азначэнні пазычаны з літаратурнай мовы: сказ, фраза. Але ў XX стагоддзі з'явіліся новыя магчымасці прачытаць вершы: не толькі "з трыбуны", уголас, але і sotto voce — не проста "ўпаўголас", але ў пэўным тэмбры, дыяпазоне. І праспяваць гэтак жа! Вакалісты ж звычайна любяць "крычаць" — быццам баяцца, што іначай ім скажуць: маўляў, няма голасу. А можна ж іначай! Філарманічныя спевы я называю філарманічнай хлуснёй. Ці можна гэтак "крычаць" тыя ж песні Шуберта? У свой час яны спяваліся проста ў пакоі — гэта было хатняе музіцыраванне.

З вакальнымі творамі звязана яшчэ адна праблема — мелодыі. Мелодыя — самае каштоўнае ў музыцы. Але і штосьці самае "неабароненае", на першы погляд, нават кволае: яе звычайна не адразу ўлоўліваюць, калі яна з'яўляецца. Але ж яна аказваецца і самай жывучай! Бо калі ты вяртаешся да таго ж тэксту, яна адразу выяўляецца, усплывае ў памяці. Таму актуалізацыя гэткіх "ціхіх спеваў" заключаецца ў наступным: у вакальным творы словы і музыка павінны зліцца ў адну непаўторную інтанацыю, якую не зблытаеш, запомніш. І мне захацелася напісаць "Ціхія песні"…

Слухаючы Валянціна Сільвестрава і згадваючы папраўдзе срэбраныя гукі многіх яго "ціхіх" твораў, я раптам падумала, што ўсё гэта — яшчэ і музычнае ўвасабленне ягонага прозвішча. Ну, а калі ўжо столькі "срэбра", дык і выказванні кампазітара будуць адпаведнымі — не менш як залатымі.

Вядома, што вельмі часта месца, дзе размяшчаецца музей, становіцца вызначальным для яго поспеху ў наведвальнікаў. І ў прынцыпе вызначальным. Але нават самая багатая калекцыя артэфактаў можа згінуць у невядомасці за пяць хвілінаў хады ад насычанай турыстычнай магістралі, калі не будзе канцэптуальна афармлена і прадстаўлена ў адпаведным выглядзе. Далей пойдзе аповед аб некалькіх еўрапейскіх музеях, якія пашчасціла наведаць аўтару на працягу аднаго кароткага падарожжа. Падчас яго яшчэ раз пераканаўся: паспяховы музей не можа грунтавацца толькі на экспазіцыі. Часам і яна толькі дадатак да асноўнай ідэі, дзеля якой музей ствараецца і існуе.

Антон СІДАРЭНКА

"Луізіяна". Прырода + Modern Art

Музей сучаснага мастацтва "Луізіяна" размяшчаецца ў 20 кіламетрах ад Капенгагена і ў кіламетрах дзесяці ад адной з галоўных перлін дацкага турыстычнага раю — замка Кронбарг у горадзе Хельсінгёр — менавіта таго, які паслужыў мадэллю шэкспіраўскага Эльсінора.

Турысты, якія падарожнічаюць па спецыяльным адзіным праязным па так званым Арасунскім коле (транспартнай сістэме, якая ўключае ў сябе дацкі Капенгаген, шведскі Мальмё, праслаўлены ў аднайменным серыяле мост паміж гэтымі двума гарадамі, паромную пераправу паміж шведскім Хельсінборгам і дацкім Хельсінгёрам, а таксама чыгунку паміж усімі гэтымі пунктамі), могуць выйсці на адпаведным прыпынку на некалькі гадзін і агледзець надзвычай цікавы музей. Цацачны па беларускіх мерках цягнік спыняецца на маленькай станцыі, і праз некалькі хвілін і колькі сотняў метраў сардэчна запрашаем у "Луізіяну"!

Кошт квітка па мясцовых, скандынаўскіх, стандартах зусім не пужае: 115 дацкіх крон ці прыблізна 35 новых беларускіх рублёў і 50 капеек. Калекцыя "Луізіяны" найбагацейшая — уражваюць падборкі скульптуры Альберта Джакамеці, жывапісу Асгера Ёрна, інсталяцый Яёі Кусамы, часовыя і пастаянныя экспазіцыі сусветнага выяўленчага мастацтва з 1945 года да нашых дзён. Хоць ёсць больш ранніх твораў, як, напрыклад, працы Васіля Кандзінскага і Пабла Пікаса — мастакоў, якія вельмі сур'ёзна паўплывалі на сучаснае мастацтва. Галоўная каштоўнасць "Луізіяны" не толькі ў яе разнастайнасці — музей складаецца з цэлага шэрагу выставачных прастор, у тым ліку пад адкрытым небам — але ў якасным падборы экспанатаў. Сучаснае мастацтва прадстаўлена тут у канцэнтраваным выглядзе — адсутнасць прахадных прац практычна не дае магчымасці для звычайных для падобных сходаў ваганняў у духу "А ці мастацтва гэта?.."

Аўтару гэтых радкоў пашчасціла трапіць у "Луізіяну" ў момант правядзення вялікай выставы, прысвечанай развіццю ап-арта. Аптычнае мастацтва — цікавы адрэзак развіцця мастацкай думкі. У дацкім музеі ў спецыяльна адведзеным павільёне прадстаўлены арыгіналы твораў 1950 — 1960-х — асноўнага часу развіцця ап-арта ў свеце. Кожны экспанат суправаджаўся яшчэ і найпадрабязным апісаннем і расповедам пра аўтара. Улічваючы, што творы ап-арта самі па сабе вельмі незвычайныя для вока, то пасля агляду выставы пастаянную

Фотафакт

Аляксандр Ульяновіч (злева) прымае віншаванні.

У зале Перамогі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны адбылося ўрачыстае ўшанаванне ветэрана вайны і працы Аляксандра Ульяновіча да яго 95-годдзя. Пра гэтага гвардыі старшыню, які пакінуў аўтограф на сценах зрынутага рэйхстага, нядаўна распавяла газета.

Міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс Святлоў ў прывітальным слове адзначыў, што 95-годдзе Аляксандра Іосіфавіча — гэта не толькі дзень нараджэння заслужанага чалавека, франтавіка і патрыёта. Асабліва важная гэта падзея напярэдадні Дня работнікаў культуры. Балазе ў 1980 — 1990 гадах Ульяновіч працаваў першым намеснікам міністра культуры БССР, больш за 10 гадоў узначальваў Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Сардэчным, сярод іншых, было віншаванне імяніннікa супрацоўнікамі музея. "Мы ўдзячныя Вам за вялікі асабісты ўклад у прапаганду баявой гісторыі нашай Айчыны і ганарымся тым, што вы з'яўляецеся надзейным настаўнікам і вялікім сябрам музея. Заўсёды рады бачыць Вас!" — такімі словамі прывітаў Ульяновіча дырэктар установы Дзмітрый Шляхцін. Ён перадаў юбіляру, сярод іншага, некалькі асобнікаў газеты "Культура" з матэрыялам "І яго аўтограф на рэйхстагу". Юбіляру быў таксама ўручаны партрэт, напісаны мастаком музея Юрыем Герасімовічам. Падарункам ветэрану стала беларуская народная песня ў выкананні навуковага супрацоўніка музея Алены Дварэцкай, якая выступіла ў нацыянальным строі.

Аляксандр Іосіфавіч цёпла падзякаваў прысутным за сардэчныя словы, выказаныя ў яго адрас, і пажадаў усім творчых поспехаў у высакароднай справе патрыятычнага выхавання грамадзян Беларусі.

Мікалай ШАЎЧЭНКА,
член Беларускага саюза журналістаў

Дзе музей вы размясціце, так музей і зажыве

Тонкасці маркетынгавых стратэгій замежнай культуры

экспазіцыю фактычна прабягаеш. І амаль з палёгкай выходзіш на вольнае паветра — тэрыторыя "Луізіяны" ўяўляе з сябе выдатны сад з лужкамі, тэрасамі, адкрытае кафэ з шыкоўным выглядам на праліў Зунд і шведскі бераг.

Дарэчы, кафэ "Луізіяны" карыстаецца не меншай папулярнасцю, чым яе выставачныя прасторы. На кантрасце з мастацтвам другой паловы XX стагоддзя, якое дэманстратыўна парвала з гармоніяй, прыгажосцю, а ў некаторых месцах нават са здаровым сэнсам, сціплая скандынаўская прырода, няхай з няўстойлівым, пераменлівым надвор'ем, выклікае неверагодна прыемныя эмоцыі. У кафэ тут пакідаеш больш грошай, чым заплаціў за ўваходны квіток, але традыцыйны скандынаўскі перапынак на каву таксама частка атракцыёна. У "Луізіяне" як ні ў якім іншым музеі сучаснага мастацтва заўважаеш, што гэтыя ўстановы даўно сталі ў Еўропе наймодным спосабам правесці вольны дзень або частку турыстычнай паездкі. Але, напэўна, менавіта ў дацкіх музейшчыкаў атрымалася бліжэй за ўсё падысці да галоўнай мэты заснавальнікаў падобных устаноў — зрабіць contemporary art найважнейшым з мастацтваў.

Унутраны двор "Тэрор-Хаза".

Галерэя — твор ап-арту ў экспазіцыі дацкай "Луізіяны".

Інтэр'ёры "Будэнброк-хаўса" выкарыстоўваюцца для кіназдымак.

"Брыль" музея-мемарыяла ў цэнтры Будапешта.

Дом, дзе сканчаецца жах

Калі дацкая "Луізіяна" распавядае пра сучаснае мастацтва, то будапешцкі музей "Дом тэрору" — сам з'яўляецца прадметам contemporary art. Ён не тое каб не згубіўся на фоне музеяў і памятных месцаў адной з самых бліскучых еўрапейскіх сталіц, але і з'яўляецца адной з самых вядомых яе славутасцяў. Хоць быў адкрыты адносна нядаўна — у 2002 годзе. Музей размяшчаецца ў бліскучым помніку архітэктуры пачатку мінулага стагоддзя ў сярэдзіне праспекта Андрашы — адной з галоўных турыстычных магістраляў Пешта. Сярод суседніх трохпавярховых будынкаў ён вылучаецца сваім адмысловым "брылём", у якім асаблівым чынам прарэзана яго назва, а таксама пяціканцовая зорка і знак перакрыжаваных стрэл — сімвалы рэжымаў, якія пакінулі найбольш крывавы след у венгерскай гісторыі XX стагоддзя.

Твор Альберта Джакамеці ў адным з найпрыгажэйшых залаў "Луізіяны".

Кампазіцыя "Жалезная заслона" перад уваходам у будапешцкі музей.

"Дом тэрору" — не столькі музей, колькі мемарыял ахвярам двух таталітарных рэжымаў — нацысцкага і камуністычнага. У доме № 60 па праспекце Андрашы з канца трыццатых па 1945 год знаходзілася штаб-кватэра венгерскіх нацыстаў, а затым, да 1956 года — штаб-кватэра венгерскай службы дзяржаўнай бяспекі.

Ад знакамітых "музеяў акупацыі" ў сталіцах краін Балтыі "Дом тэрору" адрозніваецца менавіта мемарыяльны характар. Фактычна, гэта вялікі помнік усім ахвярам. Пабудаваны ў самым пачатку XX стагоддзя вядомым прадпрымальнікам у момант найвышэйшага росквіту венгерскай сталіцы, будынак цяпер пераўтвораны ў анфіладу залаў, афармленых па тэматычным прынцыпе. Кожная з іх асвятляе нейкую тэму ці падзею — ад несправядлівага, на думку венграў, падзелу краіны па дамове 1919 года да падаўлення антысавецкага паўстання ў 1956-м. Сімвалам апошняга выступае сапраўдны танк "Т-55" у закрытым двары-калодзежы са шкляной столлю.

Прыкметна, што "Дом тэрору" афармлялі не толькі гісторыкі, але ў першую чаргу мастакі. Кожнае памяшканне ўяўляе з сябе адзіную прастору-інсталяцыю, дзе гавораць нават не экспанаты, а самі сцены. Экспанатаў у "Доме тэрору" не так і шмат. Асноўны ўпор — на мультымедыйныя сродкі, у тым ліку інтэрактыўныя. Па канцэпцыі музей нагадвае берлінскую Сінематэку. Прынцып, які выкарыстаны ў абодвух установах — як мага глыбей занурыць наведвальніка ў гістарычную атмасферу. Напрыклад, у зале, якая прысвечана нацысцкай арганізацыі "Скрыжаваныя стрэлы", моцнае ўражанне ствараюць маўклівыя манекены ў адпаведнай уніформе. У зале, прысвечанай пасляваеннай індустрыялізацыі, усе сцены і прадметы зробленыя з алюмінію — галоўнага гонару сацыялістычнай эканомікі Венгрыі пачатку пяцідзясятых.

Самае моцнае ўражанне стварае ліфт, куды служыцель запускае каля дзясятка наведвальнікаў на верхнім паверсе. Дзверы зачыняюцца, згасае падсвятленне, а на сцяне загараецца манітор, на якім чорна-белая здымка кінахронікі васьмідзясятых — ахвяры катаванняў у сутарэннях дзяржбяспекі распавядаюць пра перанесеныя здзекі, а ліфт павольна апускаецца менавіта туды, у гэты склеп, знешні выгляд якога, з няроўнымі бетоннымі сценамі і вузкімі, ледзянымі боксамі, не змяніўся за шэсць дзесяцігоддзяў. Нягледзячы на тое, што сцены ліфта празрыстыя, узнікае моцная клаўстрафобія і жаданне выйсці на свежае паветра.

Канцэпцыя "Тэрор-Хаза" блізкая да канцэпцыі сучаснага мастацтва — арт не можа існаваць па-за кантэкстам. Больш за тое, у гэтым музеі наведвальнік не проста разглядае экспанаты, а трапляе ўнутр і сам становіцца адным з іх. Таму, калі пакідаеш "Дом тэрору", выдыхаеш з палёгкай — не толькі таму, што апынуўся на адной з самых прыгожых вуліц Еўропы, але і таму, што ўбачанае засталося ў мінулым. Па меншай меры, хочацца на гэта спадзявацца.

Дом, дзе жывуць Будэнброкі

Усе пісьменніцкія музеі падобныя адзін да другога. З музеямі кніг і літаратурных герояў куды цікавей. Усім вядомы, нават тым, хто там ніколі не быў, музей Шэрлака Холмса на лонданскай Бэйкер-стрыт. Велізарную колькасць наведвальнікаў прыцягвае музей дзіцячай казкі "Юнібакен" на Музейным востраве ў цэнтры шведскай сталіцы. Пра ўнікальны стамбульскі "Музей нявіннасці", цалкам прысвечаны раманам Архана Памука, "К" пісала ў адным з нядаўніх нумароў. З музеем "Будэнброк-хаўс" у паўночнанямецкім Любеку складаней. Ён адначасова і музей пісьменніка, і яго самага вядомага літаратурнага твора.

Апроч свайго грандыёзнага гістарычнага мінулага (горад быў сталіцай знакамітага Ганзейскага саюза, з якім у Сярэднявеччы актыўна гандляваў і наш Полацк), Любек ганарыцца сваімі нобелеўскімі лаўрэатамі. Менавіта ў Любеку пражыў другую палову жыцця і напісаў свае найважнейшыя творы Гюнтар Грас. Тут таксама нарадзіўся палітык, лаўрэат Нобелеўскай прэміі міру 1971 года, Вілі Брант, які шмат у чым вызначыў палітыку Германіі і Еўропы другой паловы XX стагоддзя.

У доме, які размешчаны каля знакамітай царквы Марыенкірхе, жыла бабуля будучага нобелеўскага лаўрэата Томаса Мана. Пісьменнік часта бываў там дзіцем і вельмі любіў атмасферу старога жытла вядомага роду ганзейскіх купцоў Манаў. Менавіта таму пісьменнік пасяліў тут тры пакаленні сваіх герояў Будэнброкаў.

Першапачаткова "Будэнброк-хаўс" (ці "хус" на ніжненямецкім дыялекце, які распаўсюджаны ў зямлі Шлезвіг-Гальштэйн) быў пабудаваны ў 1758 годзе першым пакаленнем гандляроў збожжам, якое потым дало свету адразу трох знакамітых пісьменнікаў. У сакавіку 1942 года Любек пацярпеў ад жорсткай бамбардзіроўкі, і "Будэнброк-хаўс" быў амаль цалкам знішчаны — ад будынка застаўся толькі фасад. Пасля вайны ўвесь стары горад аказаўся зруйнаваны, адноўлены "Будэнброк-хаўс" быў толькі праз некалькі дзесяцігоддзяў спярша як рэстаран. Зусім нядаўна да гістарычнага фасаду прыбудавалі новы корпус, і цяпер гэта двайны музей — рамана "Будэнброкі" і літаратурнай дынастыі Манаў.

Стваральнікі музея, зразумела, пастараліся стварыць у ім адпаведную атмасферу. Але будынак знутры выглядае ўсё роўна абсалютна новым. Шмат у чым таму, што спраектаваны па цалкам сучасным музейным праекце, што прадугледжвае і краму з фірмовымі сувенірамі на першым паверсе, і шырокія лесвіцы, і ліфт, і прасторны архіўсховішча. Пад часы дзяцінства Мана і Будэнброкаў афармлена толькі некалькі памяшканняў на другім паверсе. Яны ўяўляюць з сябе акуратную рэканструкцыю таго, як магло выглядаць жыллё багатай купецкай сям'і другой паловы XIX стагоддзя. Менавіта ў гэтых інтэр'ерах некалькі гадоў таму здымалася чарговая тэлевізійная версія рамана.

Як усе сучасныя музеі, "Будэнброк-хаўс" робіць стаўку на інтэрактыўнасць. Наведвальнікі могуць пачуць фрагменты аўдыязапісаў выступленняў розных членаў сям'і Манаў з дапамогай слухавак, ураскаручна прагартаць дакументы з архіва Манаў на стэндзе ў выглядзе картатэкі. Фатаграфіі, фрагменты кінахронікі — усё даступна і з вялікім стараннем афармлена ў стылістыцы часоў, пра якія ідзе гаворка ў музеі. Зразумела, англамоўны наведвальнік пачуваецца ў музеі цалкам камфортна — усе таблічкі, тлумачэнні і інтэрактыўныя элементы дубляваныя на мову міжнародных зносін.

Пры ўсім вонкавым бляску і парадку ад "Будэнброк-хаўса" застаецца ўражанне толькі што пабудаваных дэкарацый. Выгляд з заднягa акна гэтае ўражанне толькі ўзмацняе — за гістарычнымі фасадамі старога Любека на ўсю моц ідзе поўнамаштабнае будаўніцтва ці то новага гандлёвага цэнтра, ці то паркінга. Што зрабіць, горад да гэтага часу не залячыў свае ваенныя раны і пастаянна перабудоўвае тое, што было спехам збудавана ў пасляваенны перыяд на пабітых бамбардзіроўкай месцах.

Міжволі прыгадваецца іншы дом-музей Томаса Мана — у літоўскай Нідзе, дзе пісьменнік правёў тры важных для сябе лета ў самым пачатку трыццатых і напісаў раман "Іосіф і яго браты". Калекцыя літоўскага музея, які размясціўся ў самым прыгожым месцы Куршскай касы, вядома, куда больш сціплая. Але пакідае значна больш моцнае ўражанне. Магчыма, нават не з-за таго, што лецішча пісьменніка ацалела ў першапачатковым выглядзе, а ад таго, з якім намаганнем літоўцы захоўваюць памяць аб "сваім" Мане.

Тым не менш, "Будэнброк-хаўс" застаецца адным з самых незвычайных літаратурных музеяў Еўропы, і наведвальнікі ідуць бясконцым патокам, выносячы з яго яркія ўражанні, а таксама магніцікі з выявай сямейства Манаў. Напэўна, галоўнае ў "Будэнброк-хаўс" — магія месца, у якім ён размешчаны. Як у прынцыпе, і ў кожным з трох згаданых музеяў.

Але не, не толькі месца вызначае музей...

К

Георгій Паплаўскі. / Фота Таццяны МАТУСЕВІЧ

“Нельга кветку прыраўноўваць да пустазелля...”

(Заканчэнне. Пачатак на старонцы 1.)

Але з 4-га курса мяне мабілізавалі па пазачарговым прызыве студэнтаў у армію, дзе я пачаў служыць пры штабе Беларускай ваеннай акругі. Праўда, потым прыязна далі магчымасць абараніць дыпломную карціну “Палявая пошта”. Да гэтага часу я быў ужо жанаты з маёй аднакурсніцай Наташай і меў маленькую дачку Кацярыну. Вярнуўся ў часць і яшчэ некалькі месяцаў аддаваў ганаровы воінскі абавязак радзіме. Адразу пасля “дэмбеля” паступіў у БДТМІ на жывапіснае аддзяленне ў майстэрню Віталя Цвіркі. У 1961-м абараніў на “выдатна” дыпломную жывапісную карціну “Клятва”, і пусціўся ў вольнае плаванне. Трэба было нейкім чынам зарабляць грошы, каб карміць сям’ю. А яшчэ да паступлення ў ВНУ мае малюнкі, зробленыя ў арміі, пабачыў галоўны мастак выдавецтва “Беларусь” Мікалай Гуціеў. Яны спадабаліся, і тут жа мне прапанавалі зрабіць ілюстрацыі да рамана Джэка Лондана “Смок Бэлью”, улюбёнага пісьменніка нашай маладосці. І пасля гэтага ў мяне з’явілася шмат замоваў і ў выдавецтвах, і ў рэспубліканскіх часопісах. Стаў удзельнічаць у рэспубліканскіх і ўсесаюзных выставах у галіне кніжнага афармлення, хутка мяне прынялі (без праходжання кандыдацкага стажу) у члены Саюза мастакоў БССР і нават выбралі там старшынёй секцыі графікі. І мяне ў Беларусі сталі больш успрымаць як графіка: так склалася, што творчыя дамовы на жывапісныя палотны заключала са мной Масква, а на графічныя цыклы — Беларусь. Урэшце, я быў па натуры вандроўнікам, і ў маіх далейшых шматгадовых паездках па свеце графіка (малюнкі, хуткія накіды, альбомныя замалёўкі) як нельга лепш адпавядала характару прафесіі рысавальшчыка. Хаця станковы жывапіс я ніколі не пакідаў. І зараз мне цяжка сказаць, што я больш люблю: эстамп, жывапіс, акварэль ці кніжную ілюстрацыю.

Пра Палессе

— Маю першую вандроўку на Палессе ў 1963-м, а потым яшчэ праз два гады, мне не забыць. Уражанні ад гэтага краю надоўга ўвайшлі ў маю прафесійную дзейнасць матэрыялам і разуменнем “нацыянальнага” не па чужых фатаграфіях і апісаннях, а па ўласным, непасрэдным успрыманні праз прызму эмацыйнай памяці. Якраз тады мая жонка Наталля рыхтавала ў інстытуце дыплом — кніжнае афармленне рамана Івана Мележа “Людзі на балоце”. Дарэчы, сам Мележ хацеў, каб менавіта Наташа зрабіла ілюстрацыі да першага выдання гэтай кнігі. Дык вось, каб сабраць уласны матэрыял, так бы мовіць, з першакрыніцы, каб пабачыць мележаўскіх герояў і іхні свет у натуральным выглядзе, мы вырашылі скіравацца на Палессе. За дзве вандроўкі мы ўтрох (я, Наташа і Віктар Ральцэвіч, наш сябра — таксама нядаўні выпускнік інстытута) абышлі і аб’ехалі гарады, мястэчкі і вёскі Мазыр, Тураў, Давыд-Гарадок, Тонеж, Бухча, а таксама палескі Дзяржынск. Было ўсё: глухмень, пяскі, балоты, бездарожжа… Аднойчы нас падабраў цяжкі ўсюдыход — тралёвачны “КрАЗ”: 70 кіламетраў мы ехалі сем гадзін, таму што ён заўсёды вязнуў. Даводзілася дабірацца ў патрэбны пункт нават на адзінаццацімесным самалёце, які, трапляючы ў паветраныя ямы, не спрыяў добраму настрою. А часцей мы рухаліся то пехам, то на спадарожных калёсах і дапатопных калгасных грузавічках. Тым не менш вось тады мы і ўбачылі сапраўдную старажытную Беларусь! Там у 1960-я яшчэ захаваліся і лучына, і дзіцячыя скураныя калыскі і ўнікальныя ступы драўляныя, нажныя: цэлая сістэма рычагоў. Уразілі старыя хаты з разнымі франтонамі, з сімвалам сонца, саламянымі дахамі, якія як капелюшы прыкрывалі несамавітыя вакенцы. А яшчэ клеці з шапкай тоўстай саломы, з нізкімі з бярвення сцянамі з прораззю для святла. Усё было па справе, рацыянальна і маляўніча, сапраўдная эстэтыка архітэктурнага аблічча, выбудаванага стагоддзямі. Ужо не кажу пра казачныя інтэр’еры вясковых дамкоў, пра нашы сустрэчы з мясцовымі жыхарамі, пра іх святы і песні, пра касцюмы і ручнікі з плеценымі карункамі, пра іконы і дзівосны арнамент. Гэта асобная тэма… Так, скажу, што Ігар Лучанок з Валодзем Мулявіным і іх сябрамі прыязджалі ў гэты край ужо пасля нас. І калі мы потым збіраліся з “Песнярамі” ў маёй майстэрні, нам было што згадаць…

Той першы палескі перыяд даў мне як мастаку вельмі многа. Калі я звяртаўся да беларускай тэмы, ніколі не гартаў чужыя фаліянты, а проста адкрываў свае падарожныя альбомы, свае “запісныя кніжкі” пачатку 1960-х. Таму што там — каштоўныя залежы! Яны дапамаглі мне стварыць і серыю разных гравюр “Казкі і легенды Палесся”, і праілюстраваць кнігу Якуба Коласа “Новая зямля”, за якую я атрымаў дыплом “Самая цудоўная кніга свету” на Міжнародным конкурсе ў Лейпцыгу ў 1968 годзе, і дыплом першай ступені на Усесаюзным конкурсе на лепшыя выданні Камітэта па справах друку СССР.

Пра Браслаўшчыну і Кацярыну Фурцаву

— Так, пабачыў я шмат краёў на свеце, але лепш за Браслаўшчыну — не знайсці... Аднак нічога дзіўнага: Браслаўшчына ёсць Браслаўшчына. Шмат гадоў я аддаў гэтаму дзівоснаму куточку беларускай зямлі. Яшчэ ў сярэдзіне 1970-х з жонкай набылі менавіта там, побач з вёскай Маскавічы, на хутарку Рацюні старэнькі драўляны дамок. І наша сям’я туды стала наведвалася. Іншым разам выпраўляўся адзін — і ранняй вясной, і ўлюбёнай восенню. Тут я неяк асабліва ўспрымаў роднасць зямлі і чалавека: высокае неба, шоргат чароту, ядловец з рэурэшткамі моцнага хвойніка, неўтаймоўныя хвалі спелага жыта, ільну, люцэрны на ўзгорках, маляўнічае старадаўняе капішча на Замкавай гары, узнёслыя і поўныя пачуцця ўласнай годнасці аблічы рыбакоў... Тут, на Браслаўшчыне, мне працавалася заўсёды лёгка і вольна. Колькі за гэтыя гады зроблена работ у эстампе, малюнку, жывапісе, акварэлі пра гэты край, я і сам дакладна не падлічваў! І самае галоўнае, што ніводзін пейзаж, партрэт, нацюрморт не зроблены “мімаходзь”, з халодным сэрцам...

Раскажу, дарэчы, пра даволі цікавы лёс маёй карціны “Браслаўскія калгасніцы”. Яе я напісаў у 1970 годзе цалкам на натурным матэрыяле, набіраным на Браслаўшчыне. Я хацеў паказаць працэс уборкі льну ў манументальна-паэтычным цэласным вобразе. Паказаць радасныя бакі працы, падкрэсліць цудоўнымі рытмамі зладжанасць калектыўнага дзейства, эмацыйную атмасферу адзінства душэўнага, унутранага стану, адчування захаплення і паўнаты жыцця персанажаў. А год стварэння карціны якраз трапіў на святкаванне стогадовага юбілею Леніна. І тут пачалося… Высокія чыноўнікі ад культуры раптам прыйшлі ў абурэнне: як гэта савецкія калгасніцы — і босыя! Што, ім у нашай сацыялістычнай краіне няма чаго абуць на ногі? Словам, агіднасць з боку мастака — ды яшчэ ў такі юбілей нашага правадыра… І вось палатно трапіла ў маскоўскі Манеж, напярэдадні вернісажу Усесаюзнай выставы ў гонар Леніна. Сабраўся выстаўкам з удзелам прадстаўнікоў усіх рэспублік, кіраўніцтва Саюза мастакоў СССР і міністра культуры СССР Кацярыны Фурцавай. Мая работа большасцю галасоў праходзіць для экспазіцыі, але раптам просіць слова адзін з кіраўнікоў Міністэрства культуры БССР, які прыехаў у Маскву, каб паглядзець, як творы беларускіх мастакоў будуць выглядаць на ўсесаюзнай арэне дасягненняў савецкага выяўленчага мастацтва. “Ёсць меркаванне дырэктыўных органаў Беларусі, што карціну Паплаўскага нельга выстаўляць”. — “Чаму? — спытала Фурцава. — Аўтар пад следствам ці што?” — “Не, тут усё нармальна, але гэта меркаванне ЦК КПБ…” — прамямліў чыноўнік і развёў рукамі. “Не ведаю, не ведаю, але мне карціна Георгія Георгіевіча вельмі падабаецца, такая беларуская, цёплая, зялёненькая…” — запярэчыла міністр. І для поўнай аб’ектыўнасці папрасіла выстаўкам перагаласаваць. Гэтым разам не проста большасць, а ўсе як адзін эксперты былі аднагалоснымі: работу прынялі на выставу…

Падобныя выпадкі здараліся і з іншымі маімі творамі. Аднойчы прычапіліся да ілюстрацыі да аповесці “Воўчая зграя” Васіля Быкава, дзе я паказаў партызана ездавога Грыбаеда босым пасля таго, як ён разам з Леўчуком выпаўз з балота! Гэты аркуш знялі з экспазіцыі, і мне “парэкамендавалі” замест яго памясціць даўні афорт, меца-цінта “Жняя” да паэмы Аркадзя Куляшова “Далёка да акіяна”: там мая гераіня с сярпом, снапом і ў лапцях: аказалася — у лапцях можна, так бы мовіць, у якасці характэрнай нацыянальнай прыкметы… Другі раз я зрабіў нацюрморт: пачаткі сухой кукурузы паклаў пад збан, які абвязаў простай чырвонай хусткай. А “экспертам” падалося, што я спецыяльна абвязаў збан нібыта чырвоным піянерскім гальштукам, намякаючы, маўляў, на глупства тагачаснага лідара краіны Хрушчова-“кукурузніка”! І наконт гэтага цягалі мяне (не паверыце!) “на дыван” у аддзел культуры ЦК КПБ! Хіба ж не абсурд? Праўда, Алена Васільеўна Аладава потым здолела набыць нацюрморт у музей, дзе ён і сёння знаходзіцца. Ды што далёка хадзіць? Яшчэ на пачатку 1960-х зрабіў серыю эстампаў і жывапісных эцюдаў “Паўночны Казахстан”, у якой паказаў суровы быт і цяжкую справу цаліннікаў: бензавозы ідуць па сцяпным бездарожжы пад нізкім небам, рабочы прагна п’е з шапкі ваду з ручая, стомлены хлебароб пасля працоўнага дня... Атрымаліся непарадныя творы, якія зусім не супадалі з газетнымі і часопіснымі апісаннямі падзей на цаліне. Мяне папракалі, маўляў, чаму не намаляваў боханы і квітнеючыя нівы, прыгожых камбайнёраў і трактарыстаў у нармальных незабруджаных камбінезонах? А я проста хацеў перадаць рэальны стан зямлі, выпаленай сонцам, цяжкую штодзённасць, сапраўдных мужных людзей без усялякай лакіроўкі і сюсюкання. Яны ж па-сапраўднаму здзяйснялі подзвігі ў суровых рэаліях!

Як Салжаніцын ледзь не пагубіў мастака

— Гэта дзіўная справа адбылася ў 1986 годзе. Годам раней мяне вылучылі на саісканне Дзяржаўнай прэміі СССР за ілюстрацыі да твораў Васіля Быкава і цыкл каляровых літаграфій “Час доўгіх нажоў”. Канкурэнцыя была вельмі жорсткай; на тры прэміі прэтэндавала больш за 40 чалавек. Потым у выніку паступовага адсейвання ў фінале засталося тры прэтэндэнты: першым ішоў я, за мной — армянскі жывапісец Акоп Акапян і расійскі скульптар Васіль Стамаў. Словам, практычна прэмію можна было “абмываць”. Чакаў толькі інфармацыю ў цэнтральнай прэсе. А ў гэты час у Аўстрыі рыхтаваўся Тыдзень савецкай культуры, і мяне паслалі ў Вену зрабіць з гэтай нагоды персанальную выставу. На месцы перакладчыца ветліва прапанавала мне пачытать на рускай мове кнігу эмігранта Аляксандра Салжаніцына “У жніўні чатырнаццатага”. Чытаць не было часу, і мне параілі ўзяць яе з сабой. Разам з альбомам Сальвадора Далі і шыкоўным календаром, на вокладцы якога красавалася купальшчыца-ню, паклаў у чамадан і — у аэрапорт, каб прайсці там так званым “зялёным калідорам”, дзе дасмотр рэчаў не прадугледжваўся для афіцыйных асоб, якой на той момант аказаўся я. Аднак у маскоўскім аэрапорце “Шарамецьева” мытнікі-пагранічнікі нечакана для мяне, дазнаўшыся, што я — менавіта Паплаўскі, правялі руплівы дагляд маіх рэчаў і, зразумела, канфіскавалі “антысавецкую” кнігу, каляндар з быццам бы парнаграфіяй (потым “эксперты” прызналі, што гэта проста эротыка) і альбом Далі (пазней два апошнія выданні мне вярнулі). Так я аказаўся ледзь не “ворагам народа”. Зразумела, інфармавалі Саюз мастакоў СССР і ўсё закруцілася-завярцелася па класічных законах дэтэктыўнага жанру. І калі з’явілася газета “Известия” са спісам лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі СССР, маё імя там ужо адсутнічала. А ў гэты час маю справу пачалі разбіраць і на партсходзе ў Саюзе мастакоў БССР. Амаль усе мастакі-камуністы ў маю адсутнасць (я кіраваў тады групай маладых графікаў на Сенежы) прагаласавалі за выключэнне мяне з партыі. Але ў райкаме КПБ палічылі, што той сход не меў права без маёй асабістай прысутнасці вырашаць такія пытанні і адпаведны пратакол не зацвердзілі. Што казаць, пералажыў вышэй галавы, асабліва мяне засмуцілі заявы, выступленні і лісты ў ЦК маіх учарашніх калег, якія абвінавачвалі мяне ў “антысаветчыне”, што я, камуніст, аказаўся чалавекам “з двайным дном”, што я асмеліўся прывезці з “тлятворнага Захаду кнігу манархіста Салжаніцына” і тым самым згубіў “палітычную пільнасць”. І таму падобнае. Канешне, тут жа вывелі мяне са складу праўлення Саюза мастакоў і экспертнай камісіі. Але мяне гэта не вельмі хвалявала: у той час я быў ужо і заслужаным дзеячам мастацтваў, меў і прэмію камсамола Беларусі, і прэмію імя Джавахарлала Неру, і ордэн Дружбы народаў, і шмат іншых узнагарод. А хутка быў выбраны членам-карэспандэнтам Акадэміі мастацтваў СССР. Карацей, пасля доўгіх арганізацыйна-партыйных перыпетый райкам партыі зрабіў мне “заўвагу” без занясення ў асабістую справу. А праз нейкі час я добраахвотна выйшаў з партыі: напісаў адпаведную заяву з абгрунтаваннем майго ўчынку і разам з партбілетам занёс у прыёмную ЦК КПБ. Ведаеце, доўгі час, будучы членам партыі, я жыў, як усе. Ці верыў у ідэалы камунізму? У некаторыя верыў, у іншыя — не, бо столькі пабачыў усяго ў час маіх творчых падарожжаў па краіне — ад маёй Беларусі да Крайняй Поўначы і Далёкага Усходу, не кажучы пра замежныя краіны, што давялося міжволі заняцца самааналізам маіх узаемаадносін з людзьмі, з грамадствам, з камуністычнай ідэалогіяй у цэлым, з крывадушшам улады, асабліва ў прасторы духоўнай культуры. Тым не менш усё сваё творчае жыццё я імкнуўся рабіць тое, што хацеў, і як чалавек па натуры яршысты вельмі рэдка ішоў на кампрамісы. Што казаць, усемагутная партыя пазбягала праўды, замяняючы яе лакіроўкай, і ў выніку гэта згубіла камуністычную ідэалогію. Імкненне “запрещать и не пущать”, кантраляваць усе гуманітарныя працэсы, любымі сродкамі прыпыніць рух мыслення прывялі да таго, што значная частка інтэлігенцыі стала ўспрымаць уладу як душыцеля свабод і здаровага сэнсу. Вось і я на сабе спазнаў выхаваўчую сілу партыі.

У той жа час, мы, творцы, шмат чаго страцілі добрага з таго савецкага часу (творчыя дагаворы па лініі Мінкультуры і Саюза мастакоў СССР і БССР, годныя закупкі з выстаў, зніклі грамадскія абмеркаванні выставак, практычна знікла мастацкая крытыка, дзяржаўныя заказы на буйныя экстэр’ерныя і інтэр’ерныя творы сталі рэдкімі). Словам, мы, мастакі, сёння ператварыліся фактычна ў дармаедаў у дзяржавы. Некалькі гадоў таму адзін з нашых высокіх чыноўнікаў ад культуры наведаў творчыя майстэрні пры Міністэрстве культуры, дзе я арганізаваў выставу сваіх вучняў за дваццаць пяць гадоў майго кіраўніцтва графічнай майстэрняй. Ён паглядзеў яе і іранічна сказаў: “Не разумею, чым вы тут займаліся столькі гадоў?” Я адказаў: “Творчасцю…” Той: “Творчасць — гэта тавар. Тавар трэба рэалізоўваць, а грошы вяртаць у дзяржбюджэт…” І гэта прытым, што студэнты атрымлівалі за вучобу капейкі… Вось так адрэагаваў на мастацтва маладых здольных графікаў гэты чыноўнік, дарэчы, высока адукаваны…

Пра сучасны art

— Як я стаўлюся да сучаснага мастацтва? Скажу проста: я не прыхільнік дзяліць мастацтва на левае і правае, на “чыстае” і “нячыстае”. Я памяркоўна стаўлюся да любых кірункаў у праявах творчасці. Гэта — як кветкі на лузе: чым іх больш, тым лепш. Нельга ўсю колерамузыку прыроды зводзіць да манахромнасці. Але нельга і кветку прыраўноўваць да пустазелля. У мастацтве, пры ўсёй разнастайнасці метадаў і стыляў, мусіць быць галоўнае, вызначальнае, прыярытэтнае. Сам я аддаю перавагу рэалізму. І не таму, што я — мастак старэйшага пакалення, “шасцідзясятнік”, які цалкам выйшаў з “суровага стылю”. Пагадзіцеся, што лепшыя творы, якія прайшлі выпрабаванні часам, ствараліся ў рэалістычнай манеры. Рэалізм у самым высокім сэнсе слова — заўсёды толькі праўда. Сумленная, глыбінная праўда жыцця, убачаная скрозь індывідуальную прызму аўтара. На жаль, гэту ісціну часта ў савецкія часы адцяснялі фальшывая лакіроўка, бездухоўнасць, ідэалагічныя выверты, часам анекдатычнага характару.

Як гэта, напрыклад, адбылося з карцінай “Браслаўскія калгасніцы” і з некаторымі іншымі маімі жывапіснымі і графічнымі творамі, у тым ліку з кніжнымі ілюстрацыямі. Зараз усе імкнуцца ў Еўропу. Ведаеце, гэта не тое што смешна, гэта — журботна. Французская правінцыя ў Беларусі нікому не патрэбна. “Быць як у Еўропе” — на мой погляд, убогасць. Я разумею, маладым ахвота растапырыцца, паглядзець і туды, і сюды. Але як не згадаць, адкуль ты родам? Нашы старыя мастакі казалі: “Абавязкова трэба запрасіць на выставу рабочых МТЗ ці аўтазавода, што яны скажуць? І ў гэтым таксама была рацыя. Як і ў тым, што калісьці рабіў Саюз мастакоў БССР, арганізоўваючы пры падтрымцы райвыканкамаў і сельскага люду ў шматлікіх месцах вясковай Беларусі карцінныя галерэі. А дзе сёння такія рабочыя і сяляне, куды знік вопыт з’яўлення падобных галерэй? Вось я гляджу на маладых і бачу: гэты працуе пад Полака, Кандзінскага, гэты — пад Далі і Дзюшана, гэты — пад Раўшэнберга ці Малевіча. Мы ж таксама не аднаклетачныя, ездзім, бачым… А маладыя думаюць, што яны іх “адкрылі”! Журботна. Маладыя гады, маладыя пачуцці — спрабуй стварыць уласны свет! Я ведаю, што кажу. Шмат гадоў працаваў кіраўніком творчай майстэрні графікі і выпусціў не адзін дзясятак маладых мастакоў, сярод якіх такія таленты, як Саша Грышкевіч, Сева Швайба, Раман Сустаў, Валодзя Саўчанка, Васіль Баранаў… Праўда, на жаль, потым хтосьці з маіх вучняў замест мастацтва выбраў камерцыю. А хтосьці ў пошуках мастакоўскай долі з’ехаў у Еўропу. Такі час…

■ “Усё сваё творчае жыццё я імкнуўся рабіць тое, што хацеў, і як чалавек па натуры яршысты **рэдка ішоў на кампрамісы**”.

■ "Зараз усе імкнуцца ў Еўропу. Ведаеце, гэта не тое што смешна, гэта — журботна. **Французская правінцыя ў Беларусі нікому не патрэбна.** “Быць як у Еўропе” — лічу, убогасць".

■ Адзін чыноўнік наведаў выставу маіх вучняў за чвэрць стагоддзя. Ён паглядзеў яе і іранічна сказаў: “Не разумею, чым вы тут займаліся столькі гадоў?” Я адказаў: “Творчасцю…” Той: “**Творчасць — гэта тавар.** Тавар трэба рэалізоўваць, а грошы вяртаць у бюджэт…”

Колькі слоў пра сябе

— Накідаць хаця б эскізна свой “чалавечы” партрэт? Задача цяжкая, але паспрабую. Маім улюбёным часам дня раней была раніца, цяпер — позні вечар, калі я — у сваёй майстэрні; месяц — кастрычнік, колер — бэзавы, а кветка — касач. Памятаеце мой нацюрморт з касачамі? З дрэў — дуб, а лічба — “тры”. Люблю жывёл — маленькіх, а птушак — вялікіх. Вольны час у бяздзейнасці — непрымальны, але раней мог згуляць і ў азартныя гульні. У людзях мяне раздражняе нахабства, прагнасць, эгаізм і неабгрунтаваная прэтэнцыёзнасць бяздарнасці, чалавечая подласць. А шчасце для мяне — калі спакойна працуецца і ўсе ў сям’і здаровыя. Паважаю мастацтва Мікеланджэла, Бялыніцкага-Бірулі, Цвіркі, сваіх сяброў-сучаснікаў: Папкова, Нарыманбекава, Бісці, Ніканава, Коржава… Ведаеце, пералічыць усё тое, што мне падабаецца ў мастацтве, немагчыма: я люблю і старажытных шумераў і егіпцян, протарэнесанс, усе тры перыяды Рэнесансу з яго гуманізмам і антрапацэнтрызмам, архітэктуру готыкі, ракако і барока, жывапіс рускіх класікаў канца XIX — пачатку XX стагоддзяў і шмат чаго яшчэ; у літаратуры — перш за ўсё Маркес, Быкаў, Адамовіч, Ахматава, Блок, Салжаніцын. У кінематографе — Таркоўскі, Бергман, Феліні, Габэн, Ульянаў. “Мой” тэатр — гэта Таўстаногаў, “Современник”, “Таганка” і Эфрас, сёння — наш Мікалай Пінігін. Аддаю перавагу музыцы Мусаргскага, Кабалеўскага, Вердзі, і, канешне, маіх добрых сяброў — “залатых” “Песняроў” Валодзі Мулявіна...

А што да веры ў рэлігійным плане, дык, хутчэй за ўсё, я — каб больш дакладна сказаць — чалавек веруючы. У сэнсе веры ў тое, што трэба заўсёды быць сумленным і справядлівым, паважаць свабоду іншых і быць свабодным у сваёй волі. Веру ў сваю сям’ю, у блізкіх сяброў, у сваю прафесію, дадзеную мне звыш. Паважаю ўсіх вернікаў, незалежна ад таго, да якой рэлігіі яны належаць. Галоўнае, каб гэтыя рэлігіі — хрысціянства, іудаізм, іслам ці сікхізм, як і рэлігіі без веры ў Бога — канфуцыянства, будызм або джайнізм — неслі ў сваёй аснове любоў, святло, дабро, міласэрнасць, спачуванне, братэрскія адносіны да ўсіх людзей Зямлі, незалежна ад паходжання. Скажу, што ў сваёй творчасці я не раз звяртаўся і да біблейскіх сюжэтаў, і да старажытнай міфалогіі народаў свету. У гэтым сэнсе мяне асабліва ўразіла Індыя, дзе я быў аж чатыры разы, і якой прысвяціў не адзін дзясятак сваіх графічных, акварэльных, жывапісных твораў і кніжных ілюстрацый.

Сам я па натуры быў і застаюся рамантыкам “суровага стылю”. Сёння мая галоўная задача — захаваць прысутнасць духу і пачуццё ўласнай годнасці, каб процістаяць цынічнаму нігілізму, які імкнецца “зросіць” інтэлект, набыты стагоддзямі, які заклаў фундамент нацыянальнай незалежнасці нашай краіны…

P.S. *У фінале сустрэчы Георгій Георгіевіч, вяртаючыся да пытання пра яго веру, працытаваў на памяць фразу Андрэя Таркоўскага: “Мы — распяцце ў адной плоскасці, а свет — шматвымерны. Мы гэта адчуваем і пакутуем ад немагчымасці спазнаць ісціну. А ведаць і не трэба. Трэба — кахаць. І верыць. Вера — гэта веды пры дапамозе любові...” І мы, журналісты, падумалі, што менавіта так жыве Паплаўскі, мастак, якому адкрыта асаблівае хараство — хараство ўнутранага руху. Таму што ён убірае ў сябе ўсю нервовую паўнату жыцця. У яго — сваё “візуальнае” асяроддзе, сваё разуменне свядомасці, свой прадметны свет, вобразы людзей, гістарычная памяць. Яго немагчыма ні з кім параўнаць, зблытаць, злучыць. Ён адзін такі — з асаблівым мысленнем, асаблівым “голасам”, асаблівай эмацыянальнай і інтэлектуальнай энергетыкай...*

У сустрэчы ўдзельнічалі Пётра ВАСІЛЕЎСКІ, Барыс КРЭПАК, Настасся ПАНКРАТАВА, Вольга РОПАТ, Вольга СТАРАВОЙТАВА, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

К

Аўдыя & Відэа

Алег КЛІМАЎ, спецыяльны карэспандэнт "К"

Уладзімір МАКСІМКАЎ, прадзюсар

Верасьнёўскія аўдыя/відэаработы айчынных выканаўцаў рэцэнзуюць прадзюсар Уладзімір МАКСІМКАЎ (А.) і спецыяльны карэспандэнт газеты “Культура”, музычны крытык Алег КЛІМАЎ (В.).

АЎДЫЯ

Гурт “Mission Jupiter”, сінгл “Мы вартыя быць”

А.: Я з піетэтам стаўлюся да людзей, якія ў нашай краіне займаюцца музыкай, значыць, атрымліваюць асалоду, значыць, так трэба. А таму, перафразуючы класіка, шалу адважных спяваю я песню. Для сябе ўсю музыку я падзяляю на тры часткі: для аднаразовага праслухоўвання, нават уключаючы папсу кшталту Баскава, — каб быць у курсе, што адбываецца з музыкай наогул, любой; для праслухоўвання на вініле дома, у якую я цалкам занураюся, абстрагуючыся ад усяго; для праслухоўвання ў машыне — гэта самы вялікі пласт музыкі, яна не патрабуе глыбокага ў яе паглыблення, але і не раздражняе. Творчасць “Mission Jupiter” адношу да трэцяй: яна меладычная, не нярвуе. Такой музыка павінна быць.

Вартымі ўвагі лічу тых артыстаў, якім ёсць што сказаць людзям, ёсць аб чым выказацца сур’ёзна, таму што набалела, таму што думка сфарміравалася. У гурта мэсідж для публікі ёсць, ён проста яшчэ прабіваецца з глебы. Увогуле, з задавальненнем я праслухаў два гэтыя трэкі.

В.: Прыгожы, рамантычны альтэрнатыўны поп-рок. З прыгожым жа жаночым вакалам, крохкасць якога “парушаюць” суровы гітарны гук ды рытм-секцыя. У англамоўным трэку варта адзначыць саксафон, не важна, сапраўдны ён ці штучны. Прыемны сінгл з двух кампазіцый, якасны запіс, добрыя музыканты — што яшчэ трэба, каб з задавальненнем сустрэць новы дзень новай айчыннай музыкі? Магчыма, яшчэ толькі пламбір “20 капеек”. Гурт варты быць у нашай музычнай тусоўцы, прычым і на незалежнай сцэне ён будзе дарэчны, і ў зборных “салянках” розных жанраў, і ў радыёэфіры, і ў “скрыні”.

Paul Kat, міні-альбом “That Feeling”

А.: “Больш музыкі добрай ды рознай!” — лозунг, які цалкам пасуе гэтаму рэлізу. Смачна ды прафесійна, “фірмА”, як кажуць музыканты. Прадукт, годны для нашага ж рынку, як гэта ні парадаксальна прагучыць, усё зроблена настолькі на добрым заходнім узроўні, што наўрад ці апынецца запатрабаваным. Нам жа што цікава, калі гэта хоць неяк стасуецца з сусветнымі плынямі? Каб не было наўпрост “злізана”, каб нейкая нязграбнасць была. Мне, дарэчы, такое падабаецца. А тут — няма да чаго прычапіцца.

В.: Paul гэты самы Kat ёсць не хто іншы, як наш Андрэй Кацікаў, які сын таго самага Кацікава з “Песняроў”, які вучыўся не ў “Гнесінцы” якой-небудзь, а ў тым самым музычным каледжы “Бэрклі” ў Бостане. І вывучыўся на дэбютны міні-альбом, што разумныя людзі аднеслі да стылю соўл. Я на сябе такую смеласць не ўзяў бы — вось так дакладна ідэнтыфікаваць кірунак, прадстаўлены на EP, а назваў бы матэрыял туманна проста — сучасная замежная музыка, не адкрыта папсовага кшталту. Нармальныя трэкі, якія бадай больш як на дэбют не прэтэндуюць. Дыхтоўна, прафесійна, з густам.

Гурт “Earworm”, альбом “Last Cocktail”

А.: Крута, што ёсць у краіне людзі, якія пішуць ды граюць вось такое, нечаканае. Але! Ужо прабачце ці то за таўталогію, ці то за каламбур, музыкі ў гэтай музыцы няма. Ёсць рытміка, асобныя гармоніі, але ў цэлае ды мелодыі ўсё гэта не складваецца. Верагодна, тое — прынцыповы падыход артыстаў, і нават можна прыгадаць мноства прыкладаў такой музычнай творчасці, але тут менавіта мелодый мне не хапіла. Больш цікава было б, каб па-над тэмамі, напрыклад, альтыст, найграваў якуюнебудзь мелодыю, галоўную тэму. У якасці ж саўндтрэку работа спатрэбілася б без заўваг, падкрэсліваючы ідэю фільма.

В.: Гродзенскі гурт разумнай музыкі альбомам развітаўся са слухачом ды нераптоўна памёр пад гукі ўласных арт-року, псіхадэлік ды іншага шугейзу. Уражвае, зачароўвае, напружваючы, адпускае. Натуральна шыкоўнае інструментальнае баляванне. Шкада, што моцная, стыльная, прафесійная, з мазгамі каманда распалася. Але што ім было “лавіць” далей? Матацца па бясконцых шоукейс-фестывалях у надзеі нарвацца на кантору, якая азалаціць іх творчыя думкі? Або працягваць "лабаць" на радзіме для 30 чалавек у заштатных клубах?

ВІДЭА

Гурт “Нейра дзюбель”, кліп “Дзеці галактыкі”

А.: Страшна паважаю Аляксандра Кулінковіча, яго вобраз, мову, думкі, якія ён даносіць да слухача нетрывіяльна, з налётам прымітывізму. Да топ-10 беларускіх выканаўцаў “Нейра дзюбель” адназначна адношу. А вось сэнс відэа не зразумеў. Пры ўсёй быццам бы арыгінальнасці, кантраст паміж брутальным панкам на сцэне і той жа асобай, але ўжо ў ролі выхавальніка, здаецца мне фальшывым. Не пераканала прысутнасць дзяцей, якія, па ідэі, павінны перайграць любога. Штучна выйшла, не па-сапраўднаму.

В.: У арыгінале савецкі хіт называецца “Прыцягненне Зямлі”, яго кавер “дзюбеля” далі як “Дзеці галактыкі”, ды і дзеці ў кліпе на версію кампазіцыі і зняліся — ажно 70 чалавек з кінашколы “Talent”. Дзеткі — тыя яшчэ, цалкам адпавядаюць панкварыянту трэка: бойкія, размаляваныя, што адпальваюць у клубе разам са сваім як бы рок-кумірам. А як усё мірна пачыналася: вось ціхая гадзіна ў дзіцячым садку, вось дзядзька Саша (лідар гурта Аляксандр Кулінковіч) у ролі выхавацеля. А потым — панеслася тусоўка з падушкамі на музыканта! І “каверок” добры, і “відэа-ранішнік”. Пацешна, весела, па- і не падзіцячы.

З 11 па 15 кастрычніка ў Магілёве праходзіць V Міжнародны форум "Традыцыйная культура як стратэгічны рэсурс устойлівага развіцця грамадства". У сераду на пляцоўцы ля Абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці і культурна-асветнай работы пачаў працаваць кірмаш рамёстваў. Сёлета ён падаўся дакладным эпіграфам да асноўнай форумнай дзеі.

У фае Магілёўскага АМЦНТІКАР.

У сёлетнім Міжнародным форуме бяруць удзел прадстаўнікі 12 краін.

Яўген РАГІН, Мінск — Магілёў — Мінск / Фота аўтара

84 метры пошуку і знаходак

Выступаюць лепшыя калектывы вобласці.

Купальскі пояс плятуць дырэктар Заеліцкага дома рамёстваў Соф'я Меснік (справа) і майстрыха Наталля Герашчанка.

Фарбы розныя — палітра адна

Сярод віртуозных ганчарства і бондарства — унікальная праца спецыялістаў Заеліцкага дома рамёстваў з Глускага раёна — купальскі пояс даўжынёй у 84 метры. У момант, калі друкуюцца гэтыя радкі, пояс павольна павялічваецца, бо ткацтва яго не спыняецца. Пачыналі працу самыя старэйшыя ткачыхі вобласці, працягваюць — іх вучаніцы. Вось і ў той дзень, не зважаючы на восеньскую прахалоду, пояс жыў і рос. А вакол яго нязменна збіралася купка замежных удзельнікаў форуму. Хтосьці, з дасведчаных, таксама браўся за справу, і яна множылася плёнам. Ці не так, паступова, але няўхільна, узводзіцца будынак пад назвай "сусветная традыцыйная культура", дзе ўнёсак кожнага народа ўплятаецца ў супольную бязмежную прастору. Фарбы розныя, а колеравая палітра агульная. І ад выступлення да выступлення кожнага з удзельнікаў міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі "Песенная і танцавальная фальклорная спадчына: ад традыцый да сучаснасці" я згадваў пра гэтую міждзяржаўную фальклорную еднасць неаднаразова.

Плён стасункавання

Пра канферэнцыю — крыху ніжэй. Вынікамі прынята артыкул заканчваць, але менавіта імі я хачу распачаць. Дзеля чаго ў пяты раз ладзіцца магілёўскі форум, які вымагае ад аблвыканкама, абласнога метадычнага цэнтра немалых высілкаў? Дзеля інтэграцыі нашай нацыянальнай культуры ў сусветную прастору. А на гэтым не эканомяць…

Дык вось, канкрэтныя вынікі форуму. Беларусь увайшла ў Міжнародную асацыяцыю фальклорных груп. Замежны бок узяў на сябе праезд і ўтрыманне нашых самадзейных калектываў. Натуральна, павялічылася колькасць выездаў за мяжу, пашырылася геаграфія гастроляў. Возьмем, да прыкладу, Асіповіцкі раён. Тамтэйшыя гурты "Сузор'е" Пратасевіцкага СДК і "Крынічка" Асіповіцкай ДШМ № 1 тры гады запар здзіўляюць выступленнямі Турцыю. На апошнім форуме начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Асіповіцкага райвыканкама Ірына Раманчук і супрацоўнік Дэпартамента міжнародных культурных сувязяў арганізацыі "Harman Folklore" са Стамбула Омера Ферда Коскун сустрэліся як даўнія добрыя знаёмыя. У тым купальскім поясе ёсць і турэцкая ніта. І не толькі! Цягам пяці гадоў творчыя калектывы Асіповіччыны пабывалі ў 12 краінах свету. Гэта Польшча, Чэхія, Славакія, Венгрыя, Балгарыя, Іспанія, Швецыя, Францыя… Згаданае "Сузор'е" прапагандавала беларускую традыцыйную культуру ў Партугаліі і Італіі. Заўважце, гаворка толькі пра Асіповіцкі раён.

Так што ўдзел у магілёўскім форуме адчыняе дзверы ў свет, дапамагае захоўваць мірны баланс паміж краінамі, развівае сусветную культурную спадчыну. Да таго ж — дапамагае змагацца з праблемамі міжнароднай грамадой.

Праблемы — ідэі — вынік

Яны, дарэчы, на канферэнцыі форума не замоўчваліся. Нездарма на адкрыцці міжнароднага мерапрыемства намеснік міністра культуры нашай краіны Васіль Чэрнік зазначыў, што такі форум — самая прыдатная пляцоўка для наладжвання творчых дыскусій і ажыццяўлення новых ідэй.

Ідэй гэтых хапала ў кожным выступленні. Намеснік дырэктара федэральнага Дзяржаўнага расійскага дома народнай творчасці Ірына Казлова гаварыла пра тое, што стварэнне грунтоўнага цыкла культурна-асветніцкіх перадач на тэлебачанні так і застаецца марай. Нібыта з нашага, беларускага, языка сарвала. Ідэя тут адна — быць больш настойлівымі ў ажыццяўленні намечанага. Тое ж самае тычыцца і недасканалай нарматыўна-прававой базы для захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

Пра вырашэнне яшчэ аднаго хваравітага пытання распавёў на канферэнцыі генеральны дырэктар славацкага нацыянальнага ансамбля "Sluk" з Браціславы Юрай Хамар. На базе калектыву створаны Цэнтр нематэрыяльнай культурнай спадчыны Славакіі. Рэалізаваны адзін з праектаў гэтай арганізацыі. Гаворка пра Электронную энцыклапедыю традыцыйнай народнай культуры. Створаны і адпаведны сайт. У перспектыве ён павінен

На людным месцы: аглядавая пляцоўка

Культурны кастрычнік

"…Люднае месца" гэтым разам — пяць абласцей. І нават замежжа. Магчыма, актыўнасць чытачоў звязана з Днём работнікаў культуры, што адзначаўся ў нядзелю? У любым выпадку, рэдакцыя шчаслівая бачыць вашы лісты з месцаў падзей.

Аліна САЎЧАНКА

Адзін з іх — з **Касцюковіцкага** раёна Магілёўскай вобласці, дзе ў мінулыя выхадныя адбыўся X Раённы фестываль народнай творчасці сярод сельскіх устаноў культуры "Крыніца душы", прымеркаваны да свята. Пра тое, як удзельнікаў прымалі ў Муравільскім сельскім доме культуры і на базе Крапівеньскага сельскага дома культуры "К" распавяла Наталля Дробышава, намеснік дырэктара цэнтралізаванай клубнай сістэмы раёна. "Калектывы мастацкай самадзейнасці дзесяці сельскіх устаноў культуры выйшлі на сцэну, каб падараваць гледачам асалоду ад багацця талентаў, што ззялі ў гэты дзень".

Пра свой шматгадовы вопыт з бібліятэчнай сферы распавяла Ніна Дыдышка з **Пружанаў** (Брэсцкая вобласць). У сваёй прафесіі яна з 1969 года, у працоўнай кніжцы значыцца 31 запіс. На шляху спадарыні Дыдышка працоўныя суботы і нядзелі, кіналекторыі для вучняў мясцовых школ, збор дэфіцытных кніг для бальніцы і іншыя добрыя справы…

Тры навіны са **сталіцы**. У аўторак Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт правёў выставу дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва "Ушэсце душ", аўтарамі якой сталі Кацярына Новікава і Аляксей Ляпін. Апошні — сябра Беларускага таварыства інвалідаў, працуе ў кірунку андэграўнду. Выстава прымеркавана да 10-годдзя прыняцця Канвенцыі аб правах інвалідаў і першай гадавіны з дня падпісання дакумента Рэспублікай Беларусь. Работы вядомага беларускага майстра арандыроўкі колераў Кацярыны Новікавай вылучаюцца непаўторным бачаннем роднай прыроды.

28 кастрычніка ў Палацы культуры Мінскага трактарнага завода пройдзе IV Фестываль калектываў народнай песні "Моц славянскіх сэрцаў", на які прыедуць творчыя калектывы Беларусі і замежжа: Расіі, Украіны, Польшчы.

Мікалай Шаўчэнка, член Беларускага саюза журналістаў, паведамляе, што Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны наведаў член брытанскай каралеўскай сям'і Прынц Майкл Кенцкі, які знаходзіўся ў Беларусі з рабочым візітам. Высокага госця суправаджалі Пасол нашай краіны на туманным Альбіёне Сяргей Алейнік, а таксама супрацоўнікі Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь.

Зноў інклюзіўная тэма — з **Дзяржынскай** цэнтральнай раённай бібліятэкі. У адной з залаў установы Алай Балясавай, педагогам Цэнтра творчасці дзяцей і моладзі раёна, была арганізавана мастацкая выстава работ дзяцей з псіхафізічнымі асаблівасцямі "На крылах творчасці". Галоўнымі гераінямі на ёй сталі юныя творцы Юля Доўнар і Крысціна Быкава. Для іх гэта дасягненне стала амаль подзвігам: дзяўчынкі перамаглі страх перад працай, якая патрабавала ад іх неймавернай цярплівасці, стараннасці, спрыту пальцаў рук. Пра гэта распавяла "К" Вікторыя Гомза, прэс-сакратар упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама.

Да святочных мерапрыемстваў з нагоды 900-годдзя **Слуцка** далучылася і раённая Цэнтральная бібліятэка. На пляцоўцы перад бібліятэкай у рамках піяр-акцыі "Слуцк — горад старажытны, сэрцам — малады" быў арганізаваны цыкл выстаў "Табе, наш Слуцк, узрост да твару", дзе прадставілі рарытэты фонду — кнігі і копіі 1896 і 1905 года. "Гонар і слава роднага краю" — пад такой назвай аформілі алею знакамітых ураджэнцаў Случчыны, юбіляраў гэтага года, з ліку якіх літаратуразнаўца, крытык, публіцыст і празаік Алесь Марціновіч, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі ў намінацыі "Лепшы твор прозы". Яшчэ адна выстава, "Сем цудаў Слуцка", знаёміла наведвальнікаў з гісторыка-культурнымі аб'ектамі і рэліквіямі горада, а гэта Свята-Міхайлаўскі сабор, помнік святой Сафіі Слуцкай, слуцкія паясы, Слуцкае Евангелле, Мемарыяльны комплекс у памяць загінулых у гады

Удзельнікі міжнароднай канферэнцыі ў Нясвіжы.

Адкрыццё мемарыяльнай дошкі Нікіфару Жальбе.

Падчас выставы "На крылах творчасці".

стаць часткай еўрапейскай інфармацыйнай структуры. Пытанне, як падаецца, актуальнае для кожнай з краін свету.

Як захаваць фальклор, калі фалькларыстаў мала, а агульнаадукацыйная школа не надае гэтаму пытанню належнай увагі? Пытанне паставіў і паспрабаваў на яго адказаць Маўрыцыа Негра — прадстаўнік Італьянскага фальклорнага саюза, саюза фальклорных калектываў рэгіёна Фрыўлі-Венецыя-Джулія. Тут, па яго словах, існуе тры кірункі дзейнасці: адпаведныя праекты ўключаюцца ў цыкл дадатковага навучання, ствараюцца фальклорныя курсы для выкладчыкаў, рыхтуюцца даследчыкі, здольныя фіксаваць узоры традыцыйнай культуры. Уцягненню моладзі ў дадзеную справу садзейнічае і валанцёрскі рух.

І навука, і практыка

Як і заўжды, навука на форуме шчыльна суседнічала з практыкай. Удзельнікі міжнароднага мерапрыемства скіраваліся ў Чэрыкаўскі раён. Тут адбылося свята рамёстваў, музыкі, песні і танца "Залатыя руны народнай творчасці". Былі прадэманстраваны таксама абрадавая праграма "Ад Калядак да Пакрова", канцэрт з удзелам фальклорных калектываў Магілёўскай вобласці.

А 14 кастрычніка Краснапольскі раён прэзентаваў форуму творчую акцыю "Сябрына на Пакроў".

Падчас форуму было падпісана пагадненне аб культурным супрацоўніцтве паміж установамі культуры Магілёўскага абласнога метадцэнтра і Валагодскім абласным навукова-метадычным цэнтрам культуры, Тверскім абласным домам народнай творчасці.

К

15 кастрычніка — 80 гадоў нашаму добраму сябру, пісьменніку, публіцысту, журналісту, перакладчыку Міколу ГІЛЮ.

Пасеянае — узыдзе

Так, у яго было шмат рэдактарства за працавітымі плячыма перад тым, як ён прыйшоў да нас, у рэдакцыйна-выдавецкую ўстанову "Культура і мастацтва": рэдактарства на перадачы для дзяцей на Мінскай студыі тэлебачання, праца ў часопісах "Родная прырода" і "Маладосць", кіраванне газетай "Літаратура і мастацтва"...

Барыс КРЭПАК

З прыходам Міколы Сымонавіча ў нашу выдавецкую структуру на пасаду галоўнага рэдактара часопіса "Мастацтва" і першага намесніка дырэктара па РВУ для нас па-новаму паўстала пытанне "Як пісаць?" Не "Пра што пісаць?", а "Як?" — базавае пытанне філасофіі і экзістэнцыі культуры XXI стагоддзя. Пра што — мы гэта ведалі, а як — шмат у чым нас навучыў Мікола Сымонавіч. Як сказаць па-беларуску "изысканный", "некопийный", "отроческий"? З гэтымі і падобнымі да іх пытаннямі нашы журналісты не раз назаляліся да Міколы Сымонавіча і штораз атрымлівалі адказ — важкі, змястоўны, беларускі. Я не адзін год працаваў з ім у адным кабінеце ў рэдакцыі газеты "Культура", і нам было пра што пагутарыць, прыгадваючы і нашы добрыя творчыя ўзаемаадносіны ў тыя часы, калі ён узначальваў сем гадоў славуты "ЛіМ", а я тады рэгулярна там друкаваўся; і яго расповеды пра сваю малую радзіму — Лагойшчыну, дзе ён рос, у прыватнасці, разам са старэйшым братам — народным паэтам Беларусі Нілам Гілевічам, і пра многае іншае. Сярод яго аповесцяў і апавяданняў ёсць адна цікавая кніжка, якая называецца "Пасеянае — узыдзе". Дык вось, тое, што зрабіў для людзей, для сваёй Бацькаўшчыны, што пасеяў у сваім лёсе Гіль, абавязкова ўзыдзе...

Сам Мікола Сымонавіч некапіяваны. Але навошта паўтараць нейчы лёс? Трэба жыць сваім жыццём. І ён жыве. Жыве некапіяваным. Тое, што ён такі, даказвае і кніжка васьміраздкоўяў Міколы Гіля "Неадступнасць", якая выйшла днямі.

Вось яна, яго неадступнасць і некапіяванасць:

Неяк ноччу, хай і няпозняй,
Давялося мне йсці праз могілкі.
Страх — бялелі крыжы пагрозна! —
Працінаў — аж у сэрцы колікі!
І каб неяк яго адолець,
Не самлець там, ля гэных крыжыкаў,
Заспяваў я гучна, з раздоллем...
Песня ратуе і ад дрыжыкаў!

А на яго пытанне "Як?" сёння яму самому ўжо гатовы адказаць яго жонка стыль-рэдактар часопіса "Полымя" Марыя Міхайлаўна, яго сын рэдактар аддзела культуры "Настаўніцкай газеты" Мікола разам з жонкай рэдактарам аддзела школ таго ж выдання Вольгай, яго любімая ўнучка навучэнка 23-й беларускамоўнай гімназіі Мілена, якая з імпэтам займаецца выяўленчым мастацтвам і брэйк-дансам.

К

Мікола Гіль: восеньскі настрой разам з унучкай. / Фота Юрыя ІВАНОВА і з архіва "К".

Журналісцкі бацька

Міколу Гілю — 80 гадоў. Гэтымі днямі мэтра нацыянальнай журналістыкі шчыра віншуюць яго шматлікія вучні. Я шчаслівы, што сярод іх, "аперaных", знайшлося месцейка і для мяне... Мікола Сымонавіч, услед за спякотным летам надышла золкая восень, і вы памянялі лецішча ў Слабадзе на кватэру ў Мінску. Цудоўна! Значыць нічога не мяняецца ў гэтым свеце і жыццё працягваецца. Няхай яно будзе для вас ураджайным на добры настрой і шчодрым на сонечныя дні. Вы гэтага заслужылі.

Яўген РАГІН

Цяжка пісаць пра чалавека, якога добра ведаеш і які самым рашучым чынам паўплываў на твой журналісцкі лёс. Цяжка, але прыемна. Гэткім чынам і ты далучаешся да нечага сапраўднага, шчырага, непахіснага.

Мікола Сымонавіч не толькі бліскучы пісьменнік і перакладчык. Ён — журналісцкі бацька. Быў, ёсць і будзе. І нічога, што законных сыноў — толькі два, а дзясяткі астатніх — "прыёмныя". Мы ўсе — птушаняты ягонага гнязда. І ў камандзіроўкі мы ездзім па даўно пратаптаных сцежках Гіля. Такую трывалую ды выніковую сістэму выхавання моладзі прынята называць школай. А яна бывае толькі ў выбітных прафесіяналаў. І якая бяда, што самыя старэйшыя выхаванцы той школы самі ўжо сівыя...

Ён — рэдактар ад Бога, бо шануе слова іншага. Пры ўмове, што яно роднае, выпакутаванае, акцэнтаванае, стаіць на сваім месцы і гучыць высокім нервам журналісцкай праўды. І ў "ЛіМе" (тагачасным, аўтарытэтным), і ў "Мастацтве", і ў "Культуры" ён з ранку да ночы дбайна "пасвіў" гэтыя словы, зганяючы іх на пашу газетнай ці часопіснай паласы ў сытыя статкі артыкулаў і нататак. "Без публіцыстыкі няма перыядычнага выдання!" Гэтыя словы Міколы Гіля раз і назаўжды застануцца для мяне непахісным правілам. А самай важкай адзнакай асабістага творчага поспеху — ягонае слова "Малайчына!"

Я ніколі не бачыў, каб Мікола Сымонавіч выходзіў з сябе, злаваўся і спрачаўся на злом галавы. Даводзіць сваю думку спакойна і тактоўна — таксама вялікае мастацтва. І яно цярпліва выкладаецца ў сценах гілёўскай школы. Інтэлігентнасць не купіш, яна перадаецца ад сэрца да сэрца. І гэта таксама вялікае майстэрства. Дзякуй, Мікола Сымонавіч, што вы ім валодаеце!

К

Калектыў рэдакцыйна-выдавецкай установы "Культура і мастацтва" віншуе Міколу Сымонавіча з юбілеем і зычыць яму шчасця, здароўя і дабрабыту.

Змітцер Арцюх на прэзентацыі сваёй новай кнігі.

Кніжныя алеі сталі адметнасцю свята ў Слуцку.

Падчас абласных "Дажынак" у Сянно.

Прынц Майкл Кенцкі знаёміцца з экспазіцыяй Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

Вялікай Айчыннай вайны. На выставе пад назвай "Знаёмцеся — нашы выданні" былі прадстаўлены інфармацыйна-бібліяграфічныя даведнікі, рэкамендацыйныя спісы літаратуры краязнаўчай тэматыкі. Дзякуй за паведамленне Святлане Сарагавец, галоўнаму бібліёграфу аддзела абслугоўвання і інфармацыі чытачоў Слуцкай раённай цэнтральнай бібліятэкі.

5 — 6 кастрычніка праходзіла Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя на базе Нацыянальнага гісторыка-культурнага музея-запаведніка **"Нясвіж"**, арганізаваная ўстановай сумесна з Польскім інстытутам у Мінску.

8 кастрычніка ў горадзе **Сянно,** як распавядае нам Андрэй Струнчанка, вядучы метадыст Віцебскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці, прайшоў абласны фестываль-кірмаш працаўнікоў вёскі **Віцебскай вобласці** "Дажынкі-2016". Працаваў "Рамесны фальварак", дзе разгарнуліся выстава-кірмаш дамоў і цэнтраў рамёстваў вобласці, прэзентацыя страў традыцыйнай беларускай кухні, выступленні творчых калектываў. У гарадскім скверы, каля памятнага знака "Родны край", прысвечанага Дзяржаўнаму сцягу, арнамент якога выканала Матрона Маркевіч, ураджэнка Сянно, разгарнулася тэатралізаванае прадстаўленне "Вытокі сімвалаў краіны". Не абышлося без традыцыйнага шэсця з удзелам барабаншчыц і духавога аркестра, адгрымеў у горадзе і канцэрт "Мая зямля, мая Радзіма".

Літаральна зараз, у суботу, у гарадскім паселішчы **Баравуха** Полацкага раёна Віцебскай вобласці праходзіць рэгіянальны фестываль "Крыніца здароўя пад Нафтаградам", накіраваны на засяроджванне ўвагі на экалагічнай бяспецы і захаванні спрыяльнага навакольнага асяроддзя. У праграме — кірмаш-продаж вырабаў дэкаратыўна-прыкладной творчасці і гародніны з садавінай, мяса-малочнай прадукцыі, прэзентацыя дасягненняў і праектаў па здаровым ладзе жыцця, выставы з другаснай сыравіны. Упрыгожаннем фестывалю стане канцэртная праграма, якую падрыхтавалі артысты і аматарскія калектывы ўстаноў культуры Наваполацка і Баравухі.

Гродзенская вобласць, як і заўсёды, самая багатая на навіны. Кожныя два гады ў абласной сталіцы праводзіцца свята мастацкага слова. 30 верасня ў Абласным метадычным цэнтры народнай творчасці ў рамках гэтага конкурсу прыняло ўдзел 50 аматараў слова ў чатырох намінацыях. Па меркаванні журы ўзровень выканання быў вельмі высокі, мерапрыемства падарыла сваім удзельнікам добры настрой і бурныя апладысменты слухачоў.

У вёсцы **Труханавічы** Дзятлаўскага раёна 8 кастрычніка адбылося адкрыццё мемарыяльнай шыльды на хаце, дзе жыў заходнебеларускі паэт Нікіфар Жальба. Ва ўрачыстасцях прымалі ўдзел актывісты з Дзятлава і райвыканкама, супрацоўнікі краязнаўчага музея, літаратары, настаўнікі. Творчасць дзятлаўскага паэта да гэтых дзён не сістэматызавана, не выдадзена нават асобнай кніжкі вершаў. Але, спадзяемся, мемарыяльная шыльда ў тым ліку прыцягне вялікую ўвагу даследчыкаў літаратуры да гэтай асобы. У той жа дзень удзельнікі ўрачыстасцей накіраваліся ў іншую вёску — Зачэпічы, што таксама на Дзятлаўшчыне. Зачэпічы нездарма называюць "гняздом паэтаў": адтуль родам Герасім Прамень, Васіль Струмень, Пятрусь Граніт, якія ў першай палове XX стагоддзя друкавалі свае творы ў віленскіх беларускіх выданнях. Літаратары таксама ўдастоіліся мемарыяльнага знака. Ініцыятыва ўшанавання гэтых людзей ішла ад жыхара горада Дзятлава Валерыя Петрыкевіча і слонімскага пісьменніка і краязнаўцы Сяргея Чыгрына, ды сяброў Таварыства беларускай мовы.

Рыхтуючы чарговую выставу, супрацоўнікі **Ваўкавыскай** раённай бібліятэкі вырашылі адступіць ад правіл і падабраць кнігі не па тэматыцы, а па колеры. "Кніга-колер" вельмі зачапіў наведвальнікаў і выклікаў шчырыя эмоцыі ў дзяцей. Такім чынам, піша бібліятэкар аддзела абслугоўвання і інфармацыі ўстановы Наталля Лышчык, падобныя выставы час ад часу сапраўды варта арганізоўваць. Калі ў бібліятэцы цёпла, утульна і прыгожа, а колер кніг гэтым разам быў абраны жоўты, дык чытач абавязкова вернецца.

6 кастрычніка **ў Навагрудскай** раённай бібліятэцы адбылася прэзентацыя новай кнігі "На скрыжаванні" беларускага паэта і журналіста, аднаго з колішніх аўтараў "К" Зміцера Арцюха. Кніга — другая ў бібліяграфіі аўтара. У ёй знайшлося месца вершам пра пошук гармоніі паміж душой і целам, нябесным і зямным, пра маленькія гісторыі кахання і сум па хуткаплынным у жыцці. Ліст з інфармацыяй даслаў загадчык аддзела абслугоўвання і інфармацыі Навагрудскай раённай бібліятэкі Іна Шаўчук.

К

Якія песні нас яднаюць?

Тыдзень таму ў Палацы культуры Мінскага трактарнага завода прайшоў IX Міжнародны конкурс дуэтаў "Песні, што нас яднаюць", які сабраў прадстаўнікоў 10-ці краін. Вынікам спаборніцтва стала не толькі ўзнагароджванне пераможцаў, але і штосьці большае, што нельга вызначыць матэрыяльнымі каштоўнасцямі.

Надзея БУНЦЭВІЧ

— Гэты конкурс рос і "гадаваўся" літаральна на маіх вачах, — гаворыць старшыня журы, народны артыст Беларусі, кампазітар, мастацкі кіраўнік ансамбля "Бяседа" Леанід Захлеўны. — Усе гады яго існавання я ўзначальваю журы, таму мне ёсць з чым параўноўваць. Дарэчы, пачыналіся дуэтныя спевы "на Трактарным" з запрашэння вядомых у краіне спевакоў, і завадчане выступалі разам з імі. Першы такі праект, дарэчы, так і называўся — "Зорка + талент". Штосьці падобнае часта практыкуецца ў разнастайных тэлепраграмах, калі ў адну пару яднаюць прафесіянала і аматара. Так было і тут. І гэта прыцягвала дадатковую ўвагу публікі, бо сярод запрошаных знакамітасцяў былі эстрадныя зоркі Аляксей Хлястоў, Сэла, Вікторыя Алешка, Анатоль Сіўко, які сёння паспяхова скарае лепшыя оперныя сцэны свету, і многія-многія іншыя.

Дададзім, што ў якасці ўдзельніка дуэтнага свята пабываў калісьці і цяперашні член журы Уладзімір Громаў — заслужаны артыст Беларусі, адзін з вядучых салістаў Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета:

— Так, мне давялося пабываць па абодва бакі рампы, і я перакананы, што арганізатары абралі вельмі слушны шлях, звярнуўшыся не да сольных спеваў, а да вакальных дуэтаў. Па-першае, гэта ніша, можна сказаць, абсалютна не занятая: сольных конкурсаў — багата, дуэтных — няма. Па-другое, для аматараў і пачаткоўцаў (а менавіта на іх і разлічаны гэты конкурс) вельмі важна адчуваць псіхалагічную падтрымку, якую дае падобная сумесная творчасць, бо выходзіць на вялікую сцэну аднаму куды страшней. Да таго ж, дуэт вымушае прыслухоўвацца да партнёра, прыстасоўвацца да яго, але пры гэтым не губляць сваёй індывідуальнасці. Ці не гэта галоўнае ў жыцці? Прычым у аднолькавай меры і ў асабістым плане і ў працоўным: заўсёды важна пачуць суразмоўцу, паставіць сябе на яго месца — і шукаць выйсце разам, а не ў канфрантацыі. Ну, а для працоўных завода такі конкурс — гэта магчымасць культурна адпачыць, далучыцца да вакальнай скарбніцы розных стыляў і жанраў. Абыякавых не бывае: ні на сцэне, ні ў зале. Журы ж намагаецца ацэньваць не самі па сабе вакальныя даныя, а тое ўзаемадзеянне, што адбываецца паміж спевакамі. Калі гаварыць пра конкурсны ўзровень, дык тры гады запар прыязджаюць вельмі моцныя ўдзельнікі з Эстоніі, стабільна добра выступаюць канкурсанты з Украіны і Расіі. Таксама сярод лаўрэатаў — прадстаўнікі армянскай дыяспары, дуэт кітайскіх студэнтаў і нашы жодзінцы (а Жодзіна — гэта "БелАЗ").

— Пакрыўджаных не было, — працягвае Леанід Захлеўны, — бо так ці інакш адзначылі ўсіх. Добра, што ўдзельнікі нічым не абмежаваны ў выбары рэпертуару. Умовы заключаюцца хіба ў тым, што адзін нумар павінен быць на рускай ці беларускай мове, другі — на мове той краіны, якую прадстаўляюць канкурсанты. У большасці выконваюцца эстрадныя песні, але сустракаюцца і рамансы. З гадамі конкурс пашырае сваю геаграфію, набірае абароты і прэстыж. Праект падтрымліваюць гарадскія ўлады, Міністэрства культуры краіны. Бачна, што да конкурсу сур'ёзна рыхтуюцца не адно арганізатары на чале з дырэктарам Палаца культуры МТЗ Уладзімірам Кірутам, але і ўдзельнікі, бо для іх гэта прыступка ўверх, да сваёй жаданай мары. Ды ўсё ж галоўная мэта выяўлена ў самой назве — "Песні, што нас яднаюць". Бо ідзе абмен добрай энергетыкай, наладжваюцца сяброўскія стасункі. Дый заканчваецца конкурс не адно ўручэннем узнагарод, але і вечарынкай, дзе ўдзельнікі працягваюць спяваць — ужо ў вольнай пазаконкурснай атмасферы. А гэта сведчыць, што спевы і, шырэй, музыка сталі неад'емнай часткай іх жыцця.

Калі карціна... заіграла

Па выніках аналізу, праведзенага дасведчанымі асобамі, высветлілася: за апошнія 10 гадоў самым дарагім расійскім мастаком стаў былы бубнач гурта "Кіно" Георгій "Ґустаў" Ґур'янаў. І калектыў той даўно спыніў сваё існаванне з прычыны смерці яго лідара Віктара Цоя, няма на гэтым свеце і самога Ґустава: ён памёр у 2013 годзе. Але і песні Віктара Робертавіча працягваюць жыць ды гучаць, і работы яго таварыша ліха скупляюцца на аўкцыёнах. Жывыя і творча актыўныя беларускія гурты "Рэха" ды "Harotnica", у якіх заняты Андрусь Такінданг — музыкант ды жывапісец. У апошняй якасці мы і хочам прадставіць яго вам, пачаўшы з Такінданга серыю матэрыялаў, у якіх будзе распаведзена аб айчынных музыкантах-мастаках.

Алег КЛІМАЎ

Куток душы

Маляваннем "каляк-маляк" Андрусь захапіўся ў пачатку 1990-х гадоў, вучачыся ў першых класах школы вёскі Чэрцы Лепельскага раёна. Стараннасць дзіцяці не засталася незаўважанай блізкімі, і, па патрабаванні дзядулі, некалькі больш сталых работ унука былі адпраўлены ў Мінск, у гімназію-каледж мастацтваў імя Івана Ахрэмчыка. Чымсьці яны зачапілі яе выкладчыка Рыгора Сітніцу (цяпер — старшыня Беларускага саюза мастакоў), які дыстанцыйна "загрузіў" перспектыўнага хлапчука, дасылаючы яму заданні. У 1994 годзе Такінданг апынуўся ў знакамітым на ўсю краіну "Парнаце" на аддзяленні жывапісу і скончыў гімназію праз восем гадоў. Пра тое, якім ён быў вучнем, яго настаўніца Раіса Сіплевіч сказала, што, калі ўсе малявалі на экзамене нацюрморт, Андрусь пісаў нешта іншае, тое, што хацелася яму. Вось такім вальнадумным юнак і прыйшоў у Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў, дзе забываў пакрысе тое, чаму яму вучылі ў каледжы, спрабаваў змяніцца цягам года, але не здолеў-такі па-патрэбнаму перафарматавацца — быў адлічаны за прафнепрыдатнасць. На стрэсе, знаходзячыся ў дэпрэсіі, ён усё ж паступіў у Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, дзе Такінданг і вывучыўся на мастака-рэстаўратара. "Выйсці з тупіку дапамагла музыка, якой я пачаў займацца ў апошніх класах "Парната", — прыгадвае ён. — Там і закладваўся будучы падмурак гурта "Рэха". А ва "ўніверы" мы ўжо на ўсю моц гастралявалі па замежжах. І атмасфера там была зусім іншая — больш свабодная".

Размеркаваўся Андрусь у Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і побыту. "Мяне вабілі працы па рэстаўрацыі (гучна сказана: я, хутчэй, дапамагаў) старадаўніх беларускіх абразоў, — кажа ён. — Асабліва ўніяцкіх, XIX стагоддзя. Судакрананне з гэтай культурай адбілася і на маёй манеры, на выбары тэм". Цвяроза ацаніўшы свае магчымасці як рэстаўратара, у 2013-м Такінданг з музея звольніўся, і сёння ён больш займаецца музыкай.

Карціны Такінданга экспануюцца, часта за мяжой. Нядаўна закончылася выстава яго твораў у Пльзене (Чэхія). Зараз работы мастака можна ўбачыць на "Восеньскім салоне з "Белгазпрамбанкам" у мінскім Палацы мастацтваў. І хоць, як лічыць Андрусь, там прадстаўлена шмат у чым гэтак званае актуальнае мастацтва, сябе ён да яго не адносіць: "Я па-за мэйнстрымам, не трымаю нос па ветры, да ўсяго я не творчы правакатар, маё месца там — у кутку ўласнай душы..."

Сярод арыенціраў ён называе, да прыкладу, малых галандцаў, беларускага графіка Паўла Татарнікава. Цікава, што радзіму свайго бацькі — Рэспубліку Чад, ён у карцінах не выяўляе: будучы ў гэтай краіне, Андрусь маляваў толькі партрэты афрыканскіх сваякоў і іх знаёмых.

Што бачу я на яго карцінах? Людзей, жывёл, вясковыя замалёўкі, біблейскія матывы... Недзе ім спецыяльна парушаны прапорцыі, кампазіцыйныя законы, недзе знарок не выкананы іншыя мастацкія каноны, фарбы ўсё больш няяркія, асобы пераважна не вельмі эмацыйныя. Што адчуваю я, гледзячы на яго карціны: іранічныя яны ці сюжэтныя, або гэта пейзаж, настрой мной авалодвае мінорны. Такое, як высветлілася, і светаадчуванне самога Андруся, калі за ледзь дураслівай карцінай, выкананай у жанры прымітывізму, за нярэдка радаснай музыкай гуртоў, у якіх ён грае ды спявае, хаваецца смутак — сапраўды ціхі, неагрэсіўны. І хочацца пусціцца ў філасофстваванне.

— На славу ды лаўры Рафаэля я не замахваюся, — пасміхаецца Такінданг. — У мяне ёсць свая дзялянка, ёсць тыя, хто любіць маю творчасць. Я вельмі люблю маляваць і буду тое рабіць надалей, быццам нехта ў галаве нашэптвае, давай, маўляў, бяры паперу і алей — наперад! Як стрэмка нейкая ў далонях сядзіць, як пад пазногцем нешта дапякае.

Што бачыць аўтар матэрыялу (на фота — злева) на карцінах Андруся Такінданга (справа)? Людзей, жывёл, вясковыя замалёўкі, біблейскія матывы...

Меркаванне мастацтвазнаўцы Пётры Васілеўскага

— Кідаецца ў вочы рознастылёвасць работ, як бы эскізнасць некаторых з іх. Калі ж у агульным праводзіць нейкія аналогіі, то, згадваючы Паўла Філонава, яго ўдзел у адлюстраванні фінскага эпасу "Калевала", асобныя рэчы Андруся мне нагадваюць асаблівасці стылю гэтага рускага мастака-авангардыста. Наогул уласцівую таму гратэскнасць. Мне цікава, наколькі выразныя сродкі, якія выкарыстоўвае Такінданг, адпавядаюць той задачы, што ён ставіць перад сабой кожны раз, калі падыходзіць да мальберта. Калі яго кідае ад звычайнага да сакральнага, калі на яго цісне груз звышцывілізацый, чагосьці надчалавечага. Можа, груз гэты настолькі цяжкі (а ўзваліць яго хочацца, хочацца зрабіць замах на святое), што Андрусь і звяртаецца часцяком у сваёй творчасці да формы інсітнай, нібы здымаючы з сябе нейкую адказнасць. Гэта форма для яго служыць падушкай бяспекі ад, напрыклад, абвінавачванняў у адсутнасці густу. Такія мае здагадкі. Але, можа, ягоная манера якраз і ідзе яму на карысць, дазваляючы пазбягаць нейкіх замшэлых традыцый у выяўленчым мастацтве, быць свабодным ад агульнапрынятых у ім норм і правілаў, даваць волю перш за ўсё сваім эмоцыям, а не імкнуцца падабацца публіцы, падладжваючыся пад яе стэрэатыпы.

ВАТЫКАН

Сёлетняя выстава беларускіх ікон у Ватыкане паклала пачатак шчыльным узаемаадносінам паміж Нацыянальным мастацкім музеем Беларусі і Музеямі Ватыкана. Прыбыўшы ў Мінск, загадчык аддзела дэкаратыўных мастацтваў, а таксама аддзела візантыйскага і сярэднявечнага мастацтва гэтай установы Гвіда КАРНІНІ зазначыў, што з беларускім бокам ужо абмеркавана магчымасць зладзіць гадавыя стажыроўкі для рэстаўратараў НММ.

Настасся ПАНКРАТАВА / Фота Аліны САЎЧАНКА

Гвіда Карніні дзеліцца ўражаннямі аб асаблівасцях беларускай іканапіснай школы.

Дасягальны космас

Нацыянальны мастацкі музей у кроку ад запаветнай мары — стварэння Нацыянальнага рэстаўрацыйнага цэнтра. У музейным квартале, які актыўна ўзводзяць у сталіцы, для захавальнікаў даўніны запланаваны абсталяваныя ўсім неабходным памяшканні. А пакуль рамонтныя працы не завершаныя, супрацоўнікі НММ звяртаюцца па досвед у наладжванні справы да калег вядучых скарбніц свету, бяруць да ўвагі найноўшыя дасягненні ў сферы захавання спадчыны. Генеральны дырэктар айчыннага музея Уладзімір Пракапцоў у захапленні ад наймацнейшай рэстаўрацыйнай базы, якой валодаюць ватыканскія музейшчыкі: "У іх проста космас! Яны працуюць, не дакранаючыся да карціны, пры мінімальным уздзеянні на палатно робяць усе замеры і даследаванні. Нават у французскім Луўры няма такога высокатэхналагічнага і дакладнейшага абсталявання. Сапраўды, незямны ўзровень!" Па словах Уладзіміра Іванавіча, айчынныя рэстаўратары пачнуць выпрацоўвацца па вопыт на тэрыторыю Святога Прастола ўжо з наступнага года.

Як распавёў карэспандэнту "К" Гвіда Карніні, сёння ў музеях Ватыкана дзейнічае сем лабараторый, у якіх працуе каля 50 спецыялістаў. Як правіла, пад кожны праект падбіраецца асобная каманда, у яе склад можа ўваходзіць ад 4 да 10 чалавек. У майстэрнях працуюць высакакласныя знаўцы, якія займаюцца металам (і асобна — зброяй), каменем, жывапісам, паперай, мазаікай, тэкстылем, ёсць унікальныя навукоўцы, якія спецыялізуюцца на ўзнаўленні артэфактаў нееўрапейскіх цывілізацый. "Прадметы Антычнасці, Сярэдніх вякоў могуць патрапіць да нас у зусім лядашчым выглядзе, але ў вялікай рэстаўрацыйнай школе да кожнай рэчы абавязкова знаходзіцца падыход, — працягнуў ён. — Зрэшты, у нашай справе выкарыстоўваюць два найменні: рэстаўратары і кансерватары. Зараз часцей ужываюць апошняе слова. Мы, як і большасць калег з іншых дзяржаў, імкнемся прадухіліць сітуацыю, каб пасля не даводзілася аднаўляць рэч наогул ці не з нябыту. Тут мы блізкія да медыцыны з яе лозунгам пра тое, што лягчэй папярэдзіць захворванне, чым яго лячыць".

Кіраўнік навукова-рэстаўрацыйнага аддзела НММ Аркадзь Шчуп дэманструе Гвіда Карніні (злева) адзін з варыянтаў кансерацыі твора.

Ватыканскія рэстаўратары надзвычай запатрабаваныя ў свеце. Па словах спадара Карніні, прадстаўнікоў іх школы часта запрашаюць падзяліцца назапашаным досведам калегі з іншых краін. "Як правіла, да нас на працу трапляюць, скончыўшы школу рэстаўрацыі ва Фларэнцыі ці Рыме. Аднак хачу зазначыць, што ў нашых майстэрнях — не адны італьянцы. У Ватыкане дзейнічае некалькі так званых папярэдніх школ. Яны прымаюць усіх ахвотных. Тыя з навучэнцаў, хто годна адолеў праграму і змог добра здаць экзамен, атрымліваюць права падаць заяўку на пасаду ў нашых музеях. Зрэшты, у залежнасці ад поспехаў, замежны спецыяліст можа атрымаць не толькі тэрміновую, але і сталую працу ў рэстаўрацыйных майстэрнях. Зрэдку могуць прапанаваць рэстаўратару месца ў абыход адмысловага навучання, аднак гэта павінен быць таленавіты спецыяліст з вялікім вопытам ", — дадаў мой візаві.

Гвіда Карніні падкрэсліў, што беларусаў рады бачыць у ватыканскіх майстэрнях. Італьянцы не толькі гатовыя падзяліцца сваімі сакрэтамі: ім хочацца паслухаць пра асаблівасці беларускага мастацтва, у прыватнасці, пра адметнасці беларускай іканапіснай школы. Асабіста спадару Карніні падабаецца яе рэалістычнасць: "Нягледзячы на тое, што абразы пішуцца па строгіх канонах, па пэўным класічным зводзе правілаў, старадаўнія беларускія іканапісцы прыўносілі ў свае творы рэалістычныя моманты. Яны ўзнікаюць у розных аспектах, напрыклад, абліччу Маці Божай надаюцца рысы звычайнай зямной жанчыны. Такім чынам, святая становіцца бліжэйшай да людзей. Параўнайце з кананічнай візантыйскай іконай: выява аддалена ад гледача, паміж ім і іконай існуе сцяна. З гэтага пункту гледжання беларускія абразы становяцца больш блізкімі і зразумелымі чалавеку".

Між іншым, стажыроўка адкрывае для нашых спецыялістаў шмат дадатковых магчымасцяў, прынамсі, не толькі пераймаць вопыт непасрэдна на тэрыторыі Святога Прастолу, але і паспрабаваць свае сілы ў іншых музеях, якія супрацоўнічаюць з бокам гаспадароў. Карысным будзе досвед у кірунку выкарыстання найноўшых тэхналогій у музейнай прасторы. Зразумела, музеі Ватыкана не адмяжоўваюцца ад павеваў часу, таму шмат інвестуюць у новыя тэхналогіі. Спадар Карніні прывёў у прыклад размешчаныя ў экспазіцыі інтэрактыўныя экраны, якія змяшчаюць дадатковую інфармацыю, а таксама велізарны экран памерам са сцяну, які быў закуплены яшчэ ў 2000 годзе, каб дэманстраваць недаступныя ў экспазіцыі артэфакты, паказваць розныя часткі музейнага комплексу, у які ўваходзіць 54 галерэі. "Але ў пагоні за ноу-хау трэба ўлічваць, у якім будынку выстаўляюцца вашы экспанаты. Возьмем Пінакатэку: яна месціцца ў Бельведэрскім палацы, які сам па сабе з'яўляецца помнікам архітэктуры, таму ў ім нельга праводзіць пэўныя змяненні, якіх патрабуе ўсталяванне высокатэхналагічных гаджэтаў. Ці, напрыклад, лоджыі Рафаэля: вядома, мы не будзем там нічога ўсталёўваць, бо кожны сантыметр сцен пакрыты аўтарскімі выявамі. У адносна новых залах і будынках, канешне, большая прастора для сучасных тэхналогій," — растлумачыў суразмоўца.

К

УКРАІНА

Еўрабачанне-2017: пачынаецца ўсё з...

Толькі ўзняла ўкраінская спявачка Джамала на галоўнай сцэне "Еўрабачання-2016" пераможны "Крыштальны мікрафон", як сусветныя мас-медыя застракталі сумненнямі, ці да часу Украіне, якая знаходзіцца ў няпростай сітуацыі, прымаць міжнародны фэст, што апрыёры пацягне значныя выдаткі. Тыя ж выказванні разпораз гучаць і на самой радзіме Тараса Шаўчэнкі, аднак кіраўнік упраўлення турызму Кіеўскай гарадской дзяржаўнай адміністрацыі Антон ТАРАНЕНКА падчас візіту ў Мінск выказаў упэўненасць, што для Украіны "Еўрабачанне" — сапраўдны выратавальны круг.

Настасся ПАНКРАТАВА

"Я бачу ў гэтым мерапрыемстве толькі "плюсы". Дзякуючы "Еўрабачанню", мы можам узняць імідж краіны!" — запэўніваў спадар Антон на сустрэчы ў Пасольстве Украіны ў Беларусі, праведзенай у рамках XXIII Міжнароднай турыстычнай выставы "Турбізнес-2016". Ён не ўтойваў лічбы: два еўратыдні абыдуцца Украіне прыблізна ў 20 мільёнаў еўра. І адразу прасіў улічваць, што каля сямі мільёнаў паступяць ад спонсараў і ўступных узносаў удзельнікаў конкурсу, каля васьмі мільёнаў плануюць атрымаць ад продажу білетаў. Астатняе выдаткуюць з гарадскога і рэспубліканскага бюджэту, аднак у горада пасля заканчэння фэсту застанецца палепшаная інфраструктура. "У маі 2017-га мы атрымаем тэлепрадукт на 50 краін і зможам зладзіць прамоцыю краіны. Уявіце сабе, што ў 2013 годзе толькі Кіеў прыняў два мільёны замежных вандроўнікаў. Пасля падзей нядаўняга часу краіна патрапіла ў так званую чырвоную зону ўсіх турыстычных маршрутаў. Ведаеце, як складана працаваць, калі пасольствы ўсяго свету не рэкамендуюць сваім турапаратарам ладзіць да нас выезды? Колькі мы біліся ў 2014 годзе, каб давесці бяспеку нашых маршрутаў, прыводзілі ў параўнанне ўлюбёны турыстамі Іерусалім — ён знаходзіцца ў 76 кіламетрах ад Сектара Газа, а паміж Кіевам і неспакойным сёння Данбасам 725 кіламетраў, іншымі словамі, мы ў 10 разоў далей ад зоны баявых дзеянняў… Сёння на турыстычных картах свету Украіна — зялёная. "Еўрабачанне" не толькі "прывядзе" замежных фанатаў на майскае мерапрыемства, але дапаможа вярнуць турыстаў у краіну", — патлумачыў сваю пазіцыю выступоўца.

Як вядома, нашая паўднёвая суседка правяла разгорнуты конкурс, каб абраць горад для правядзення "Еўрабачання". Заяўкі падавалі Львоў, Харкаў, Херсон, Днепр (да нядаўняга перайменавання — Днепрапятроўск), Адэса, Кіеў. Апошнія тры патрапілі ў фінал. Па меркаванні спадара Тараненкі, Днепр не змог перамагчы, бо ў яго няма адпаведнага патрабаванням стадыёна, ды знаходзіцца ён у 100 кіламетрах ад месца ваеннага канфлікту, што адразу ўздымае пытанні бяспекі. Адэсе не хапіла неабходнай колькасці нумарнога фонду. Адэсіты прапанавалі прывезці на мерапрыемства плывучыя гатэлі, аднак тое ўсё роўна патрабуе вялікіх выдаткаў, што нязручна ў цяперашняй фінансавай сітуацыі. Кіеў першапачаткова быў лепш падрыхтаваны, меў усю неабходную інфраструктуру. "Мне падаецца, таму наша сталіца і атрымала ў фінале 9 з 12 галасоў", — падсумаваў кіраўнік упраўлення турызму.

Кіеў чакае ўдзельнікаў і гасцей 62-га конкурсу еўрапейскай песні з 1 па 15 мая. Галоўная сцэна размесціцца на тэрыторыі Міжнароднага выставачнага цэнтра. Як пасля афіцыйнай прэзентацыі распавёў карэспандэнту "К" спадар Антон, пад гэты "еўрамагніт" Украіна плануе правесці маштабную прэзентацыю культуры краіны: "Акрамя афіцыйных мерапрыемстваў, будзе арганізавана спецыяльная пляцоўка ў "Еўравёсцы", куды мы запрасілі ўсе абласныя гарады. Верагодна, там будзе самая вялікая і пры гэтым найбольш даступная лакацыя для публікі. Усе, хто не патрапіў пад купал арэны, змогуць без праблем прыйсці на цэнтральную плошчу горада і адчуць атмасферу "Еўрабачання". Тут запланаваны выступленні прадстаўнікоў усіх 45 краін-удзельніц, таксама на працягу двух тыдняў у асабістых фан-зонах будуць ладзіць прэзентацыі кожная з нашых вобласцяў, выступаць тамтэйшыя калектывы, дзеячы мастацтва".

Гарадскія ўлады мяркуюць, што на два майскія тыдні кіеўскія музеі зменяць графік работы: хтосьці будзе зачыняць дзверы пазней, а нехта плануе працаваць усю ноч. У старой крэпасці гарадскога Арсенала плануецца вялікая выстава з экспазіцыямі музеяў краіны. Не абыдзецца без тэатральнага фестывалю, задумваюцца шматлікія вулічныя выступленні прадстаўнікоў розных жанраў і кірункаў. Увогуле, задумана шмат лакацый на любы густ. Прынамсі, на Спеўным полі адбудзецца фестываль еўрапейскай і нацыянальнай украінскай кухань, фестываль віна і сыру, фестываль вулічнай ежы, пройдзе "Kievbreakfast", а таксама "Sundaybreakfast" — па нядзелях будуць ладзіцца еўрапікнікі ў сталічных парках. Паколькі фестывальны рух разгорнецца не толькі на левым беразе Дняпра, дзе месціцца МВЦ, але і на правым, горад ужо сёння працуе над развіццём турыстычнага транспарту. Напрыклад, плануецца запусціць рачныя трамвайчыкі.

Спадар Тараненка распавёў толькі пра планы непасрэдна гарадской адміністрацыі. У Міністэрстве культуры Украіны распрацоўваецца свая праграма, пад якую выдаткоўваецца пэўны бюджэт. Ва ўпраўленні турызму Кіева таксама грандыёзныя планы: каб міжнародны фестываль стаў карысным не толькі для сталіцы, распрацоўваюцца спецыяльныя маршруты. "Мы з калегамі прадумваем камбінацыі, каб з нагоды "Еўрабачання" турысты вандравалі па Украіне. Хочам зрабіць 3 — 5 дзён у Кіеве, каб фанат захапіў паўфіналы і фінал міжнароднага конкурсу, а пасля прапанаваць яму выправіцца, напрыклад, у Львоў ці Адэсу", — падзяліўся планамі візаві.

К

Паэт тонкага шкла бакала

Дызайнер з Фінляндыі Ціма Сарпанева: мінскі візіт

У 1974 годзе ў дызайнераў Мінска была вялікая падзея — з Фінляндыі прыехала выстава самага знакамітага на той час фінскага дызайнера Ціма Сарпаневы. Са сваёй выставай павінен быў наведаць беларускую сталіцу і сам выдатны майстар. Тады, у 1974-м, гэтага гонару ўдастоіліся толькі тры гарады Савецкага Саюза — Масква, Мінск і Тбілісі.

Трэба сказаць, што гэта быў час, калі ў Беларусі стаў інтэнсіўна развівацца дызайн. У 1966-м быў толькі-толькі арганізаваны беларускі філіял Усесаюзнага навукова-даследчага інстытута тэхнічнай эстэтыкі (УНДІТЭ), у 1967-м у Беларускім дзяржаўным тэатральна-мастацкім інстытуце адкрылі кафедру прамысловага мастацтва (і праз пяць гадоў быў першы выпуск айчынных дызайнераў, многія з якіх прыйшлі працаваць у той самы філіял). Хутка на фоне ўсяго савецкага дызайну наша ўстанова да 1970-х заняла ўжо лідарскія пазіцыі. У арсенале распрацовак былі праекты трактароў, буйных сельскагаспадарчых машын, комплексныя рашэнні па арганізацыі вытворчага асяроддзя прамысловых прадпрыемстваў. Заказчыкі ж былі з усіх канцоў СССР.

Вялася ў айчынным філіяле УНДІТЭ і дызайнерская распрацоўка тавараў народнага спажывання. Акрамя таго, у Беларускім канструктарска-тэхналагічным інстытуце мясцовай прамысловасці быў арганізаваны моцны мастацка-канструктарскі аддзел, які ствараў дызайн культурна-бытавых і гаспадарчых вырабаў для прадпрыемстваў рэспублікі. Працавалі дызайнерскія службы і на прамысловасці: на Мінскім аўтазаводзе, вытворчым аб'яднанні "Гарызонт", Беларускім оптыка-механічным аб'яднанні і іншых. Менавіта дасягненні маладога беларускага дызайну, напэўна, і сталі прычынай таго, што, акрамя Масквы і Тбілісі, выстава знакамітага фінскага дызайнера была наладжана яшчэ і ў Мінску.

Але хто такі Ціма Сарпанева, дызайнер, пра якога ў 1970-я гаварылі ва ўсім свеце? Нарадзіўся ён у 1926-м у Хельсінкі. У 1949 годзе Сарпанева скончыў аддзяленне графічнага дызайну Цэнтральнай школы мастацтваў і рамёстваў (зараз — Вышэйшая школа мастацтваў, дызайну і архітэктуры Універсітэта Аалта). У 1951-м стаў працаваць на шкляной фабрыцы "Італа", і хоць Ціма распрацоўваў для гэтага прадпрыемства знакаміты лагатып (белая малая літара "і" на фоне чырвонага круга), аказалася, што не графічны дызайн галоўнае прызванне Сарпаневы. Дызайнер стаў паспяхова займацца распрацоўкай прамысловых вырабаў спачатку са шкла, а потым і з іншых матэрыялаў: металу, парцаляны і гэтак далей. Яго персанальныя выставы прайшлі ў Стакгольме і Капенгагене, Нью-Ёрку і Лондане, Парыжы і Токіа. Ён першым з дызайнераў у 1967 годзе атрымаў у Лондане ганаровую ступень доктара Каралеўскага каледжа мастацтваў. Галіна прафесійных інтарэсаў Сарпаневы — дызайн прадметаў побыту. Рэчы, якія ён ствараў, былі рацыянальныя па форме, максімальна карысныя і надзейныя і, у той самы час, каб дасягнуць максімальнага выніку ў стварэнні новай, арыгінальнай формы вырабу. Напрыклад, Сарпанева даў прапанову ўкараніць на шкляной фабрыцы "Італа" новую аўтаматычную лінію, якая прынесла фірме вялікія эканамічныя выгоды. "У такіх выпадках, як і ва ўсякай рэвалюцыі, мне дапамагала вера ў сваю праўду", — казаў дызайнер. Дарэчы, Сарпанева атрымаў багата патэнтаў на свае тэхнічныя вынаходніцтвы. Так, для тэкстыльнай прамысловасці ён распрацаваў спосаб нанясення двухбаковага малюнка на тканіну любой якасці, які атрымаў назву "амбіентэ".

Сарпанева працаваў у розных сферах дызайну: праектаваў замкі, дзвярныя зашчапкі, наборы свяцільняў з модульнай пабудовай формы. Больш за ўсё дызайнер любіў праектаваць посуд. Пры гэтым нярэдка ён выкарыстоўваў самыя нечаканыя для такога кшталту рэчаў матэрыялы ці спалучэнні матэрыялаў: напрыклад, блюда з нержавеючай сталі, парцалянавы супнік са стальной ручкай... Усе гэтыя рэчы мелі моцную, рацыянальную форму, аўтар цалкам пазбаўляў іх якіх-небудзь упрыгожанняў. Але яны вылучаліся дзіўнай цеплынёй і гарманічнасцю знешняга выгляду. У сваёй творчасці Сарпанева абапіраўся на старадаўнія традыцыі фінскай народнай матэрыяльна-мастацкай культуры, натхняўся народнымі вырабамі, такімі блізкімі да прыроды. "Мы гаворым няпраўду, — казаў дызайнер, — калі называем стары бабулін кацялок непрыгожым, ён быў зроблены тады, калі чалавек жыў пад дыктоўку прыроды. Гэты кацялок і быў сапраўды дызайнерскім вырабам, нездарма мы захоўваем цяпер падобныя рэчы ў музеях…"

Але вернемся да мінскай выставы Сарпаневы 1974 года. Яна праходзіла ў выставачнай зале беларускага філіяла УНДІТЭ. У экспазіцыі было паказана шырокае кола вырабаў фірм Фінляндыі, Швецыі, ФРГ. Гэта дэкаратыўныя тканіны, дзверы і дзвярная фурнітура, шкляны, фарфоравы і металічны посуд, мэбля і іншыя прадметы. Сам Сарпанева падкрэсліваў тое значэнне, якое ён надаваў працы фінскіх дызайнераў за мяжой: гэта дае магчымасць параўнаць свае дасягненні з дасягненнямі калег, дапамагчы зберагчыся ад небяспекі вынаходніцтва веласіпеда і, канечне ж, гэта дае яшчэ адну магчымасць пераканаць прамысловасць розных краін у неабходнасці плённага служэння адна адной.

Манціроўкай мінскай экспазіцыі, як і маскоўскай, і тбіліскай, займаўся сам Сарпанева, які заўсёды рабіў свае выставы самастойна. І выстава ўяўляла з сябе твор мастацтва. Так, шкляны і металічны посуд быў змешчаны пад вялікімі празрыстымі паўсферычнымі каўпакамі, дзякуючы чаму экспанаты набывалі загадкавы, ірэальны выгляд. Наогул Сарпанева меў вялікі вопыт стварэння выставачных экспазіцый. Па яго праектах афармляліся фінскія нацыянальныя выставы прыкладнога мастацтва і дызайну ў Англіі, Бразіліі, Галандыі, Швецыі, а таксама павільёны Фінляндыі на міжнародных выставах "Трыенале" ў Мілане і "Экспа-67" у Манрэалі.

Безумоўна, усе нашы дызайнеры наведалі выставу. Але самым цікавым было тое, што ў канферэнц-зале Беларускага філіяла УНДІТЭ была прызначана сустрэча з выдатным фінскім дызайнерам. Мне таксама дасталося запрашэнне на сустрэчу. Зала была поўная, усе чакалі знакамітага госця. І вось разам з намеснікам дырэктара інстытута Альбертам Мельнікавым уваходзіць ён — высокі, элегантна апрануты чалавек з невялікай рудаватай бародкай, з ім прыгожая, стройная маладая жанчына — яго жонка. Павітаўшыся, Сарпанева з дапамогай перакладчыка пачаў расказваць пра сябе, пра дызайн, пра сваё бачанне прафесіі. Потым пайшлі пытанні. Было вельмі цікава, сустрэча цягнулася больш за гадзіну. У канцы Сарпанева сказаў, што хоча на памяць аб гэтай сустрэчы пакінуць каму-небудзь з прысутных адзін са сваіх твораў — вялікае металічнае блюда. Для гэтага ён прапанаваў наладзіць латарэю. Была прыдумана нейкая хітрая сістэма (дакладна ўжо не памятаю якая), што адзін з запрашальных білетаў на сустрэчу павінен быў выйграць прыз. Я таксама, як і ўсе, спадзяваўся на выйгрыш. Але, на жаль, шчасце аказалася не на маім баку. Адзін жа з прысутных дызайнераў атрымаў з рук вялікага фінскага майстра каштоўны падарунак. Але памяць ад гэтай сустрэчы ў мяне ўсё ж засталася — я падышоў да знакамітага госця і папрасіў, каб ён

Коні Плейстацэну з ракі Сож

У рамках экспазіцыі "Адкрытае захоўванне археалагічных фондаў музея" ў вежы палаца Румянцавых і Паскевічаў працуе міні-выстава "Эпоха гігантаў: таямніца рэканструкцыі набярэжнай р. Сож". Яна стала лагічным працягам леташняй міні-выставы "Эпоха гігантаў: знаходкі мегалацэраса ў Гомелі".

Выява каня з пячоры Ласко.

Вітрына міні-выставы ў Гомелі.

Год таму гамяльчане ўбачылі абноўленую набярэжную ракі Сож. У ходзе яе рэканструкцыі былі зроблены розныя музейныя знаходкі, якія хаваліся на дне. У канцы 2015-га наведвальнікам музея былі прадстаўлены археалагічныя артэфакты на выставе "Новае ў археалогіі Гомельшчыны", сабраныя ў перыяд рэканструкцыі. Але акрамя археалагічных, былі знойдзены і палеанталагічныя знаходкі, на якія радзей за ўсё звяртаюць увагу будаўнікі. Не падазраючы, што перад імі знаходкі, якія хаваюць таямніцы вымерлай гомельскай фаўны, яны, на жаль, проста выкідваюць іх, звяртаючы ўвагу толькі на косткі вялікіх памераў.

За працай па рэканструкцыі набярэжнай сачылі супрацоўнікі аддзела археалогіі Гомельскага палацава-паркавага ансамбля. Даследчыкамі было знойдзена больш за дзясятак касцяных парэштак прадстаўнікоў старажытнай фаўны. Больш за ўсё было выяўлена костак каня (equus caballus), які жыў у тыя часы, калі на тэрыторыі Беларусі хадзілі маманты. Варта згадаць, што костка маманта таксама была выяўлена. Здавалася б, што конь у нашы дні — не рэдкасць, але ж не кожны дзень можна ўбачыць рэшткі дзікага каня, якому не адзін дзясятак тысяч гадоў!

Коні Плейстацэну былі распаўсюджаны на ўсёй тэрыторыі Еўропы. Іх рэшткі вельмі часта знаходзяць на месцы стаянак старажытных людзей. Гэта даводзіць, што жывёла станавілася прадметам палявання. А ў канцы Верхняга Плейстацэну конь стаў адной з галоўных мэтаў у паляванні чалавека. Невыпадкова ў пячорах даследчыкі выяўляюць розныя наскальныя малюнкі гэтай жывёлы. Яскравым прыкладам можна лічыць пячору Ласко ў Францыі, дзе конь намаляваны ў так званай "зале быкоў", "восевым праходзе", "каціным лазе" і "шахце". Дарэчы, дзякуючы наскальнаму жывапісу, навукоўцы рэканструе-

Пошук артэфактаў на левым беразе ракі Сож падчас рэканструкцыі набярэжнай. 2015 год.

падкінуў мне аўтограф на каталозе яго выставы з вялікім партрэтам на вокладцы. Гэты партрэт з аўтографам і цяпер стаіць на паліцы кніжнай шафы ў маёй кватэры.

Знакаміты госць з'ехаў, але мне праз год пашчасціла ўбачыцца з ім ізноў. У 1975 годзе ў Маскве адбыўся чарговы кангрэс ІКСІД — міжнароднага саюза дызайнерскіх арганізацый. Такія імпрэзы праводзяцца ў розных гарадах кожныя два гады. Я, тады ўжо аспірант УНДІТЭ, удзельнічаў у маскоўскім кангрэсе. Гэта была вялікая падзея для савецкай дызайнерскай грамады. Тады ў Маскву з'ехаліся майстры са ўсяго свету, былі сярод іх і вельмі знакамітыя асобы, такія як заснавальнік вядомай Ульмскай школы дызайну Томас Мальданада, зорка японскага дызайну Кэндзі Экуан і многія іншыя. Прыехаў на кангрэс і наш знаёмы Ціма Сарпанева. У зале пасяджэнняў я яго бачыў толькі здаля, але на заключным банкеце ў рэстаране ён падышоў з бакалам да століка, дзе сядзелі беларускія дэлегаты кангрэса, і сказаў, што памятае цёплы прыём у Мінску і жадае беларускім дызайнерам плёну ў іх творчасці.

У самога Сарпаневы напярэдадні тады было яшчэ тры дзясяцігоддзі паспяховай работы. У апошнія гады ён у асноўным займаўся скульптурай. Памёр вялікі дызайнер у 2006 годзе, не дажыўшы менш за чатыры тыдні да свайго васьмідзесяцігоддзя. Ён сапраўды быў паэтам дызайну, паэтам побытавай рэчы. "Тайна творчай працы, — казаў Сарпанева, — ляжыць у чаканні, якое можа цягнуцца адно імгненне ці ўсё жыццё. Форма — гэта рэлігія. Ад тонкага шкла бакала такі ж вялікі шлях да эстэтычнага перажывання, як і ад вялікай карціны. Можа быць, у першым выпадку ён карацейшы: паўсядзённыя рэчы, як і сумесныя абеды, не абцяжараны якой-небудзь эстэтычнай прадузятасцю".

Якаў ЛЕНСУ,
кандыдат мастацтвазнаўства

Карл Брулоў. "Партрэт музыканта Мацвея Віельгорскага". 1828 год.

Лідзія Русланава. Канец 1950-х.



Ілья Рэпін. Партрэт мастака Васіля Сварога. 1915 год.

"Нягледзячы на подпіс, карціна сапраўдная..."

Феномен Алены Аладавай

Барыс Кустодзіеў. "Купчыха з пакупкамі". 1920 год.

(Працяг. Пачатак у №№ 37 — 41.)

Сёння "К" працягвае распавядаць пра ўнікальную асобу ў гісторыі нацыянальнай культуры — Алену Аладаву.

Барыс КРЭПАК

Аладава ведала многіх найбуйнейшых музейшчыкаў, рэстаўратараў і калекцыянераў краіны. Сярод іх — Марына Антонава, Васіль Пушкароў, Мікалай Машкоўцаў, Аляксандр Корын, Мікалай Уласаў, Савелій Ямшчыкоў, Абрам Шустар, Ілья Зільберштэйн, Барыс Антаноўскі, Мікалай Памяранцаў, Капіталіна Фралова, Міхаіл Лібман, Рыгор Блох, Лідзія Русланава — усіх не пералічыць. А колькі вядомых і выдатных мастакоў, мастацтвазнаўцаў, артыстаў (за межамі Беларусі) былі ў яе сябрах: Надзя Хадасевіч-Лежэ, Вітольд Бялыніцкі-Біруля і яго жонка Алена Аляксееўна, Ігар Грабар, Аляксей Савінаў, Марына Арлова, Якаў Ромас, Георгій Ніскій, Уладзімір Фаворскі, Фёдар Мадораў, Міхаіл Керзін, Аляксандр Грубэ, спявачка Марыя Максакава.

У маскоўскай кватэры Лідзіі Русланавай аднойчы пабываў і я разам з Аладавай, якая у знакамітай апальнай спявачкі, што адсядзела ў ГУЛАГу больш за 10 гадоў, выгандлявала тады два ці тры творы знакамітых рускіх перасоўнікаў. Лідзія Андрэеўна ўсадзіла нас за стол, пакрыты беласнежным абрусам, паставіла ў вялікую вазу ружы, якія мы прынеслі, і дзве пляшкі калекцыйнага французскага каньяку. Потым з'явілася шыкоўная халодная закуска і тры бутэлькі... кефіру. "Ведаеце, дарагія мае, я люблю каньяк запіваць кефірам... Паспрабуйце, вельмі карысна для здароў'я".

Канешне, запомніліся жывапісныя творы, якія былі паразвешаны аж у тры шэрагі на сценах двух пакояў: ад Айвазоўскага да Рэпіна. Вялікае ўражанне ў гасцінай Русланавай зрабіў на нас таксама шыкоўны белы трафейны раяль. Потым, калі мы ўжо выходзілі, Алена Васільеўна шапнула мне: "Божа мой, былі б грошы, угаварыла б Лідзію Андрэеўну прадаць гэты чароўны інструмент для нашага музея..."

Мы прабылі ў Русланавай, мабыць, гадзіны дзве ці нават больш, шмат аб чым было сказана, усяго не запомніў, але нейкія фрагменты засталіся ў галаве. Лідзія Андрэеўна, напрыклад, распавяла, як яшчэ да вайны была запрошана ў Крэмль да Сталіна. Пасля невялічкага канцэрта, у якім удзельнічалі яна, басы Максім Міхайлаў і Марк Рэйзэн, а "дырыжорам" быў Клімент Варашылаў, Сталін падзякаваў Русланавай за песні "Во поле березонька стояла" і "Волжская бурлацкая". А потым запрасіў яе да стала, дзе сядзелі члены Палітбюро: "Садыцеся, таварищ Русланава, угасчайтэсь..." І тады Лідзія Андрэеўна быццам бы адказала: "Я ж сытая, Іосіф Вісарыёнавіч, вы бы сваякоў маіх у Саратаве пакармілі. Вельмі галадаюць..." Сталін ад нечаканасці толькі і вымавіў: "Рэчыстая..." З той пары ў Крэмль яе больш ніколі не запрашалі. Але ці так было насамрэч — сказаць складана...

Потым доўга расказвала, як ствараліся знакамітыя "Валёнкі". І калі я паспрабаваў, з юнацкім максімалізмам, трошкі падшафэ, мякка запярэчыць ёй, што гэтыя "Валёнкі" яшчэ да рэвалюцыі спявала цыганка Насця Палякова, а да вайны — Ніна Дулькевіч і Макарава-Шаўчэнка (я недзе чытаў пра гэта), Аладава мяне ціхенька абцягнула за штаніну. Але было позна — Русланава выбухнула: "Вы, малады чалавек, не першы, хто пра гэта заяўляе! Адказваю: якія цыганкі і дулькевічы? Якія там шаўчэнкі? Я — аўтар, і ніхто іншы!!! Я сама склала і сама спявала тую песню! Усё астатняе — выдумкі маіх ворагаў!.." Алена Васільеўна яе супакоіла: "Канешне ж, шаноўная Лідзія Андрэеўна, вы зрабілі гэты шэдэўр! А Барыса Аляксеевіча проста ўвялі ў зман вашы зайздросніці. Вы ж на яго не крыўдуйце — моладазелена..." Русланава імгненна прыціхла. І пасля трэцяй ці чацвёртай па ліку чаркі, не звяртаючы на мяне аніякай увагі, ціха праспявала куплет з вядомай песні: "Я б вам пела да и плясала, // Да уж больно я устала. // Уморилась, уморилась, уморилася. // Знамо дело, уморилась, уморилася..." Мне падалося, што гэта нейкі намёк на тое, што аўдыенцыю пара заканчваць... Але пакуль я моўчкі разглядваў насценную калекцыю, размова Аладавай і Русланавай набыла ўжо строга дзелавы характар наконт набыцця некалькіх твораў рускіх перасоўнікаў і працягвалася яшчэ каля гадзіны...

Ведаю, што трошкі пазней у Русланавай гасцявалі зноў жа Аладава, але тым разам з міністрам культуры БССР Юрыем Міхневічам і Вікта-

Амандус Адамсон. "Апошні ўздых карабля". 1902 год.

рам Грамыкам, тагачасным кіраўніком нашага Саюза мастакоў, які пакінуў свае цікавыя ўспаміны пра візіт. Прывяду маленькі фрагмент: "Перад растаннем адбылася такая кароткая размова. Міністр паведаміў, што партрэт мастака Сварога пэндзля Рэпіна купляецца, калі Лідзія Андрэеўна пагаджаецца з ацэнкай экспертнага савета, а дзве іншыя работы будуць разгледжаны трошкі пазней. Акт на іх часовае захоўванне — у Алены Васільеўны. "З цаной на Сварога згодная, — сказала Русланава. — А з актамі ад'язджайце ў Мінск. Не крыўдзіце мяне. Работы ў Алены Васільеўны захоўваюцца ўжо тры гады нават без усялякай распіскі. Я шчаслівая, што ў мяне такая сяброўка — сапраўдная беларуска, да таго ж — паляшучка!"

Дарэчы, здаецца, у 1957 годзе, Аладава набыла ў Русланавай карціну Барыса Кустодзіева "Купчыха з пакупкамі", здаецца, за 2500 рублёў і яшчэ як бясплатны дадатак невялічкую кампазіцыю эстонскага і расійскага скульптара другой паловы XIX — пачатку XX стагоддзяў Амандуса Адамсона "Апошні ўздых карабля". Тады гэта былі грошы — вартасць паловы аўтамабіля "Волга", які пасля грашовай рэформы 1961 года каштаваў, калі не памыляюся, 5 тысяч рублёў. Сёння на аўкцыёне "Sotheby's" любая работа Кустодзіева каштуе ў межах мільёна і больш фунтаў стэрлінгаў. Скажам, некалькі гадоў таму "Вясковы кірмаш" быў прададзены за 2 мільёны 841 тысячу фунтаў стэрлінгаў. А ў мінулым годзе невялічкая карціна "Купчыха" — за 125 тысяч брытанскіх фунтаў. А колькі каштуе "Волга"?

К

Працяг чытайце **ў наступных нумарах.**

явалі вонкавае аблічча старажытных коней.

У калекцыі Гомельскага палацава-паркавага ансамбля захоўваецца больш за дзясятак костак гэтай жывёлы, знойдзеных на тэрыторыі горада — у раёне Валатавы, абласной бальніцы, Асаўцоў, набярэжнай ракі Сож, дзе падчас яе рэканструкцыі найбольшая колькасць астанкаў. На выставе прадстаўлена 8 палеанталагічных артэфактаў, якія належаць equus caballus. Сярод іх фрагменты верхняй і ніжняй сківіцы з зубамі; прамянёвая, плечавая, пястная, вялікая галёначная косткі, пяяснічны пазванок і фрагмент таза.

Дадзеная міні-выстава з'яўляецца не апошняй з серыі "Эпоха гігантаў". У далейшым супрацоўнікі аддзела археалогіі гомельскага палацава-паркавага ансамбля прадставяць і іншыя палеанталагічныя артэфакты з калекцыі музея.

Юрый ПАНКОЎ,
гісторык, супрацоўнік Гомельскага палацава-паркавага ансамбля

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. Леніна, 20.
Тэл.: 327 45 62.
Экспазіцыі:
■ "Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XIX — пач. XXI стст.".
■ "Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.". (У рамках экспазіцыі — выстава **"Вялікая Айчынная вайна ў мастацтве"**, прысвечаная 70-годдзю Вялікай Перамогі.)
■ "Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.".
■ "Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.".
■ **"Вайна і Перамога ў творчасці мастакоў XX стагоддзя"**.
Выставы:
■ Выстава твораў рускага жывапісу XIX—XX стст. са збору расійскага калекцыянера Аляксандра Валадчынскага — да 6 лютага 2017-га.
■ Выстава **"Некалькі словаў пра пастэль"** Ларысы Журавовіч — да 7 лістапада.
■ Выстава **"Свет нябесны на зямлі"** (творы царкоўнага мастацтва XVII — XXI стст.) — да 30 студзеня 2017-га.
■ Выстава **"Мастацтва будызму"** з фондаў Дзяржаўнага Эрмітажу — да 9 лістапада.

Філіялы музея
МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА І-й ПАЛОВЫ XIX ст."
г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 88 78.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Інтэр'еры шляхецкай сядзібы"**.
■ **"Жыццё і творчасць Валенціна Ваньковіча"**.
■ **"Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст."**.
МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ
Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 69.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Беларуская лялька"** з фондаў клуба фальклорнай і народнай лялькі "Папараць-кветка".
■ Кожную суботу ў 12.00 — майстар-класы па стварэнні лялек-мотанак, ткацтве паясоў, саломкапляценні і роспісе яек.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 226 09 22.
Экспазіцыі:
■ Абноўленая экспазіцыя **"Старажытная Беларусь"**.
■ "Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".
■ "Мастацтва ў гарадской культуры XIX — XX стст.".
Выставы:
■ Выставачны праект **"Ад рымскага дынарыя да беларускага рубля"**.
■ Выстава **"Прыватная калекцыя"** Кацярыны Ражджэвенскай (Масква) — да 30 кастрычніка.
■ Выстава **"PaVetra. Водар роднага краю"** — да 23 кастрычніка.
■ Акцыя **"Вольнае пяніна"** — кожны дзень з 16.00 да 19.00.
■ Інтэрактыўны праект **"Лазерны лабірынт"** — да 30 кастрычніка.
Філіялы музея
ДОМ-МУЗЕЙ І З'ЕЗДУ РСДРП
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.
Экспазіцыі:
■ "Мінск губернскі ў канцы XIX — на пачатку XX стст.".
■ "І З'езд РСДРП у асобах".
■ "Жандарскі вышук у царскай Расіі".
■ "Гісторыя Дома-музея І З'езду РСДРП".
■ Выстава ўнікальных рэалістычных фігур **"Свет старажытных людзей"** — да 4 снежня.
МУЗЕЙ СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 38.
Тэл.: 327 46 12.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь"**.
МУЗЕЙ ПРЫРОДЫ І ЭКАЛОГІІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, вул. К.Маркса, 12.
Тэл.: 237 46 94; 291 99 51.
Экспазіцыі:
■ "Геалогія і палеанталогія".
■ "Сезонныя змены".
■ "Вадаёмы і насельнікі прыбярэжных раслін".
■ "Хвойны тып лесу і насельнікі змяшанага лесу".
■ "Насельнікі ліставога і змяшанага лесу".
■ "Ахоўныя прыродныя ўчасткі, рэдкія віды жывёл".
■ "Выстава насякомаедных раслін".
г. Мінск, вул. Багдановіча, 9а.
Тэл.: 237 46 94.
■ Выстава **"Шумлівая пярнатая вясёлка"** — да 13 сакавіка 2017-га.
г. Мінск, вул. Казінца, 117 (будынак кінатэатра "Электрон"). Тэл.: +37529 123 60 53.
■ Незвычайны атракцыён **"Стужкавы лабірынт"** — да 31 снежня.
■ Выстава **"Усё жыццё ў адным ровары"** — да 14 лістапада.
■ Выстава **"Сафары парк"**.
МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ТЭАТРАЛЬНАЙ І МУЗЫЧНАЙ КУЛЬТУРЫ
г. Мінск, Музычны зав., 5.
Тэл.: 220 26 67.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ "Вытокі тэатральнай і музычнай культуры на беларускіх землях".
■ "Музычная і тэатральная культура Беларусі ў X — XIX стст.".
■ "Беларуская музычная культура XX ст.".
■ "Тэатральная культура Беларусі XX ст."
Выставы:
■ Фотавыстава **"Выварат"** Ганны Кандрацьевай і Ганны Семянюк) — да 30 кастрычніка.
ГАСЦЁЎНЯ УЛАДЗІСЛАВА ГАЛУБКА
г. Мінск, вул. Старавіленская, 14. Тэл.: 286 74 03.
■ Пастаянная экспазіцыя.
Майстар-класы:
■ **Дэкупаж** для творчых дзяцей і падлеткаў ад 5 да 14 гадоў — кожную суботу аб 11-й.
Выстава:
■ **"Займальная геаграфія"** — да 31 кастрычніка.
МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА КІНО
г. Мінск, вул. Свярдлова, 4.
Тэл.: 327 10 75.
Экспазіцыя:
■ "Беларускі кінематограф як нацыянальная каштоўнасць".
■ Выстава аўтарскіх галаўных убораў **"Капялюшны вернісаж-2016"** — да 30 кастрычніка.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ
г. Мінск, пр-т Пераможцаў, 8.
Тэл: 327 11 66; 203 07 92.
Музей працуе:
пн. — выхадны,
аўт. — нядз. — ад 10-й да 18-й,
сер. — ад 12-й да 20-й.
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава серыі карцін **"Лічбы на сэрцы"** Героя Беларусі, народнага мастака СССР і Беларусі, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Міхаіла Савіцкага — да 29 кастрычніка.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19.
Тэл.: (8–01770) 2 06 60, 2 06 02;
+ 37529 551 80 51,
+ 37529 190 31 49.
Палацавы ансамбль
■ Пастаянная экспазіцыя.
■ Выстава **"Спадчына Святой Еўфрасінні Полацкай"** — да 15 студзеня 2017-га.
Сектар экскурсійнай і інфармацыйнай дзейнасці
■ Выстава **"INSPIRATION"** Марыны Канавалавай — да 3 снежня.
Ратуша
■ Пастаянная экспазіцыя.

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"
г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць.
Тэл.: (8–01596) 2 82 91,
(8–01596) 2 82 70.
■ Пастаянная экспазіцыя
■ Выстава **"На варце. З гісторыі формы СССР"** — да 15 студзеня 2017-га.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА
г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5.
Тэл.: 294 91 96.
Экспазіцыі:
■ **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
■ Інтэрактыўная гульня **"Таямніцы дома Песняра"**.
■ Тэатралізаваныя экскурсіі па казках, апрацаваных Якубам Коласам, для школьнікаў малодшага ўзросту.
■ Музейна-педагагічны праект **"Крочым у школу разам з Коласам"**.
■ Пешая экскурсія **"Мясцінамі Коласа ў Мінску"**.
Акцыі:
■ **"Самы лепшы дзень"** (дзень нараджэння ў музеі).
■ Віншаванне ад музея, фотасесія **"У дзень вяселля — у музей!"**.
■ Музейная творчая майстэрня.
■ Творчы вечар пісьменніка Ганада Чарказяна **"Знайсці сваю дарогу ў жыцці"** — 18 кастрычніка. Пачатак а 16-й.

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ
г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4.
Тэл.: 327 78 66.
Экспазіцыі:
■ Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце і інтэрактыўнай зонай для дзяцей **"Хлопчык і лётчык"**, галаграфічным тэатрам.
Акцыі:
■ Інтэрактыўныя музейныя праграмы **"У пошуках папараць-кветкі"**, **"Вячоркі"** для ўсіх катэгорый наведвальнікаў.
■ Фотавыстава Міхаіса Міцкевіча **"Мілыя вобразы"** — да 15 кастрычніка.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА МІНСКА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.
Філіялы Музея гісторыі горада Мінска
ГАРАДСКАЯ МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ ТВОРАЎ Л.Д. ШЧАМЯЛЁВА
г. Мінск, вул. Рэвалюцыйная, 10. Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыя:
■ **"Жыццёвы і творчы шлях народнага мастака Беларусі Леаніда Шчамялёва"**.
■ Выстава дзіцячых малюнкаў ў рамках міжнароднага мастацкага праекта **"Дзеці вітаюць дзяцей"** — да 6 лістапада.
МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ МІХАІЛА САВІЦКАГА
г. Мінск, пл. Свабоды, 15.
Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыі:
■ **"Мастак. Грамадзянін. Герой"**. Прысвечана Ганароваму грамадзяніну г. Мінска Міхаілу Савіцкаму.
■ Рэканструкцыя інтэр'ераў былога сядзібнага дома **"Мінск губернскі. Шляхецкі побыт"**.
■ Выстава **"Бенедыкт Тышкевіч. Вяртанне"** — да 16 кастрычніка.
■ Выстава **"Брама — Парог — Дзверы"** Уладзіміра Савіча — з 18 да 30 кастрычніка.
МІНСКАЯ ГАРАДСКАЯ РАТУША
г. Мінск, пл. Свабоды, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыі:
■ **"Мінск у гістарычнай прасторы. Картаграфічны кабінет"**.
■ **"Мінск сярод сяброў. Гарады-пабрацімы сталіцы Беларусі"**.
МУЗЕЙ "ЛОШЫЦКАЯ СЯДЗІБА"
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 8.
■ Пастаянная экспазіцыя.
ФЛІГЕЛЬ ЛОШЫЦКАГА СЯДЗІБНА-ПАРКАВАГА КОМПЛЕКСУ
г. Мінск, праезд Чыжэўскіх, 10.
Тэл.: 285 18 86.
Экспазіцыя:
■ **"Кола часу"** — прадметы гарадской і сялянскай культуры кан. XIX — сяр. XX стст.
■ Выстава **"Мастацкія палотны "Мінскае палатно-Пакроў"** (мастацкія палотны, ручнікі, швейныя машыны).
ЭКСПАЗІЦЫЯ "КАРЭТНАЯ"
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 18. Тэл.: 321 24 30.
Экспазіцыі:
■ "Сані • вазок; каляска • брычка; карэта • вупраж" (пастаянная экспазіцыя па гісторыі гужавога транспарту жыхароў Мінска XIX — пачатку XX стст.).
■ Віртуальная гульня **"Карэтны майстар"**.
АРТ-ГАСЦЁЎНЯ "ВЫСОКАЕ МЬСТА"
г. Мінск, вул. Герцэна, 2а.
Тэл.: 321 24 30.
■ Выстава жывапісу **"Тэлефонная размова"** Андрэя Якубава і Тамары Шэлест — да 16 кастрычніка.
■ Фотавыстава **"НеМой Минск"** Алены Шаліма — з 20 кастрычніка да 20 лістапада.
АРХЕАЛАГІЧНЫ МУЗЕЙ
г. Мінск, вул. Кірылы і Мяфодзія, 6. Тэл.: 321 24 30.
■ Выставачна-адукацыйны праект **"Па слядах мамантаў"** — да 15 студзеня 2017-га.

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ
г. Гомель, пл. Леніна, 4.
Тэл.: (8-0232) 74 19 11.

Цэнтральная частка палаца
Экспазіцыі:
■ **"Культавыя прадметы"** ("Дамавая царква", паўночны рызаліт палаца).
■ **"Чырвоная гасцёўня"**.
■ **"Зала ўрачыстых прыёмаў"**.
■ **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя).
■ **"Жылы інтэр'ер канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ **"Свет прыроды"** (выставы "Загадкавыя фантазіі мора" і "Жывёльны свет Гомельшчыны") (грот палаца).
■ **"Адкрытае захаванне археалагічнай калекцыі музея"** (у яе рамках — выстава **"Эпоха гігантаў: таямніца рэканструкцыі набярэжнай ракі Сож"**).
Выставы:
■ Выстава **"Біблейскія і міфалагічныя сюжэты ў заходнееўрапейскім мастацтве XVII — XIX стст."** (творы жывапісу, скульптуры і графікі з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь) — да 13 лістапада.
■ Выстава **"Відавочнае і неверагоднае: оптыка"** (30 унікальных экспанатаў з Цэнтра навукі Каперніка ў Польшчы) — да 30 кастрычніка.
■ Выстава **"Гісторыя адной капялюшынкі"** — да 13 лістапада.
■ Выстава плакату Рышарда Кай **"Плакаты вельмі польскія"** (праект арганізаваны пры садзейнічанні Польскага інстытута ў Мінску) — да 30 кастрычніка.
■ Інтэрактыўны праект **"Лазерны лабірынт"**.
Вежа палаца
Экспазіцыя:
■ **"Уладальнікі Гомельскага палаца Румянцавы і Паскевічы"**.
Выставы:
■ Міні-выстава да 95-годдзя з дня нараджэння беларускага мастака Мікалая Палянкова.
■ Выстава **"Эпоха гігантаў: таямніца рэканструкцыі набярэжнай ракі Сож"** — да 31 снежня.
Паўночнае крыло палаца
Экспазіцыя:
■ **"Zooterra"**.
Выстава:
■ Выстава **экзатычных жывёл**.
Зімовы сад
■ **"Свет субтрапічных раслін і жывёл"**.
Вежа агляду.
Спачывальня князёў Паскевічаў.
■ Інтэрактыўны праект для школьнікаў **"Вялікі музей для цікаўных сяброў"**.

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ
г. Гомель, вул. Пушкіна, 5.
Тэл.: (8-0232) 77 57 41.
■ Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
■ Пастаянная выстава тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
■ На тэрыторыі працуе пнеўматычны цір.
■ **"Музей крыміналістыкі"**.
■ Выстава **"І памяць сэрца гаворыць"**.
■ Выстава **"Мы ўспомнім зноў мінулую вайну..."**
■ Выстава **"Зброя для моцных духам"**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ
г. Ліда, вул. Перамогі, 37а.
Тэл.: (8-0154) 53 50 64.
Пастаянныя экспазіцыі:
■ **"Прырода Лідчыны"**.
■ **"Сучаснае мастацтва краю"** (жывапіс, графіка, скульптура, мастацкае шкло).
Выставы:
■ Выстава **"Майстэрня заслужанага дзеяча мастацтваў Беларусі, сябра Саюза мастакоў Беларусі Уладзіміра Мурахвера"**.
■ **"Вядзём пачатак мы ад Гедыміна..."**.
■ Мемарыяльны пакой **Валянціна Таўлая**.
■ Выстава са збору А.Фішбайна **"Рэчы побыту канца XIX — пачатку XX стст."**.
■ Музейна-вобразная зала **"Хрушчоўка 60-х"**.
■ Выстава **"Вайны свяшчэнныя старонкі"**.
■ Выстава **"Надзейны шчыт краіны"**.
■ Выстава **"Падарожжа ў гарадскі і сельскі побыт"**.
■ Выстава **"Жыве мая ліра нанова!"**, прымеркаваная да 140-годдзя з дня нараджэння Цёткі (Алаізы Пашкевіч).

ІЎЕЎСКІ МУЗЕЙ НАЦЫЯНАЛЬНЫХ КУЛЬТУР
г. Іўе, вул. 17 верасня, 9.
Тэл. (8-01595) 2-68-96
■ Экспазіцыя **"Пад адзіным небам праз стагоддзі"** ("Карэннае насельніцтва Іўеўшчыны", "Беларускія татары").
■ Выставы **"Страчаная спадчына яўрэйскай культуры"**, **"Мой край не мінула вайна"**.
■ Выстава Марыі Васюкевіч **"Дамінанта майго жыцця... Родныя рэчы"**.
■ Прадстаўленні лялечнага тэатра "Батлейка".

ГАЛЕРЭІ

"УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"
г. Мінск, пл. Кастрычніцкая, 1.
Тэл.: 327 26 12.
■ Выстава дыпломных работ **"Крокі да майстэрства"** навучэнцаў мастацкага аддзялення Магілёўскага дзяржаўнага каледжа мастацтваў — з 17 да 31 кастрычніка.

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА
г. Мінск, вул. Казлова, 3.
Тэл./факс: 290 60 10.
■ Выстава-продаж сучаснага мастацтва **"Восеньскі салон з "Белгазпрамбанкам"** — да 30 кастрычніка.

ТЭАТРЫ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, 1.
Тэл./факс: 334 11 56.
■ **15 — "Лятучы Галандзец"** (опера ў 3-х дзеях) Р.Вагнера.
■ **16 — "Каханне і Смерць"** (балет у 2-х дзеях) П.Бюльбюль аглы. Прэм'ера.
■ **18 — "Кармэн"** (опера ў 3-х дзеях) Ж.Бізэ.
■ **19, 20 — "Лебядзінае возера"** (балет у 3-х дзеях) П.Чайкоўскага.
■ **20 —** Канцэрт **"Чатыры стагоддзі беларускай вакальнай музыкі"** (камерная зала імя Л.П.Александроўскай). Пачатак у 19.30.
■ **22 — "Чыпаліна"** (опера ў 3-х дзеях) К.Хачатурана. Пачатак а 12-й.
■ **22 — "Яўген Анегін"** (опера ў 3-х дзеях) П.Чайкоўскага.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР
г. Мінск, вул. Мясніка, 44.
Тэл.: 200 81 26.
■ **15 — "Клеапатра"** (балет ў 2-х дзеях) Г.Шайдулавай. Прэм'ера. Пачатак а 18-й.
■ **16 — "Чырвоны Каптурык. Пакаленне NEXT"** (мюзікл для дзяцей і дарослых у 2-х дзеях) А.Рыбнікава. Пачатак аб 11-й.
■ **16 — "Таемны шлюб (Граф Люксембург)"** (аперэта) Ф. Легара.
■ **17 — "Дуброўскі"** (мюзікл у 2-х дзеях) К.Брэйтбурга.
■ **18 — "Праўдзівая гісторыя паручніка Ржэўскага"** (гусарскі вадэвіль у 2-х дзеях) В.Баскіна.
■ **19 — "Сільва"** (аперэта ў 2-х дзеях) І. Кальмана.
■ **20 — "Шалом Алейхем! Мір вам, людзі!"** (мюзікл у 2-х дзеях) А.Хадоскі.
■ **21 — "Юнона" і "Авось"** (рок-опера) А. Рыбнікава.
■ **22 — "Шчаўкунок"** (балет у 2-х дзеях) П.Чайкоўскага. Пачатак аб 11-й.
■ **22 — "Баль у Савоі"** (аперэта ў 2-х дзеях) П.Абрахама. Пачатак а 18-й.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"
г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.
■ **15 — "Мабыць?"** (спектакль-аследаванне) А.Марчанкі.
■ **16 — "А мне не сорамна!.."** (больш чым казка) Л.Усцінава. Пачатак а 12-й.
■ **16 — "Містар Розыгрыш"** (гульні дарослых) С.Кандрашова.
■ **18 — "Раскідінае гняздо"** (народная трагедыя) Янкі Купалы.
■ **19 — "Белы анёл з чорнымі крыламі"** (сучасная драма) Д.Балыка.
■ **20 — "Ліфт"** (хроніка аднаго злачынства) Ю.Чарняўскай.
■ **21 — "Адвечная песня"** (фольк-опера) Янкі Купалы.
■ **22 — "Гэта ўсё яна"** (драма) А.Іванова. Прэм'ера.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"
г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2.
Тэл.: (8-0212) 36 32 50.
■ **16 — "Папялушка, або Крышталёвыя чаравічкі"** Ш.Пяро. Пачатак аб 11-й.
■ **22 — "Яшчэ раз пра Чырвоны Каптурык"** С.Яфрэмава, С.Когана. Пачатак аб 11-й.